# БЕЛАРУСКАЕ СВЯТА



# Ў ШКОЛЕ

# БЕЛАРУСКАЕ СВЯТА Ў ШКОЛЕ

**З вопыту работы Уздзенскай санаторнай школы-інтэрната**

---

Дапаможнік
для настаўнікаў і выхавальнікаў

*Рэкамендавана ўстановай
«Навукова-метадычны цэнтр
вучэбнай кнігі і сродкаў навучання»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мінск «Беларусь» 2002

УДК 373.138.1:398.3(=161.3)(072)
ББК 74.200.58
Б 43

Аўтары-ўкладальнікі:
***Л.В. Пармон, Л.П. Сахарэвіч, Н.П. Трыгубовіч***

Рэцэнзенты:
кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры этналогіі
і фалькларыстыкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта
імя М. Танка ***А.Ю. Лозка;***
намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце
гімназіі № 12 г. Мінска ***Г.Ф. Бядуліна***

**ISBN 985-01-0437-6**

**© Пармон Л.В., Сахарэвіч Л.П., Трыгубовіч Н.П., 2002**
**© УП «Выдавецтва «Беларусь», 2002**

# УСТУП

Якой быць беларускай нацыянальнай школе не толькі па форме, але і па змесце? Ужо няма сумненняў, што яна павінна ствараецца на аснове класічных падыходаў і перадавога педагагічнага вопыту, а таксама шырока выкарыстоўваць багаты патэнцыял народнай педагогікі.

Школы, ліцэі, каледжы, гімназіі прызваны даць трывалыя веды моладзі, а ВНУ павінны стварыць інтэлектуальную эліту нацыі. Але не менш хвалюе педагогаў і праблема, якім будзе новае пакаленне ў духоўна-маральным плане? Мы павінны навучыць маладых зарабляць грошы і жыць дастойна, але ж, як гэта банальна ні гучыць, заставацца людзьмі ў самым шырокім сэнсе гэтага слова. У педагогіцы існуюць самыя розныя тэхналогіі і падыходы ў выхаванні. Аднак ці можа сёння кожны педагог выразна акрэсліць канчатковую мэту, да якой ён імкнецца ў сваёй выхаваўчай рабоце? На чым выхоўваць сучасных дзяцей? Скажам, на агульначалавечых маральна-этычных каштоўнасцях. Аднак выхаваўчая работа ў нацыянальнай школе павінна грунтавацца на глыбокім веданні беларускага менталітэту. Кожны нацыянальны характар мае свае тыповыя рысы. Памяркоўнасць, гасціннасць, міласэрнасць, працавітасць, уменне пастаяць за сябе, калі вораг пяройдзе мяжу, беражлівасць — вось гэтыя і многія іншыя гуманістычныя рысы характару беларусаў сталі высокакаштоўнай нацыянальнай адметнасцю. Нацыянальны характар — з'ява не статычная. Пад уплывам сацыяльна-гістарычных умоў асобныя рысы могуць замяшчацца іншымі. І паколькі школа разам з сям'ёй з'яўляецца асноўным інстытутам выхавання, яна заклікана выхоўваць у моладзі лепшыя рысы нацыянальнага характару.

Нідзе так поўна не выяўляецца душа і характар народа, як у фальклоры, традыцыях, абрадах, прыкладным мастацтве, музыцы і літаратуры. І разам з тым гэта унікальны матэрыял, у якім адлюстравана народная педагагічная культура. На жаль, сучасная гарадская сям'я, ды, у вялікай ступені, і асіміляваная вясковая сям'я, не з'яўляецца ні носьбітам, ні захавальніцай народнага педагагічнага вопыту. Менавіта школа і прызвана адрадзіць лепшыя традыцыі народнай педагогікі беларусаў.

Ва Уздзенскай санаторнай школе-інтэрнаце распрацавана аўтарская праграма «Спадчына» (1992), у рамках якой разгорнута дзейнасць гурткоў «Фальклярынка», «Каласавічок», «Вясёлкавы карагод». Школьнікі займаюцца вывучэннем дзіцячага фальклору, абрадаў і святаў беларусаў, знаёмяцца з беларускай этнаграфіяй. Своеасаблівым падагульненнем работы гурткоў і сталі прапанаваныя ў дапаможніку ўвазе педагогаў сцэнарыі беларускіх святаў. Яны распрацаваны на аснове мастацка-гістарычнай спадчыны, з улікам метадычных рэкамендацый сучасных даследчыкаў фальклору і абраднасці беларусаў, з разлікам не на абстрактнага ўдзельніка, а на сучаснага вучня. Тыя,

хто працуе з дзецьмі, ведаюць, як цяжка адарваць іх ад камп'ютэраў, шумных дыскатэк, замежнай музыкі. Дзеці не прывыклі ствараць свята сабе самі, лягчэй заняць пазіцыю сузіральніка, гледача. Сцэнарыі ж святаў, якія ўвайшлі ў дапаможнік, апрабаваны на практыцы і правераны часам, а самае галоўнае — станоўча ўспрыняты школьнікамі.

Хаця сцэнарыі прыстасаваны да запатрабаванняў часу, аднак рытуальна-абрадавая канва захавана ў кожным з іх. Перад каляндарна-абрадавым ці сямейна-абрадавым святам мы тлумачым сваім вучням значэнне абрадавых дзей, акцэнтуем іх увагу на пазнавальныя магчымасці матэрыялаў.

У дапаможніку таксама змешчаны песні з нотнымі прыкладамі, апісанні гульняў, што значна аблегчыць работу педагогаў, асабліва сельскіх школ, якія не ў поўнай меры забяспечаны адпаведнай літаратурай.

Мы спадзяёмся, што прапанаваны намі дапаможнік зацікавіць педагогаў-практыкаў, работнікаў культурных устаноў, усіх, хто не раўнадушны да духоўнай спадчыны народа.



# СЦЭНАРЫІ СВЯТАЎ НА АСНОВЕ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВАГА МАТЭРЫЯЛУ

У нашых продкаў было выразна сфарміравана ўяўленне пра цыклічнасць жыцця. І гэта яскрава выяўляецца ў каляндарна-абрадавых святах, цесна звязаных з кругаваротам сонца і земляробчай працай селяніна. Сёння мы не можам спадзявацца на адраджэнне абрадаў у сваім першародным выглядзе: разбураны спрадвечны ўклад жыцця, страчана магічная сувязь селяніна з зямлёй, сонцам, сіламі прыроды, аднак прапанаваныя намі сцэнарыі Масленіцы, Каляд, Вялікадня і Піліпаўскіх вячорак усё ж даюць магчымасць наблізіць духоўную спадчыну продкаў да сучаснага чалавека.

Важна адзначыць, што кожнае арганізаванае намі свята праводзілася ў тэрміны, вызначаныя беларускім народным календаром.

Абрадавыя песні падабраны з улікам магчымасцей вучняў сярэдніх і старэйшых класаў.

Прадстаўленыя намі матэрыялы могуць быць выкарыстаны як у прапанаваным варыянце, так і ў апрацаваным, прыстасаваным да адпаведнай школы, рэгіянальных асаблівасцей.

## «Ішла Каляда, калядуючы...»

### *Методыка падрыхтоўкі*

Свята праводзіцца вечарам 13 студзеня. За некалькі дзён да яго дзеці рыхтуюць касцюмы казы, мядзведзя, цыганкі, дэкарацыі для сцэны.

Выхавальнікі знаёмяць вучняў, як раней на Беларусі святкаваліся Каляды. Дзеці развучваюць калядныя песні, каб падчас свята быць не проста гледачамі, а яго актыўнымі ўдзельнікамі.

## *Методыка правядзення*

*Сцэна аформлена пад беларускую хату, упрыгожана вышыванымі ручнікамі. Гучыць песня «Калядачкі» ў выкананні ансамбля «Песняры».*

**Гаспадар.** Ой, жонка, нешта ў хаце нашай горача!

**Гаспадыня.** Дык, Лявоначка, я ж тры дні ў печы паліла, пякла, варыла, смажыла, хачу, каб калядоўнічкі зайшлі, нашай хаты не міналі. Сядай куццю спрабаваць.

*Гаспадары садзяцца за стол, перахрышчваюцца, першую лыжку куцці нясуць да акна.*

**Гаспадары.**

— Мароз, мароз, ідзі куццю есці! Што б ты не марозіў летам расады, агуркоў, гарбузоў, морквы і буракоў, і ўсяго таго, што Бог судзіць пасадзіць і пасеяць!

**Гаспадар.** Жонка, ці бачыш ты мяне?

**Гаспадыня.** Не бачу!

**Гаспадар**. Каб ты не бачыла за агуркамі, за гарбузамі, за капустай, за буракамі свету!

**Гаспадыня.** Ці бачыш ты мяне?

**Гаспадар.** Не, не бачу!

**Гаспадыня.** Каб жа ты не бачыў за стагамі, за вазамі, за снапамі свету!

*Дзеці ў час яды задаюць маці пытанні.*

**1-ае дзіця.** Вой, мамка, чаму ў нас сёння такі багаты стол?

**Маці.** Сёння абрадавая калядная вячэра — куцця. Сённяшняя куцця называецца шчодрай. А тыдзень назад, вы ж памятаеце, была посная куцця.

**2-ое дзіця.** А з чым звязана гэта свята — Каляды?

**Бацька.** А гэта свята яшчэ дахрысціянскага паходжання. Абрадавыя магічныя дзеянні, якія выконваліся ў час Каляд, павінны былі спрыяць плёну ў працы селяніна, засцерагаць яго сям'ю, гаспадарку ад нягод, няшчасцяў. А з прыняццем хрысціянства царква прымеркавала да Каляд царкоўнае свята — Ражство Хрыстова, якое адзначаецца сёмага студзеня.

**1-ае дзіця.** А чаму мы куццю паставілі на сена?

**Маці.** Бо Хрыстос на сене нарадзіўся.

**2-ое дзіця.** А чаму на Каляды казу водзяць?

**Бацька.** Бо здаўна на Беларусі казу лічылі сімвалам дабрабыту. Аднак у некаторых месцах водзяць жорава, мядзведзя. Ну, вось і пад'елі. А зараз паваражым, ці высокі лён будзе ўлетку. А ну, дзяўчаткі, выцягвайце з-пад абруса па сцяблінцы сена (*дзеці выконваюць просьбу бацькі*). Во, добры будзе лён, добры. Ідзі, Марыля, паглядзі на неба, якое надвор'е.

*Марыля ідзе, праз некаторы час вяртаецца.*

**Марыля.** Вой, усё неба ў яркіх зорках. Будзе добры ўраджай збожжа і грыбоў у гэтым годзе. І снег пакуль не ідзе, чорныя сцежкі — будзем гэты год з чарніцамі, ды й грэчка ўродзіць.

**Бацька.** Дай Бог, дай Бог, каб усе нашы прыметы спраўдзіліся.

*У хату заходзяць дзяўчаты.*

**1-ая дзяўчына.** Калядкі — добрыя святкі, але мароз пракляты.

**2-ая дзяўчына.** Калядкі — добрыя святкі, бліны ды аладкі.

**3-яя дзяўчына.** На Каляды іней — ураджай на хлеб, неба ў зорках — ураджай на гарох будзе.

**1-ая дзяўчына.** На Каляды — кілбасы, на Вялікадня — сыр, а ўсё чалавек сыт.

**Усе разам.** Добры вечар, з Калядамі вас!

**Гаспадыня.** Праходзьце, праходзьце, дзяўчаткі.

*Дзяўчаты распранаюцца.*

**Адна з дзяўчат.** Ці не будуць цётка з дзядзькам супраць, калі мы сёння паварожым, за каго замуж пойдзем?

**Гаспадар.** Вой, замуж яны сабраліся, вы ж яшчэ малыя, у рэшаце спіце!

**Дзяўчаты.** Якія мы малыя, дзядзечка!

**Гаспадар.** Вой, бяды свет, гадайце, гадайце, я ж жартам. Цешцеся, пакуль маладыя.

*Дзяўчаты пачынаюць варажыць. Чуецца, як брэша сабака (*загадваюць, хто ў які бок замуж пойдзе*). Туфлямі перамерваюць хату. Дзве дзяўчыны* (з іх адна гаспадыніна дачка*) выходзяць па дровы, каб паваражыць. Тым часам астатнія змаўляюцца паставіць пад ложак місачку з вадой, трэсачкай, каб прысніўся суджаны. Пасля вяртаюцца дзяўчаты з дрывамі і таксама варожаць.*

**Адна з дзяўчат.** Сёння нанач, як вучыла мая бабуля, трэба ўмыцца, выцерціся новым ручніком і пакласці яго пад падушку. І прысніцца будучы муж, які будзе несці ў руках ручнік.

**Дзяўчаты** (*дружна*). Пагадаем! Пагадаем! А цяпер трэба разыходзіцца, хутка калядоўшчыкі хадзіць будуць, на вуліцы чуваць ужо смех, песні, музыка, гоман. Бывайце здаровы!

*Дзяўчаты выходзяць з хаты і чуюць песню калядоўшчыкаў.*

Едуць, едуць Калядкі,
Вязуць бліны і аладкі
На сівенькім канёчку,
На маляваненькім вазочку.

*Калядоўшчыкі падыходзяць да дома і спяваюць.*

**Весела, рухава** ♩= 92






Ой, ішла Каляда, калядуючы, праз сяло,
Зайшла ж яна да пана Сцяпана пад вакно:
— Ой, пане Сцяпане, харошыя дочкі ў цябе,
А што ж твае харошыя дочкі рабілі?
— А што ж мае харошыя дочкі рабілі?
А ў стадоле ды ўсё пшанічаньку мералі,
Намералі трыццаць шанкоў і чатыры.
А тыя чатыры вам, калядpoints, Каляда!

*Стук у дзверы.*

**Калядоўшчыкі.** Ці дома гаспадар?
**Гаспадар.** Дома, з печы каўбасу дастаю.
**Калядоўшчыкі.** Ці дома гаспадыня?
**Гаспадыня.** Дома, дома, сталы прыбіраю.

*Калядоўшчыкі ўваходзяць у хату, наперадзе — «павадыр» з «казой».*

**Калядоўшчыкі** (*па чарзе*).
— Добры вечар таму, хто ў гэтым даму!
— Ці ты спіш, ці ты так ляжыш?
— Ці ты так ляжыш, ці лісты пішаш?
— Мы ж твайго двара не мінём!
**Гаспадары.** Дзякуем! Дзякуем!
**1-ы калядоўшчык.** З Калядамі велічаем!
**2-і калядоўшчык.** На тваім двары ўсе агні гараць.
**1-ы калядоўшчык.** Усе агні гараць, усе сталы стаяць.
**3-і калядоўшчык.** Усе сталы стаяць пазасціланыя.
**2-і калядоўшчык.** Усе хлябы ляжаць павыпяканыя.

*Калядоўшчыкі праходзяць па хаце і звяртаюцца да ўсіх з песняй.*



Добры вечар табе, пане гаспадару!
Радуйся, ой, радуйся, зямля, —
Сын Божый нарадзіўся!
Засцілайце сталы, усе, колькі маем,
Ды кладзіце калачы, святую пшаніцу.
Ды прыйшлі к нам жэ да тры святы ў госці:
А першае свята — Хрыстова нараджэнне,
А другое свята — святое Васілле,
А трэцяе свята — святое Вадохрышчэ.

**Усе калядоўшчыкі.** Добры вечар вам, ці рады вы нам?

**Гаспадары.** Мы-то рады. Ды хто ж вы такія?

**Калядоўшчыкі.** Мы людзі не простыя, з далёкага краю!

**Гаспадыня.** Куды ідзяце?

**1-ы калядоўшчык.** Ідзём мы да пана Года, што носіць бараду шыроку, як лапата, сіву ды калмату!

**2-і калядоўшчык.** Мы к лету ідзём, казу вядзём ды шчасце нясём!

**3-і калядоўшчык.** Ці шырокія сцены, каб нам пагасцяваць? Ці добрая гаспадыня, каб нас пачаставаць?

**Гаспадыня.** Гаспадыня-то добрая, але за што вас частаваць? З чым вы прыйшлі, калядоўшчыкі?

**Калядоўшчыкі.** З казою шэраю, вясёлаю.

**Каза** (*рассыпаючы жыта*).

Святкуем Калядкі —
Лавіце зярняткі!
Лавіце рукой,
Каб добры быў настрой!
Каб моцна грэла сонца —
Кіну ў аконца.
Майце ўсяго даволі,
А бяды ніколі.
Нікога не хвалюйце,
А ўсім святло даруйце.

**Гаспадар.** Дык няхай яна паскача!

**Калядоўшчыкі.** А ну, каза, павярніся, гасцям добрым пакланіся!

*Гучыць песня «Го-го-го, каза». «Каза» скача, брыкаецца, валіцца на падлогу.*



— Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
Дзе рожкі дзела?
— На соль праела.

— Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
Лезь, каза, на печ,
Пакажы чапец.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
Дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
Лезь, каза, на кут,
Пакажы хамут.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
Лезь, каза, на пол,
Пакажы хахол.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
Дзе каза рогам,
Там жыта стогам.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
Дзе каза нагой,
Там жыта капой.

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра,
Дзе каза хвастом,
Там жыта кустом.

**Калядоўшчыкі** (*па чарзе*).

— Каб каза ўстала, трэба даць ёй кусок сала!

— А на кожны ражок павесіць піражок!

— А вунь гаспадар ідзе, каўбасу нясе, тры кускі сала, каб каза ўстала, мерку аўса, каб каза пайшла, мерку жыта, каб каза была сыта!

*Гаспадар вешае на рогі сала, каўбасу, «каза» ўстае.*

**Калядоўшчыкі** (*па чарзе*).

— Мы хадзілі, гулялі, калядавалі, прыйшлі, прыгулялі да гаспадарова стала.

— Гаспадар наш, бацюшка! Пачастуй гасцей з клеці — рэшатам, з печы — пірагом.

— Падай каўбасу, у зубах панясу.

**Гаспадыня.** Дык за што вас частаваць, спачатку трэба паспяваць.

*Гучыць песня «А ў гаспадара пасярод двара».*




А ў гаспадара пасярод двара, Каляда!
Стаіць вішанька зеляненькая, Каляда!
На тэй вішаньцы гарыць свечачка, Каляда!
З тае свечачкі ўпала іскарка, Каляда!
З тае іскаркі стала возера, Каляда!

А ў тым возеры сам Бог купаўся, Каляда!
Просім Божаньку на вячэраньку, Каляда!
На вячэраньку, на куцічаньку, Каляда!
Не столькі з'ясі, колькі нам дасі, Каляда!
Не столькі сап'еш, нам болей нальеш, Каляда!

**Дзеці** (*падбягаюць да гаспадыні, цягнуць яе за руку, за фартух і кажуць па чарзе*).

— Я ў цябе, цётухна, пакалядую!
— Я ў цябе, цётухна, каўбасу чую!
— Дай, цётка, каўбасу, бо я хату разнясу!
— Дай, цётка, пірог, я пайду за парог!
— Вазьмі нажа вострага, адрэж сала тоўстага!

**Гаспадыня.** Не, не дам! Малавата спявалі, мала скакалі!

**Музыка.** Можна і яшчэ паскакаць.

**Дзеці.** Ну-ка, рэзні, гарманіст, залатыя пальчыкі,
Каб у скок пусціліся дзевачкі і мальчыкі!

*Танец «Бульба-полька». Адны выконваюць танец, другія спяваюць.*






Гарні, гарні бульбу з печы
У торбачку ды на плечы,
У торбачку ды нясі, —
Скажаш дзякуй, як з’ясі.

Прыпеў: Трам-там-там, та-ра-та-та-та-та-там,
Скажаш дзякуй, як з’ясі.
Трам-там-там, та-ра-та-та-та-та-там,
Трам-там, ці-рам, та-ра-ра-рам.

Бульбу пякуць, бульбу варацъ,
Бульбу ядуць, бульбу хваляць,
З бульбы клёцкі, з бульбы каша —
Вось такая доля наша.

Прыпеў.

І да кожнае да стравы
Годна бульба да прыправы.
Пакаштуеш шмат разоў
Ды захочаш бульбы зноў.

Прыпеў.

**Гаспадар.** Вось дык танцоры, вось малайцы! Пасядзіце ў нас, пачастуйцеся! Усё ў нас ёсць — і квас, і каўбаскі!

*Калядоўшчыкі частуюцца, гаспадыня кладзе пачастунак у мех, з сабой. Стук у дзверы. З’яўляецца «цыган» з «цыганкаю». «Цыган» вядзе «кабылу».*

**Цыган.** Добры вечар вам!

**Цыганка.** Дай нам, добры чалавек, капу яек на паўміскі, белым сырам намазаўшы, каўбасою абкруціўшы!

**Гаспадар.** А чым вы нас парадуеце?

**Цыган.** Я — цыган багаты! У мяне ў кармане — вош на аркане! А ў другім — блыха на цапе!

**Цыганка.** Цыц, чорт стары! Пайду людзям добрым шчасця нагадаю.

*Ідзе да гасцей, гадае.*

**Цыган.** Купі, гаспадар, у мяне кабылу, другой такой не знойдзеш. Прадаю дарма, усяго за тысячу!

**Гаспадар.** За такую кабылу і грошык шкада аддаваць!

**Цыган.** Многа ты разумееш! Вось глядзі, якая яна ў мяне ласкавая. (*Гладзіць «кабылу», яна брыкае.*) Паглядзі, якая ў яе паходка. Плыве, як ў моры лодка! (*Цягне «кабылу», але яна стаіць як укапаная. Штурхае яе ў зад, «кабыла» хістаецца.*) Паглядзі! Мая сівая як бяжыць, дык зямля дрыжыць. (*Дае «кабыле» пад зад, яна падае.*) А няхай жа цябе ліха, гаспадар! Загубіў мне кабылу! За гэтку чэсць давай карбаванцаў шэсць ды тры кускі сала, каб кабыла ўстала!

**Гаспадар** (*смяецца, выцірае слёзы*). Убрыкні цябе камар! Бяры ўжо! (*Частуе яго.*) Пасядзіце ў нас, добрыя людзі!

*Госці частуюцца. Потым, пад'еўшы і выпіўшы квасу, «цыган» з «цыганкаю» скачуць «цыганачку». Затым на сярэдзіну круга выходзіць «важак» з «мядзведзем».*

**Важак.** Кланяемся нізка ўсім, і Мішка кланяецца. (*«Мядзведзь» ківае галавой.*)

Ну-ка, Міша, пакажы, як бабы хлеб месяць. (*«Мядзведзь» паказвае.*)

Ну-ка, Міша, пакажы чэснай публіцы, як мужык Янка п'яны з кірмашу дамоў вяртаецца. (*«Мядзведзь» паказвае, перавальваючыся з нагі на нагу.*)

Так, так, Міхаіл, весялей. Весялей — мужык Янка добрых дзве кварты выпіў. І таму ног пад сабой не чуе. (*«Мядзведзь» паказвае, як ходзіць зусім п'яны чалавек.*)

Пакажы, Міша, яшчэ, як дзеўкі на танцы збіраюцца (*«Мядзведзь» паказвае.*)

Ну, Міша, за старанне трымай мядовы пернік. Пернікі любіш? (*Дае пернік «мядзведзю», той раскланьваецца.*)

**Мужчына.** А ну барджэй, не баў гасцей:

Механошу — капу грошай,
Падхватнічкам — па цукерачцы,
Па цукерачцы, кілбасу на талерачцы.
Пачынальніку — чырвоны злоты,
Ад кошачкі — сала трошачкі,
Ад кароўкі — чвэрць галоўкі,
Ад коніка — бочка солі,
Ад авечкі — рэшата грэчкі,
Ад свінкі — шрот саланінкі.

**Калядоўшчыкі** (*дзякуюць за пачастункі*).

— Які гэты піражок — каб гэтакі каласок.
— А з таго каласочка — жыта бочка!
— А за гэты кусок сала — каб свіння дзверы выстаўляла.

*Пакідаючы хату, усе спяваюць віншавальную песню «Паляцеў каршун, Каляда!».*




Паляцеў каршун, Каляда!
Каля тога саду, Каляда!

Нашоў жа ён, Каляда!
Курэй стаду, Каляда!

Стаў ён выбіраці, Каляда!
Каторыю ўзяці, Каляда!

Што белыя скрылцы, Каляда!
Тая — лятушчая, Каляда!

Што жоўтыя ножкі, Каляда!
Тая — нясушчая, Каляда!

А што ў чубочку, Каляда!
Тая — каршуночку, Каляда!

## «У нас сягоння Масленіца!..»

### *Методыка падрыхтоўкі*

Свята адзначаецца на восьмым тыдні перад Вялікаднем. На працягу тыдня праводзяцца гутаркі з дзецьмі аб тым, як раней святкавалася Масленіца (Масленічны тыдзень), тлумачыцца сімволіка асобных момантаў: бліны, спальванне «Зімы», катанне на конях вакол вёскі, гушканне на арэлях і інш.

Свята праходзіць на вуліцы з удзелам вучняў і іх бацькоў, работнікаў школы. Жанчыны ў прыгожых квяцістых хустках. На пляцоўцы перад школай расстаўлены сталы, на сталах — самавары з чаем, бліны, выпечка.

Гучаць беларускія народныя песні.

## *Методыка правядзення*

**1-ы зазывала.** Гэй, весялей ты збірайся, народ!
Крочыць вясна па планеце ўжо,
Крочыць і радасцю сэрца займае,
Вось гэта свята вясны нас чакае.

**2-і зазывала.** Мы клічам сюды ўсіх, хто любіць вяселле, песні і смех.

**3-і зазывала.** Мы адзначаем свята провадаў Зімы.

**4-ы зазывала.** Зіму праводзіць будзем, а Вясну сустракаць.

**2-і зазывала.** Вас чакаюць гульні, жарты — быць пахмурным тут не варта.

**3-і зазывала.** У нашай школе свята — праводзіны Зімы.
Усе людзі весяляцца, і весялімся мы.

*Частка дзяцей з колам — сонцам, ідучы на сярэдзіну пляцоўкі, спяваюць.*




А мы Масленку дажыдалі,
Люлі, дажыдалі.
Ўсю нядзельку паглядалі,
Люлі, паглядалі.

*Другая частка дзяцей з пудзілам, ідучы насустрач, адказвае.*

Мы думалі, Масленка сем нядзелек,
Люлі, сем нядзелек,
Ажно Масленка — сем дзянёчкаў,
Люлі, сем дзянёчкаў.

**Усе разам.** А ў нас сёння Масленіца, Масленіца,
Вылецела з куста ластавіца, ластавіца.
Села-пала на калу, на калу,
Кідала масла па каму, па каму,
Хто ўхопіць, дык таму, дык таму.

*Дзеці з пудзілам падыходзяць да гаспадыні.*

**Дзеці.** Ці дома гаспадыня, чаго нам не кажацца?

**Гаспадыня.** Дома, дома, не гуляю, бліночкі пяку, Масленку сустракаю.

**Дзеці.** Дзень добры, гаспадынечка,
У нас ёсць да цябе навіначка:
Прыляцела ластавіца, прынесла вам Масленіцу,
Села на жэрдачку, шчабятала вестачку.
Палятала, пакружыла, вам вясну апавясціла.

*Гучыць песня «А сёння ў нас Масленка».*




А сёння ў нас Масленка, Масленка,
Ой, лялю, рана, Масленка, Масленка!
А з-пад куста ластаўка, ластаўка,
Ой, лялю, рана, ластаўка, ластаўка.
Сядзіць яна высока-высока,
Ой, лялю, рана, высока-высока.
Бачыць яна далёка-далёка,
Ой, лялю, рана, далёка-далёка.
Што ў школе дзеецца, дзеецца,
Ой, лялю, рана, дзеецца, дзеецца.

**Дзеці.** Масленіца ў нас!

*З'яўляюцца бабка Параска і бабка Марылька.*

**Бабка Параска.** А пахне ў вас як! Блінамі! З маслам! Я б бліны ўплятала ды галавою матляла.

**Бабка Марылька.** Дзіва што! Кажуць жа, што на мазаны блін і кот падругому глядзіць!

**Бабка Параска.** А колькі ласункаў на стале! Відаць, нас тут з раніцы чакалі.

**Бабка Марылька.** Так, чакалі ды на стол збіралі.

**Дзіця.** Вас, паважаныя, мы чакалі, свята без вас не пачыналі. На нашым сваце не будзе часу сумаваць, на сваце гэтым трэба спяваць, смяяцца, танцаваць.

**Бабка Параска.** Каб вы, дзетачкі, сталі дужымі і спрытнымі, трэба спачатку бліноў паесці. Я стану з блінамі насупраць адной каманды, а бабка Марылька — насупраць другой. Кожны з вас па чарзе павінен дабегчы да бліноў, узяць адзін з іх, ababeгчы вакол мяне, а другой камандзе — вакол бабкі Марылькі, а потым вярнуцца назад і стаць у канцы каманды.

*Праходзіць гульня.*

**1-ы зазывала.** Гэй, народ, збірайся ў карагод.
Раскрывайце ўсе кішэні, даставайце кашалі.
**2-і зазывала.** Пачастункаў смачных — горы,
Кожнаму роту знойдзем работу.
**3-і зазывала.** Каму масла, каму сала, каму сыр.
Хто заплаціць — таму пір.
**4-ы зазывала.** Чалавек галодны ні на што не годны.
**2-і зазывала.** З самавара валіць пара — прыкмячай, дзе вараць чай.
**1-ы зазывала.** Блінок, маслены каток, сам каціся ў раток.
**3-і зазывала.** Частуйцеся, госцейкі дарагія.

*Дзеці ядуць бліны з чаем.*

**2-і зазывала.** Бліны пшанічныя, кругленькія, пышныя!
**4-ы зазывала.** Кругленькія, жоўценькія, быццам тое сонейка!
Ешце, маслам палівайце, а смятанкай заядайце!
**1-ы зазывала.** Грошай не бяром, дарам аддаём.
У масла блін мачайце,
Масленку ўспамінайце.

**Кабеты** *(жартуюць).*
— Еш, куманька, еш, я не лічу бліны!
— Смачныя, дзякуй! Наелася, восьмы блін даядаю.
— Брэшаш, кумка, не восьмы, а дзявяты.

**Бабка Параска.** Ну вось, бабка Марылька! Самі дзеткі аладак паелі, а нас не пачаставалі.

**Бабка Марылька.** А некалі ва Уздзе быў такі цікавы звычай: унучкі і ўнукі запрагаліся замест коней, саджалі сваю бабульку ў сані і везлі яе частавацца блінамі.

**Бабка Параска.** Давайце паспрабуем і мы сёння пракаціцца.

*Дзве каманды «ўнукаў» становяцца ля «бабулек». «Унукі» вязуць «бабулек» на санках паміж «дрэўцамі» (кеглі). Нельга іх паваліць. Наперадзе стаіць талерка з блінамі. «Бабка» павінна схапіць блін, калі «ўнукі» будуць разварочвацца, каб везці яе назад.*

**Бабка Параска.** Ну, сяброўка Марылька, бліноў мы наеліся, але ўнукі нашы стаміліся — хай яны адпачнуць.

*Уваходзяць месяцы.*

**Снежань.** Боты ў полі звоняць меддзю,
Вецер свішча наўздагон,
Развітацца Зіма едзе
Ва Уздзенскі наш раён.

**Студзень.** Яна едзе ў даль на апошні свой баль,
І за гэта ёй — ледзяны медаль.

**Люты.** Ля новых варот робіць паварот,
Гэй, дарогу дай, расступіся, народ!

**Дзеці.** Ідзі, Зіма, да Бучына!
Бо ты нам надакучыла!
Ідзі, Зіма, да Кракава!
Зноў будзеш аднакава!
Ідзі, Зіма, да Кіева!
Ты нам Лета пакінула!
Ідзі, Зіма, да крыніцы
Ды забірай рукавіцы!

**Зіма.** Гэй, мароз і снег, ляціце на падмогу. Ах вы, шкоднікі. На Поўнач мяне збіраецеся адправіць! Не выйдзе! Ды я вас зараз замарожу! Гэй, вятры мае паўночныя, ляціце мне на дапамогу.

*Рассыпае снег. З'яўляецца Баба Снегавуха.*

**1-ы зазывала.** А гэта хто?
**Зіма.** Баба Снегавуха.
**Баба Снегавуха.** Я Баба Снегавуха, зараз вас схаплю за вуха.
Свае вушы не хавайце, бабе снежнай падстаўляйце.

*Праходзіць гульня ў даганялкі.*

**Зіма.** Прыйшла Баба Снегавуха,
Мех набіла снежным пухам.

**Баба Снегавуха.** Бой мяшкамі пачынаецца! Хто смялейшы — не хаваецца!

*Праходзіць бой падушкамі на лаўцы.*

**1-ы зазывала.** Як прыходзіў люты, пытаў, у што абуты.
Хто валёнкі абуваў, той марозу не баяўся.
Снег ляпіў, камы качаў і на саначках катаўся.
Хто з Зімой гуляць жадае, хай валёнкі абувае.

*Гульня-спаборніцтва «Бег у валёнках».*

**2-і зазывала.** Надакучылі Зіма, цёплыя валёнкі.
Хочацца ужо цяпла, песень птушак звонкіх.

**3-і зазывала.** Ты ўжо, Зімачка, надакучыла,
Снегам-холадам нас замучыла.
Збірайцеся, маладзіцы, ды здымайце рукавіцы,
У далоні біце, Вясну-красну завіце.

*Гучыць песня «Жавароначкі, прыляціце».*




Жавароначкі, прыляціце,
Вясну красную прынясіце,
Каб сонейка засвяціла,
Каб снег белы растапіла,
Каб садзікі расцвяціла.

Жавароначкі, прыляціце,
Зямлю-матухну абудзіце
І дожджыкам напаіце,
Каб травачкі нарасціла,
Каб волікаў накарміла.

Жавароначкі, прыляціце,
Цёпла лецейка прынясіце,
А зімачку прыбярыце,
Бо зімачка надаела —
Нам хлебушкі пераела.

*Дзеці вядуць Вясну.*

**Зіма.** Прыцягнулася, паспела!

**Вясна.** Добры дзень, Зіма-матухна! Ты яшчэ не пакінула мае прасторы?

**Зіма.** Пэўна не. І нават не збіраюся гэтага рабіць.

**4-ы зазывала.** А давайце так: хто ведае больш загадак, той і будзе гаспадарыць на зямлі.

**Зіма і Вясна.** Давайце!

**Зіма.** Карова бяжыць, а шкура ляжыць.

**Вясна.** І сваё дзіця не забыла, і чужых накарміла.

**Зіма.** Хто двума бадаецца, чатырма ходзіць, адным мух ганяе?

**Вясна.** Усе яго любяць, а як паглядзяць — моршчацца.

**Зіма.** Што зімою камлём угору расце?

**Вясна.** У рубашцы радзіўся, а голы ходзіць.

**Зіма.** Лезе праз акно сівае сукно.

**Вясна.** Без кліноў, без капытоў само падыходзіць, ніхто яго не трывожыць.

**Зіма.** Белая кабыла ўвесь лес з’ела.

**Вясна.** Новая пасудзіна, а ўся ў дзірках.

**Зіма.** Я больш загадак не ведаю.

**1-ы і 2-і зазывалы** (*разам*). Ура! Вясна перамагла!

**Зіма.** Не, пачакайце! Мы яшчэ не ўсе гульні перагулялі, не ўсе песні пераспявалі.

**Вясна.** Як быццам у мяне ні песень, ні казак няма! А карагоды якія цудоўныя!

Вы выходзьце, дзевачкі, на лугі-лужочкі,
На лугі-лужочкі завіваць вяночкі,
Завіваць вянкі на святкі, на гадавыя святочкі.

*Танец з вянкамі. Гучыць песня «На святую Масленіцу».*




На святую Масленіцу
Да вылятала ластавіца.

Да вылятала ластавіца
С чорнага мора на поле.

С чорнага мора на поле.
Сядайце, малойцы, на коней.

Сядайце, малойцы, на коней
Да ўлавіце ластавіцу!

Да ўлавіце ластавіцу,
Да будзем гуляць Масленіцу!

**Зіма.** Хай будзе так. Я знікаю.
Вясну з прыходам вітаю
І трон свой ёй я уступаю.
Я ж ад'язджаю на спакой
Ў паўночны край любы мой.
Хай цёплы дзень смялей ступае —

Табе пасад я уступаю.
Хай новы дзень здабыткам будзе,
Нясе вам радасць, шчасце, людзі!

**3-і зазывала.** Добрай дарогі табе, матухна-Зіма.

*Зіма, адыходзячы, сыпле пажаданнямі.*

**Зіма.** Прыміце мае пажаданні напаследак:
Тым, хто радзіўся, — каб весяліўся.
Хто пасварыўся — каб памірыўся.
Хто прачакаўся — каб спадзяваўся.
Хто спрацаваўся — каб мацаваўся.

**1-ы зазывала.** Снежная баба едзе на пенсію.
Едзе з двара, бо прыйшла пара.

**Кладаўшчык.** Хвілінку! Да гэтакай спешкі я не прывык!

**Баба Снегавуха.** Што так сурова глядзіш мне ў твар?

**Кладаўшчык.** Прашу, паважаная, здаць інвентар.
Здайце, бабуля, па акту ў кладоўку
Кій і каструлю, мятлу і маркоўку.
Здайце, бабуля, казённыя рэчы,
Праз год вам сустрэчу я зноў забяспечу.

**2-і зазывала.** Хутчэй! Бо спасцігла бабу бяда:
Закапала ў бабы з носа вада!

**3-і зазывала.** Спяшайся, бабуля, вяртайся зімой!
Снежнаю, свежай і маладой!

*Баба Снегавуха адыходзіць.*

**4-ы зазывала.** Гэй, Вясна, ты красна,
Што ты нам прынясла?

**Вясна.** Я, Вясна-красна, вам прынясла
Бохан хлеба, ступу солі,
Старым бабкам па прызбачцы,
Малым дзеткам па вуліцы,
А хлопчыкам па кіёчку,
А дзевачкам па вяночку.

*Гучыць песня «Ты, пчолачка ярая».*



Ты, пчолачка ярая,
Ты вылець з-за мора.
Ой, ляло, ляло,
Ты вылець з-за мора.

Ты вынесь ключыкі,
Ключыкі залаты.
Ой, ляло, ляло,
Ключыкі залаты.

Ты замкні зімачку,
Зімачку студзёну,
Ой, ляло, ляло,
Зімачку студзёну!

Адамкні лецейка,
Лецейка цёплае,
Ой, ляло, ляло,
Лецейка цёплае!

**1-ы зазывала.** Гэй, збірайся, народ!
Занясём гэта пудзіла на агарод!
Каб урадлівы быў увесь год!

*Усе ідуць на стадыён, становяцца ў карагод вакол вогнішча і звяртаюцца да Зімы.*

— Згары, Зіма, ты нядобрай была.
— Адыдзі, Зіма, ты мокрай была.
— Згінь, Зіма, ты нямой была.
— Пусці Вясну на зямлю маю.

*Гучыць песня «Ой, Масленка-няшчасленка...».*

**Хутка, гукаючы** ♩ = *88*




Ой, Масленка-няшчасленка,
Шэра вутка... У!
Ты ж казала, вясна скора,
Да й не хутка... У!
Праводзім зіму з качаргамі... У!
Сустракаем вясну з пірагамі... У!

*Гарыць пудзіла Зімы.*

**Бабка Марылька.** На Масленіцу вялікая пашана аддавалася тым рэчам, якія нагадвалі сонца.

**Бабка Параска.** Нават на конях ездзілі вакол Узды некалькі разоў, каб адзначыць кола.

**Бабка Марылька.** Не будзем адступаць ад гэтага звычаю і мы. Таму запрашаем вас праехацца на конях вакол нашай школы.

**3-і зазывала.** А цяпер усіх вас
Запрашаем мы да нас,
На шасток вы залязайце,
Падарункі выбірайце.

*Дзеці залазяць на слуп і выбіраюць прызы.*

## «Свята Вялічка з красным яечкам...»

### *Методыка падрыхтоўкі*

За тыдзень да свята аб'яўляецца конкурс на самае прыгожае размалёванае яйка, на лепшую віншавальную паштоўку з Вялікаднем, якія затым упрыгожваюць залу. Развучваюцца на ўроках музыкі і спеваў велікодныя песні.

Работнікі кухні выпякаюць пірагі і фарбуюць яйкі — усё робіцца, каб наблізіць інтэрнатныя ўмовы да дамашніх.

Сцэна стылізавана пад беларускую хату (акно, ікона на покуці, святочны стол, печ, прыгожа ўбраны ложак).

Свята «Вялікдзень», падрыхтаванае дзецьмі і дарослымі нашай школы, было паказана па Беларускім тэлебачанні ў праграме «Запрашаем на вячоркі».

### *Методыка правядзення*

*У хаце бабуля. Да яе заходзяць унукі, вітаюцца.*

**Унукі.** Хрыстос уваскрэс!

**Бабуля.** Сапраўды уваскрэс! (*Тройчы цалуюцца.*) Адкуль вы так ранютка?

**Унук.** А мы з мамай на ўсяночную хадзілі, стравы свянцілі.

**Унучка.** Вось і вам мама свянцонага перадала.

*Накіроўваюцца да стала. Унучка дастае з кошыка пірог, яйкі, мяса, мёд, хрэн, гуркі.*

**Бабуля.** Дзякую, дзетачкі. А ці многа людзей было ў царкве?

**Унук.** Вой, многа, бабулечка.

**Бабуля.** Ды і ў мінулую нядзельку, Вербную, таксама шмат было. Хадзіла ж і я вярбу свянціць. Давайце свянцонае яйка пакрышым. Пасыпай, унучка, соллю.

*Унук гэтым часам, пакуль бабуля з унучкай размаўляюць, ускоквае на лаўку і глядзіць у акно.*

**Унук.** Гляньце, гляньце, як сонца «іграе»!

**Унукі.**

— І праўда!

— Ой! Як прыгожа!

— І так толькі на Вялікдзень?

**Бабуля.** Так, дзеткі. Існуе павер'е, нібыта на першы дзень Вялікадня «іграе» сонейка, струменіць свае праменьчыкі. Гэта свята ў гонар сонца, абуджэння прыроды, надыходу «вялікдзён» палявых работ. Пасля зімовага адпачынку людзі будуць сеяць, палоць, касіць, жаць, а яшчэ да гэтага свята прымеркавана хрысціянскае свята «Уваскрашэнне ўкрыжаванага Хрыста». Ці не забыліся песеньку з мінулага года?




Свяці, свяці, сонейка, каб нам было цёпленька.
Ай, люлі, люлі, люленькі-люлі*.
Пад хатаю седзячы, лусту хлеба дзержачы,
Яечкі качаючы, песенькі спяваючы.

**Унук.** Ой, як у вас, бабка, смачна пахне.

**Бабуля.** Не, дзеткі, перш чым есці, памыйцеся адварам, у якім я яйкі фарбавала.

**Унучка.** А чаму так трэба мыцца?

**Бабуля.** А каб хваробы вас баяліся. (*Дзеці мыюцца.*) Мыйце вочкі свае светлыя, каб тварыкі былі чыстыя, а шчочкі ружовыя, як яечкі. Каб жыццё ваша было чыстым і празрыстым, як крынічка лясная. Дай вам Бог вырасці здаровенькімі ды працавітымі людзьмі. Ну вось, вочкі засвяціліся радасцю, як зорачкі. А зараз хуценька да стала. Хачу вам нагадаць, што на Вялікдзень гатавалі багата страў, але пачыналі снедаць пасля таго, як кожны паспрабуе скрылёчак яечка, солі і хлеба. Таму ўсіх запрашаю адведаць святочную страву.

---

* Паўтараецца пасля кожнага радка.

*Дзеці частуюцца за сталом. Бабуля, прыгаворваючы, дакранаецца галінкай вярбы да дзяцей.*

**Бабуля.** Не я б'ю,
Вярба б'е.
Сёння — Вялікдзень.
Будзьце здаровы,
Як тая вярба,
Будзьце вясёлы, як тая вясна.
Слухайце бацьку,
Слухайце маці,
Не забывайце ўсім памагаці.

**Унук.** Ой, як усё смачна!

*Адно дзіця закашлялася, ухапіла шмат хрэну. Астатнія смяюцца.*

**Бабуля.** Хутчэй, унучак, хлеба панюхай. Ну як, зараз лепш?

**Унук.** Ну і крэпкі.

**Унучка.** А да вас сёння госці прыйдуць?

**Бабуля.** А як жа. Цётка Люда з Генем пірог прынясуць, я ж іх дзіця купала. Ды і валачобнікі, напэўна, прыйдуць.

**Унук.** Прыйдуць, прыйдуць. Вунь наш сусед Хвядос казаў, што, як будуць па сяле хадзіць, абавязкова да вас зойдуць. Сястрыцы, давайце ў біткі пагуляем.

**Бабуля.** Пагуляйце, унучкі, пагуляйце.
Але спачатку моц яек паспытайце.
Як гэта робіцца — не трэба саромецца,
Спачатку аб зубкі пастукайце,
Тады да вушка прыкладзіце — паслухайце.
Калі яечка гудзе — значыць, моцным будзе,
А калі не, значыць, нехта разаб'е.

**Унукі.**

— Будзем біць яйкі?

— Будзем, дай найперш паспрабаваць. (*Абменьваюцца яйкамі і спрабуюць іх асцярожна на зубы.*)

— Нешта тваё, брат, дужа крэпкае, ці ж не фальшывае?

— А тваё яйка крапчэй, давай мяняцца.

— Не. Не хачу мяняцца.

— То трымай, буду біць. (*Паспрачаўшыся, б'юць.*)

**Бабуля.** Давайце загадаем, хто будзе ў нашай кароўкі. Калі першы зойдзе мужчына, дык бычок, а жанчына — дык цялушачка.

*Дзверы адчыняюцца. Заходзіць дзядзька.*

**Унукі.** Бычок! Бычок!

**Бабуля.** А сціхніце вы!

*Дзеці са смехам разбягаюцца. Прыходзяць мужчына і жанчына, чыё дзіця купала бабка.*

**Муж, жонка.** Хрыстос уваскрэс!

**Бабуля.** Сапраўды ўваскрэс!

**Жанчына.** А мы сёння бабулі пірог прынеслі ад унучка.

**Бабуля.** А як жа мой унучак гадуецца?

**Жанчына.** Нічога, ужо, дзякуй Богу, сёмы месячык пайшоў, ужо чатыры зубочкі мае.

*Абменьваюцца яйкамі, даюць пірог.*

**Мужчына** (*аглядаючы стол*).

Ляжыць тут шынка, як кадушка,
Румяна-белая пампушка,
Чырвона зверху, сакаўная,
Як бы агонь у ёй палае,
А ніз бялюткі, паркалёвы,
Кілбасы — скруткі, як падковы,
Між сцёган сала і грудзінак
Красуе смажаны падсвінак —
Чысцюткі, свежы і румяны,
Як бы паніч той надзіманы.
Муштарда, хрэн — адно дзяржыся,
У рот паложыш — сцеражыся!
А пірагі, як сонца, ззяюць,
У роце самі таюць.
Са смакам ядуць і багата —
На тое ж даў Бог людзям свята.

**Унукі.**

— А як вы думалі, дзядзька, на Каляды — каўбасы, на Вялікдзень — сыр, а ўсё чалавек сыт.

— Свята Вялічка — з красным яечкам.

**Мужчына.** Бачыш, як прыказкамі шпараць, відаць, ад бабулі перанялі.

*Бабуля запрашае да стала. Ядуць і хваляць.*

Якое мяса смачнае. Відаць, перад Вялікаднем закалолі.

**Бабуля.** Ды не, два месяцы таму. Але лапатку заўсёды пакідаю, каб на Вялікдзень адварыць.

**Жанчына.** А агуркі якія храбусткія. Вясна ўжо, а як добра захаваліся.

**Бабуля.** Дык у дубовай бочцы дзіва што добрыя будуць.

**Жанчына.** А ці ведаеце вы, дзеткі, што на Вялікдзень зязюля першы раз кукуе?

**Унук.** З Вялікадня птушкі пачынаюць пець.

*Абменьваюцца падарункамі. Праводзіцца гульня «Яйка пад шапкай». Чуецца музыка. Ідуць валачобнікі.*

**Валачобнікі.**

— Ішлі, прыйшлі валачобнікі,
Іграючы ды спяваючы,
Добрую гаспадыню шукаючы.
— Добры дзень, пані гаспадыня!
Ці спіш, ці не спіш, пані гаспадыня?
— Калі ж спіш, Бог з табою,
Калі ж не спіш — ходзь са мною.
— Чуеш? Святое Вялічка з красным яечкам.

**Жачок*.** Я — маленькі жачок, паўзу, як рачок,
Скачу, як жабка. Дай яечка, бабка.
Не дасі яечка — уцячэ авечка,
Не дасі кока — вывернецца вока.

**Бабуля.** Час ужо і заспяваць, святочныя віншаванні сказаць.

**Пачынальнік.** Дык чаго ж чакаць?
Ёсць што сказаць.
Гаспадар паважаны,
Людзьмі шанаваны,
Шмат дабра мае,
Чужога не спажывае.

**Падхватнік.** Дай Божа, пані гаспадыня,
Табе і тваім гасцям,
Каб вы пілі і елі,
Вясёленька сядзелі,
Добрыя думкі мелі.

*Гучыць песня.*

**Рухома, бадзёра**




---

* Жачок — хлопчык-валачобнік.

Ай, ішлі-пайшлі добры молайцы,
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!*
А ішлі яны, усе шаталіся,
Багатырскі двор усё пыталіся.
А на чым знаток багатырскі двор? —
На ім шуллейка ўсё дубовае,
Падваротніцы ўсе цясовыя,
Па двару ішлі — кладачкі клалі.
Дзень добры таму, хто ў гэтым даму!
А ці спіш-ляжыш, ці адпачываеш?
А калі спіш, дык Бог з табою,
А калі ня спіш — гукай са мною,
Гукай са мною, як муж з жаною.
Здзявайце, братцы, бабровы шапкі,
Благадарыце гэтаму пану
За яго дары, за вялікія,
За яго сталы, за дубовыя,
За яго скацерці, за рубчастыя.
А мы госцейкі ды не частыя,
Круглы гадочак — адзін разочак.

**Падхватнік.** О то не, пані гаспадыня,
Песня спета проці лета.
А будзь жа вясёла, як вясна-красна,
А будзь жа ціха, як ціха лета,
А будзь жа багата, як багата восень,
А ты, гаспадынька, усё дагадайся:
Патэльню — у печ, па яечкі — у клець,
Кавалак сала прыхапі,
Прынясі ж нам кілбасы з шастом,
Кілбасы з шастом ды свінню з хвастом.

**Бабуля.** Няма чаго даваць,
Сама хутка пайду жабраваць.

**Падхватнік.** Не скупіся, гаспадынька,
Некалі заможна жыла,
Усякага дабра займела,
Цяпер нешта паскупела.
Гаспадынька-журавінка,
Адары нас, не мары нас.

**Пачынальнік.** Дай кожнаму пеюну хоць па яйку,
Ну, пачынальніку дасі парачку.

**Падхватнік.** Нашаму механошу — пірог ды галёшу,
Ну і ў торбачку яго гарачэйшага чаго.

**Запявала.** У музы́кі горкая доля:
Што даюць — бярэ і тое.

*Бабуля ўсіх адорвае.*

**Механоша.** А дзякуй, гаспадыня, за пшонны піражок.
Дзякуй табе, пані, за добрыя дары.
Каб дажыць да лета, ды лепей за гэта.

*Гучыць песня «Валачобная».*

---

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка.




Валачобнічкі валачыліса,
Валнай, валнай, Божа, памагай!*
Прывалакліса к слаўнаму пану,
Хрыстос васкрос на увесь свет!**
Да ў таго пана двор мураваны,
Двор мураваны, тынам тынаваны,
Пасярод двара залатая гара.
Ды на той гарэ сады-вінаграды,
Сады-вінаграды пазасаджваны,
Райскія птушкі напрынаджваны.
Адкуль узяліся шуры ды буры,
Шуры ды буры, буйныя ветры,
Буйныя ветры, дробныя дажджы.
Сады-вінаграды да паламала,
Райскія птушкі да паразганяла.
Да зажурыўся пане гаспадару.
Да ў яго была жонка разважна:
— Да не журыся, пане гаспадару.
Калі будам жыці, жыці да быці,
Сады-вінаграды пазасаджваям,
Райскія птушкі папрынаджваям.

---

* Паўтараецца пасля кожнага няцотнага радка.
** Паўтараецца пасля кожнага цотнага радка.

**Бабуля.** Сядайце, госцейкі, сядайце.

**Валачобнікі.**

— Ці даўно зімой да вас, цётка, на вячоркі збіраліся? А ўжо і Вялікдзень.

— Бач, колькі месца мы ў вас занялі. Але ж, цётачка, разлічвайце, што яшчэ да вас валачобнікі прыйдуць.

— Ну, аж тры гурты сёння па вёсцы ходзяць.

— А чаго ж нам сядзець? Давайце, хлопцы, яйкі пакачаем.

*Ідзе гульня. Зноў чуецца музыка, прыходзяць валачобнікі.*

**Валачобнікі**. Добры дзень таму, хто ў гэтым даму.
Ці не супраць, гаспадыня,
Каб да вас завітаць, віншаванні свае перадаць.
Валачобнікі — людзі добрыя,
Небывалыя, пажаданыя.
Нячаста ходзім, нямнога просім,
Толькі ў гадочак адзін разочак.
А колькі ў нас гасцей багата,
Што ні чалавек, то хата,
Спяшайцеся ў госці запрасіць,
Калі ёсць яшчэ чым дарыць.
Дай жа, Божа, пані гаспадыні
Жыці-быці, шмат багацця нажыці,
Палавіну прадаці, частку валачобнікам даці.

*Гучыць песня «Да была ў бабкі курка-рабушка».*




Да была у бабкі курка-рабушка.
Божа, дай, Божа, дай, Божа, памагай!*
А нанесла яец повен карабец.
Ды прыйшлі к бабке валачобнічкі,

---

* Паўтараецца пасля кожнага радка.

Валачобнічкі, недакучнікі.
Яны не дакучаюць, раз у год бываюць.
Падавала бабка ўсім па яечку,
Усім па яечку, шчэй па піражэчку,
Аднэй сіраце да не вышлася.
Вярніся, сірата, за новыя варата:
Бог цябе кліча, шчэ яечка дае,
Цялушку-рабушку дзіцяці на юшку,
Каня варанога, сядло залатое.

**Валачобнік.** Ці ўслых табе наша песня? Калі ўслых табе — не тамі ж ты нас, адары лепш нас.

*Бабуля адорвае.*

**Валачобнікі.** Дзякуй за тое, што адарылі,
Добрым словам прывіталі,
Са спагадай сустракалі.
Жывіце здаровы ды будзьце багаты.
Ды не самі з сабой, са сваімі дварамі.
Ды са сваімі са блізкімі,
І са бліжнімі, і са дальнімі,
З пакрэўнымі ды прыяцелямі.

*Гучыць песня «Зялён садок вішнёвы».*




Добры вечар, паненачка!
Зялён садок вішнёвы!*
Адчыні нам акеначка.
Адчыніўшы, здзівіся.
Харашэнька прыбярыся.
Пакланіся маме й тату.
Хай паклічуць нас у хату.
Прывітаюць хлебам-соллю.
І пасадзяць па застоллю.
Мы па свеце вандравалі.
Васкрасенне велічалі.

---

* Паўтараецца пасля кожнага радка.

**Бабуля.** Сядайце, госцейкі жаданыя.

**Валачобнік.** Бач, мы ўжо тут не першыя.

**Бабуля.** Праходзьце, месца ўсім хопіць.

**Валачобніца.** Якія, цётка, у вас яйкі прыгожыя атрымаліся, а я свае ператрымала, дык надта цёмныя.

**Бабуля.** А ў мінулы год яшчэ прыгажэйшыя былі. Нарвала сунічніку, прыляпіла, дык як пафарбаваліся, пярэсценькія былі.

**Валачобнік.** А вунь Волька Пракопава дык у пасачкі каляровыя фарбуе.

**Валачобнік.** Што гэта жанкі ўсё сябе хваляць. Давайце, хлопцы, у біткі пагуляем. Хто будзе са мною біцца?

*Дастае драўлянае яйка. Разбівае ў траіх, затым пад шум і смех яго выкрываюць. Чуецца гоман, музыка, заходзіць трэці валачобны гурт.*

**Валачобнікі.** Тут сабраліся ды добры малайцы,
Добры малайцы ды валачобнікі,
І ішлі яны, ішлі, гуляючы,
Слаўнага сяла ўсіх пытаючы,
Слаўнага сяла ды багатага двара.
Надары гасцей, каб ішлі часцей,
Нашы дары ні вялікі, ні малы.
Пару яек ды з варэннем пірагі.

**Бабуля.** Хрыстос уваскрэс! Запрашаем у госці.

**Валачобнікі.** Не тамі гасцей, надары хутчэй.
Не дасі абаранак — разламаем увесь ганак.
Да вынесь, вынесь, пані гаспадыня,
Карабец яец. Ды й не лічоных,
Мы ж тыя яечкі самі пералічым,
Пані павялічым.

**Бабуля.** Адару, адару, але найперш песняй пацешце.

*Гучыць песня «А на дварэ стаіць дубок». Гаспадыня адорвае валачобнікаў.*






А на дварэ стаіць дубок.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!*
А на дубку сінь галубок.
Выйшаў, выйшаў млоды Йванька,
Меціў стрэліць у галубка.
— Не бі ж мяне, не страляй мяне,
А я ж табе прыгаджуся.
А як будзеш жаніціся,
Як будзеш браць за гарамі,
За гарамі, за марамі,
Будзеш прасіць піравознічкаў,
Будзеш прасіць, ня ўпросішся.
Я ж цябе піравязу:
Цябе з Марынкай на хрыбточку,
А радзіну на хвасточку.

**Валачобнікі.** Дай вам Божа, добрая гаспадыня,
Доўга жыці, вясёлымі быці!
Хай вашы дзеткі будуць як у полі кветкі,
Хай ваша ніва будзе ўрадліва.
Дай, Божа, пані гаспадыні
Жыці, быці, унукаў пажаніці,
Праўнукаў дачакацца
Ды нас у госці пазваць.

*Гучыць песня «Валачобная».*

* Паўтараецца пасля кожнага радка.




Валачобнікі валачыліся.
Хрыстос васкрэс, Сын Божы!*
Валачыліся, намачыліся.
Зайшлі к бабцэ пасушыліся.
Была у бабкі курка-рабушка.
Нанесла яечак поўны запечак.
Усім валачобнікам па яечку.
Аднаму ж Ванечку да не выстаралась.
— Дам табе, Ваня, стада авечак.
Ён авечак не бярэ і дамоў няйдзе.
— Дам табе, Ваня, пару каней.
А ён коней не бярэ і дамоў няйдзе.
— Дам табе, Ваня, красну дзеўку.
А ён дзевачку ўзяў і дамоў пайшоў.

**Бабуля.** Праходзьце, сядайце.

**Валачобнік.** Во, цётка, у вас заўсёды ў хаце людна.

**Бабуля.** А я і люблю, што да мяне заходзяць, хаты не мінаюць.

**Валачобнік.** Паходзім па вашым сяле, а пасля абеду і ў Зенькавічы сходзім, а мо ў Чурылава падамося.

**Бабуля.** А вой, і не лянуецеся?

**1-ы валачобнік.** А чаго ленавацца, гэта ж не араць. Ногі маладыя, дык самі нясуць.

**Бабуля.** Хадзі ды трохі прыглядвайся, каб дзеўку якую прыглядзець, а то і састарышся адзін. (*Усе смяюцца.*)

**2-і валачобнік.** Ходзячы, мо што і выхадзіш.

**1-ы валачобнік.** Во языкі, во прычапіліся. Сёння ж мяне не ў сваты прывялі. А што, цётка, мо пойдзеш за мяне?

**Бабуля.** Мілок, мне б гадоў дваццаць скінуць.

**2-і валачобнік.** Дык за мяне ідзі.

**Бабуля.** А куды жонку тваю дзенем? Да мяне прывядзём ці мне да вас ісці?

**Дзеці.** Бабуля, а мы на арэлях хочам ісці пагушкацца.

**Бабуля.** Вось песню паспяваем, карагод паводзім ды пойдзем.

*Гучыць песня. Усе ўдзельнікі водзяць «Тураўскі карагод».*

---

* Паўтараецца пасля кожнага радка.




Ідзе, ідзе карагод, карагод.
Ўсе дзевачкі напярод, напярод.
А хлопчыкі за намі,
Маргаючы вачамі.

Прыпеў:
Ото ж карагод,
Ото ж ваявод.
У нашага карагода
Быў сын ваявода.

Дзе карагод ходзіць,
Там жыта родзіць.
А дзе не бывае,
Там жыта вылягае.

Прыпеў.

Ідзе, ідзе карагод.
Усе дзевачкі напярод, напярод.
А хлопчыкі за намі,
Маргаючы вачамі.

## Піліпаўскімі вечарамі

### *Методыка падрыхтоўкі*

Выбар правядзення піліпаўскіх вячорак зроблены невыпадкова. У разуменні сучаснага школьніка вячоркі — гэта вясёлае ігрышча з песнямі, танцамі, жартамі. Знаёмства з піліпаўскімі вячоркамі дазваляе пашырыць кругагляд вучняў, зразумець, што ў жыцці нашых продкаў былі моманты духоўнага і цялеснага ўстрымання (28 лістапада пачынаўся піліпаўскі пост). Яшчэ і зараз многія людзі, асабліва сельскія жыхары, ніколі не выбіраюць даты вяселля ў межах Піліпаўкі — часу воўчых вяселляў: сыдуцца маладыя — і будуць жыць, як ваўкі, г. зн. «грызціся». Такі звычай бытуе і ў нас,

на Уздзеншчыне, аднак прытрымліваюцца яго не ўсе. Менавіта піліпаўскімі вечарамі нашымі бабулямі зроблены самыя прыгожыя, самыя разнастайныя карункі, вышыўкі і іншыя вырабы.

Круціцца ў руках верацяно, уецца доўгая нітка жывой повязі мінулага і сучаснага.

## *Методыка правядзення*

**Вядучы.** Добры вечар, сябры, паважаныя бацькі і дзеці! Вельмі добра, што вы завіталі сёння да нас. З глыбокай даўнасці прыйшоў гэты звычай — вячоркі. Як ні цяжка было жыць у тыя далёкія часы, а ўсё ж засталася ў народа любоў да песень, танцаў, гульняў, жартаў.

Наш час таксама не вельмі лёгкі. Таму мы вырашылі: будзем вучыцца ў нашых продкаў, якія і ў горы і ў радасці не забывалі сваіх песень і танцаў. Вось таму сёння мы запрасілі вас на вячоркі «Піліпаўскімі вечарамі».

*Вясковая хата. Бліскае агеньчык. Гучыць лірычная песня «Ой, позна, позна я з вечара сяджу...». Мелодыя адвольная.*

Ой, позна, позна я з вечара сяджу,
Ой, тонка, звонка белы кужаль праду.
Ой, праду, праду, у ваконца гляджу.
А пад вакенцам быстра рэчка цячэць,
А па той рэчцы шэра вутка плывець.
Ой, там не вутка, родна матулька.
Ой, кіну, кіну я пражу пад лаўку,
А сама пайду з маменькай вітацца.

**Гаспадыня.** Восеньскія вяселлі адгрымелі. Вось і вёска наша як бы заціхла, замерла. Папрацуем цяпер, дочкі, з вамі, працы вялікай вас навучу.

**Дачка.** Маці, мы і так ужо ведаем, ад цябе перанялі ўсё. Вось толькі апрацоўку лёну і канапель закончылі.

**Гаспадар.** З гары знесены і ўсталяваны кросны. Можна ўжо вячэру святочную пачынаць.

**Гаспадыня.** Зараз вось вячэраць будзем, але толькі бабку-пупарэзніцу дачакаемся. Справілі вяселле, то праз пэўны час без яе ніяк не абысціся.

*Уваходзіць бабка, і ўся сям'я сядае вячэраць.*

**Бабка.** Вось і піліпаўскі пост пачаўся. І будзе цягнуцца шэсць тыдняў, ажно да самых Каляд.

**Гаспадыня.** Так. І асноўны занятак цяпер у нас, жанчын, — ткацтва і прадзенне.

**Дачка.** У народзе кажуць: «Што ў Піліпаўку спрадзем, тое ў Вялікі пост сатчэм».

**Гаспадар.** У Піліпаўку збіраецца «воўчае вяселле».

*Дочкі смяюцца, пераглядаюцца.*

**Бабка.** А чаго гэта вы? Бацька праўду кажа. Як Піліпаўка настала, то ваўкі ідуць гайнёю.

**Гаспадыня.** А я памятаю, як мая маці даўней казала: «Як у Піліпаўку навісь на дрэве, то будзе ўраджай на хлеб».

**Гаспадар.** Шкада, што сёлета Піліпаўка не такая. Бо сёння надвор'е было хмурнае і снежнае, таму, па народнай прыкмеце, травень будзе мокры.

**Бабка.** Будзем спадзявацца на Бога. Можа, што і зменіцца.

**Гаспадыня.** Так. Чалавек увесь час дбае аб працы.

**Гаспадар.** А як жа інакш? Вось і цяпер, у піліпаўскі пост, хлопцы будуць дапамагаць маці навіць на кросны падрыхтаваную аснову, а вы, дзяўчаты, каб добра яе расчэсвалі грэбнямі.

**Гаспадыня.** Так-так, кросны будуць стаяць у хаце аж да самай вясны. Многа работы для ўсіх!

**Бабка.** Колькі за гэты час будзе выткана палатна для дзіцячых сарочак, прыгожых, рознакаляровых посцілак, усялякіх ручнікоў і паясоў! Нездарма ж у народзе кажуць: «Піліп дзяцей адзявае».

**Гаспадар.** А ты, Надзейка, куды гэта супраць ночы збіраешся?

**Гаспадыня.** А хіба ты не ведаеш, Сцяпанку, што дзяўчаты цяпер не сутыкаюцца дома? На ўсю восень і зіму яны нанялі сабе хату на попрадкі, супрадкі.

**Гаспадар.** Гэта, можа, Настассі-ўдавы хату?

**Надзейка.** Так, татачка. У яе. І заплацілі ў складчыну ёй бульбай, ільном, канапляным семем, крупамі. Вось лён, поўсць з сабой захвачу і пабягу.

**Бабка.** Ды і я ўжо патэпаю дахаты. Позна. Бывайце.

**Гаспадар.** Пара і нам, жонка, спаць. Тушы лямпу.

*Гаспадары тушаць лямпу. Чуваць голас Надзейкі: «Дзяўчаты, пачакайце мяне, разам пойдзем».*

*Хата ўдавы Настассі. Яна сядзіць, вяжа і напявае.*

Каб я знала, каб я ведала
Сваё горка замуж'ейко.
Сваё горка замуж'ейко,
Ліхое да й падруж'ейко,
То б я замуж да й навек не пайшла,
Я б у маткі як жыла, так была.

*Заходзяць дзяўчаты і жанчыны.*

**1-ая жанчына.** Добры вечар у хату,
Шчыра вас вітаем,
Добрага здароўя вам жадаем!
Ці можна да вас на вячоркі?

**Настасся.** Калі ласка! Калі ласка! Праходзьце, дзяўчынкі і жанчынкі, сядайце, даражэнькія. Будзем працаваць, песні спяваць, у скокі, можа, пусцімся ды маладосць сваю ўспомнім.

**2-ая жанчына.** Сядзем радком, пагаворым ладком.

**3-яя жанчына.** За добрай размовай і работа ідзе хутчэй.

**1-ая дзяўчына.** А паглядзіце, якія прыгожыя ручнікі ў хаце! І хто ж гэта іх ткаў, вышываў?

**Настасся.** Гэта ручнікі маёй маці. Сапраўдны ручнік — гэта не проста кавалак тканіны, якім выціраюць твар і рукі. На Беларусі шмат звычаяў, звязаных з выкарыстаннем ручнікоў. На ручніку падносяць хлеб-соль, калі вітаюць дарагіх гасцей, таму што ручнік — гэта сімвал чысціні, цяпла беларускай зямлі і роднай хаты.

**2-ая жанчына.** Нездарма беларусы шануюць сваё «белае золата».

**3-яя жанчына.** Давайце, жанчынкі, паспяваем пра лён.

*Гучыць беларуская народная песня «Ох, і сеяла Ульяніца лянок».*




Ох, і сеяла Ульяніца лянок,
Ох, і сеяла Іванаўна лянок!

Прыпеў: Ох, сэрца — лянок,
Мая радасць ты, лянок!
Ўсё бялюсенькі кужалёк!

Ох, палола Ульяніца лянок,
Ох, палола Іванаўна лянок!

Прыпеў.

Ох, і рвала Ульяніца лянок,
Ох, і рвала Іванаўна лянок!

Прыпеў.

А сарваўшы, у снапочкі ставіла,
А сарваўшы, у снапочкі ставіла.

Прыпеў.

Ох, і слала Ульяніца лянок,
Ох, і слала Іванаўна лянок!

Прыпеў.

Ох, і прала Ульяніца лянок,
Ох, і прала Іванаўна лянок!

Прыпеў.

Ох, і ткала Ульяніца лянок,
Ох, і ткала Іванаўна лянок!

Прыпеў.

А саткаўшы, ды сарочак нашыла,
А саткаўшы, ды бялёных нашыла!

Прыпеў.

**1-ая дзяўчына.** Слухайце, дзяўчаты, давайце пагадаем, ці пойдзе хто з нас замуж.

**2-ая дзяўчына.** Як гэта, я і не ведаю.

**3-яя дзяўчына.** А вось цётка Васіліна ведае. Паслухайце.

**1-ая жанчына.** Каб даведацца, быць ці не быць новай сям'і, гадаюць на сцяблінках высушанага льну. Трэба ўзяць дзве сцяблінкі, падпаліць ды кінуць іх угару. Калі яны пераблытаюцца між сабой — павяжуць рукі маладых вясельным ручніком, калі не — сядзець у дзеўках яшчэ год.

*Дзяўчаты гадаюць.*

**2-ая жанчына.** А я ведаю, як гадаюць пра тое, якой з дзяўчат будзе лепш замужам. Нясі, Настасся, свае лучыны, замочаныя ў вадзе.

*Настасся прыносіць дзве-тры лучыны.*

**1-ая жанчына.** Падпальвайце, дзяўчаты. Пашчасціць у жыцці той з вас, у каго лучына будзе гарэць ярчэй.

**3-яя жанчына.** А каб даведацца, з кім вы згуляеце вяселле, у дзень святога Ануфрэя, праз адну ноч, пасыпце пад падушку ячменю са словамі: «Святы Ануфрэю, я ячмень сею, дай жа ты мне знаць, з кім я буду жаць».

**Настасся.** Чаму ж, дзяўчаты, вы адны прыйшлі? А дзе ж вашы хлопцы падзеліся?

**3-яя дзяўчына.** Ды не патрэбны нам такія хлопцы!

*Гучыць песня «Да было не спаць да ціліпавай ночкі».*




Да было не спаць да піліпавай ночкі*,
Было прасці тоненькія сарочкі.
Як пайшла я да й у сад зеляненькі,
Сустрэў мяне да й казак маладзенькі.
Ён на мяне да й ківае, міргае,
Ён у мяне да й дарожкі пытае:
— Ці ж ты, казак, ці розуму не маеш,
На дарозе ты дарожкі пытаеш?
Ці ж на гэта мяне мамка радзіла,
Каб казакаў па дарожках вадзіла?
Вой, на тое мяне мамка радзіла —
Тонка прасці, звонка ткаці
Да беленька бяліці.

**2-ая жанчына.** А вось і зразумела, чаму вы пагублялі сваіх хлопцаў, запатрабаванні да іх вельмі вялікія. Але ж і дзяўчаты бываюць розныя.

*Гучыць песня «Рында».*

**Жвава, з усмешкай**




Сядзела Рында ды на печышчы,
Рында, Рында!**
Грэла свае ногі ды плечышчы,
Прыйшлі к Рындзе жаніхі, жаніхі,

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.
** Паўтараецца пасля кожнага радка.

Узялі Рынду варухі, варухі.
Ой, пайшла яна па суседачках.
— А дайце ж вы мне па сарочачцы,
А дайце ж вы мне па намітачцы.
— А было не спаць піліпавай ночы,
Прадраць было дзеркачом вочы!
— Чорт жа вас бяры, мае суседачкі,
У майго бацькі да бяроз многа,
Да здзяру то я берасціначку.
Да пашыю ж я хвартушыначку.
Падзірачкам як падпераджуся
Да свайму жанішку так і пакажуся.
Накрыюся я мяшком, мне не сорам з жанішком.

*Стук у дзверы.*

**4-ая дзяўчына.** Ой, відаць, хлопцы да нас завіталі на вячоркі. Можа, пажартаваць, пазагадваць загадкі, пачаставаць арэхамі нас прыйшлі.

*Уваходзяць хлопцы.*

**1-ы хлопец.** Вечар добры ў хату! Дазволь, шаноўная гаспадынька, завітаць ды вечар гэты скаратаць.

**Настасся.** Добры вечар, госці дарагія! Госці на госці — гаспадарам радасць!

**2-і хлопец.** Мы вось да вас на вячоркі. Песні пасպяваем, а заадно і кошыкі папляцём. Не спазніліся?

**Настасся.** Праходзьце, калі ласка. Гасцей у мяне многа, можа, яшчэ хто зойдзе.

**3-і хлопец.** Вой, дык тут жа і цётка Марыля — вядомая майстрыха (*падыходзіць да цёткі Марылі, мацае лапці, разглядае іх*). Цудоўная работа.

**Марыля.** Лапцікі — гэта абутак нашых продкаў. Іх насіла і мая маці. Вясной, калі ліпа ажывае пасля зімы і яе кара становіцца мяккай і клейкай, лупілі яе. І рабілі гэта ўмела, каб не пашкодзіць дрэва. У сям'і маёй маці было аж чатырнаццаць душ. Працавалі ўсе шчыра. Вось яна і павінна была сплесці не менш трыццаці пяці пар лапцяў. І вучылася яна гэтаму майстэрству ў свайго бацькі. Плесці лапці не цяжка. Калі я бяру ў рукі лапці — успамінаю жыццё сваіх родных. І вы павінны ведаць, як жылі вашы прабабулі, прадзядулі, што яны абувалі, як з простага лычка лапці плялі.

Я люблю лапаточкі свае,
Няма іх — мне чагось не стае…
Ў лапаточках сваіх я пяю і танцую,
Усіх добрых людзей я гасцінна частую.
Лапці роду майго знакамітага
Вам раскажуць аб лёсе татулі майго працавітага.
Я і матчыны лапці пастаўлю ў радок,
А вось тыя, малыя, — насіў мой браток.
Дык няхай жа навеюць яны даўніну
І выхоўваюць ў дзецях маіх дабрыню.

*Гучыць мелодыя песні «Эх, лапці мае». Хлопцы прытопваюць і пяюць.*




Эх, лапці мае,  
Лапці лыкавыя!  
У Яромы і Фамы  
Адзінакавыя.

**4-ы хлопец.** Гляньце, хлопцы, якая тонкая вышыўка, не рэчы, а цуда.

**1-ы хлопец.** Сапраўды, цуда. Можа, гэта ты, Алена, умееш так прыгожа вышываць? Ці ты, Надзя?

**Настасся.** Ды не, гэта да нас сёння завітала вядомая ўздзенская майстрыха Кацярына Аляксандраўна Кацуба.

**2-і хлопец.** Што Кацярына Аляксандраўна — добрая майстрыха, мы ўбачылі. А ці добра вы, дзяўчаты, умееце працаваць?

**3-і хлопец.** А можа, нават прылад працы не ведаеце?

**4-ы хлопец.** А вось зараз мы і даведаемся.

*Хлопцы па чарзе загадваюць загадкі.*

— Зубаты, а не кусаецца. Што гэта? (*Граблі.*)  
— Маленькі, гарбаценькі, усё поле абскакаў. (*Серп.*)  
— Кругленькі, маленькі, а за хвост не падняць. (*Клубок.*)  
— Конь стальны, а хвост ільняны. (*Іголка з ніткай.*)  
— Чым больш кручуся, тым больш таўсцею. (*Верацяно.*)

**2-і хлопец.** Малайцы, добра ўсё адгадалі. А ці так добра вы ўмееце спяваць, як загадкі адгадваць?

*Гучыць песня «У канец сяла…».*



Ў канец сяла,
Ў канец сяла жыла ўдава,
Мела сабе дзевяць сыноў.

Мела сабе,
Мела сабе дзевяць сыноў,
Дзесятую дачку Насту.

Сыны ўзраслі,
Сыны ўзраслі — у разбой пайшлі,
Дачка Наста замуж пайшла.

Дачка Наста,
Дачка Наста замуж пайшла.
А за каго, за якога?

Ой, за каго,
Ой, за каго, за якога?
За купчыка маладога.

Купчык едзе,
Купчык едзе купчаваці,
Купчышачка ў госці да маці.

Як напалі,
Як напалі разбойнікі,
Яны купчыка забілі.

Ой, і ўсе разбоі,
Усе разбоі спаць палеглі,
Адзін разбой не лажыўся.

Адзін разбой,
Адзін разбой не лажыўся,
З купчышкаю разгаварыўся.

— Купчышачка,
Купчышачка, адкуль родам?
А я родам з Даўгінава.

А я родам,
А я родам з Даўгінава.
Я дачушка ўдавінавая.

— Устаньце, братцы,
Устаньце, братцы, не ляжыце,
Злую волю мы ўчынілі.

Злую волю,
Злую волю мы ўчынілі,
Сястру Насту заўдавілі.

**3-і хлопец.** Так-так. Усё ў вас атрымліваецца вельмі добра: і праца, і песні.

**4-ы хлопец.** А давайце пагуляем.

**2-ая дзяўчына.** Згодны. У «Яшчара»!

*Праходзіць гульня.*

**3-яя дзяўчына.** Ой, цётка Настасся, як жа смачна пахне ў вашай хаце.

**Настасся.** А што вы думалі?! Я ж сёння гасцей чакала, бабку таркавала. Частуйцеся, калі ласка, госцейкі дарагія.

*Ставіць чыгунок, кладзе лыжкі на стол. Госці частуюцца.*

**2-ая жанчына.** У мяне чамусьці такая не атрымліваецца. Раскажы, Настасся, як яе гатуеш. А можа, у цябе бульба другога гатунку?

**Настасся.** Так. Бульбачка ў мяне сапраўды ўдалая, сопкая, жоўценькая. *(Дастае кошык з бульбаю.)* Сорт «магрэта» называецца. Цьфу ты, «адрэта». Слава Богу, у гэтым годзе і хвітафтор'я тая яе не з'ела.

**2-ая дзяўчына.** А што гэта нашы хлопцы прыціхлі? Можа, паснулі?

**1-ы хлопец.** Ды не, дзяўчаты. Як можна на вячорках спаць?

**4-ы хлопец.** А што гэта мы ўсё спяваем ды спяваем? Нічога смешнага не расказваем. Вось я люблю жарты.

**Настасся.** Раскажы, калі ведаеш.

**4-ы хлопец.** Добра, слухайце. Малады хлопец, купляючы гадзіннік, пытае ў крамніка: «А ці добра ён ходзіць?» — «Ага, — адказвае крамнік, —

ён бегае, а не ходзіць. Глядзіце, яшчэ полудня няма, а ён ужо пятую гадзіну вечара паказвае».

**2-і хлопец.** Зараз і я раскажу. Адзін пан паслаў слугу па грушы і сказаў:

— Купі мне самых лепшых.

Слуга пайшоў у краму і папрасіў груш. Купец падаў яму. Але слуга сказаў:

— Не, дайце мне самых лепшых.

Купец кажа:

— Паспрабуй адну, тады пазнаеш, што ўсе добрыя.

— Як я пазнаю, — кажа слуга, — што яны ўсе добрыя, калі паспрабую толькі адну?

І слуга паадкусваў патрохі ад кожнай і прынёс іх пану.

**3-яя жанчына.** Унук пытае:

— Бабулька, а ці дорага каштуе дзірка ад абаранка?

— А нічога не каштуе, яе без грошай даюць, — кажа бабулька.

— Тады хай бы рабілі большыя дзіркі ў абаранках.

**1-ы хлопец.** Адзін пан пытае раз у свайго фурмана, ці паедзе той з ім у вялікую дарогу.

— За вамі, пане, усюды, — адказвае фурман.

— Як гэта ўсюды? Нават у пекла?

— Нават у пекла!

— Але падумай сабе, што ў пекле надта ж горача, агонь.

— Нічога, пане, — кажа фурман, — я сваю службу знаю, высаджу пана ў пекле, а сам, як заўсёды, буду чакаць перад брамай.

**Настасся.** Дзякуй вам, даражэнькія мае суседачкі. Дзякуй і вам, хлопцы-малойцы ды дзяўчаткі-кветачкі, што завіталі да мяне на вячоркі.

**3-і хлопец.** Хопіць нам ужо, сябры,
Пець, рабіць, смяяцца.
Шкада, але трэба, цётка Настасся,
З вамі развітацца.

**1-ая дзяўчына.** Няхай вам часценька шанцуе на госці,
Ніхто каб ніколі не меў на вас злосці.

**Настасся.** Не мінайце маёй хаты, прыходзьце заўтра вечарам зноў.

**Надзейка.** Трэба нам ужо дадому. Дзякуй, цётка Настасся, за дапамогу.

**Усе.** Дабранач, цётачка, бывайце.

**Настасся.** Шчаслівай вам дарогі. Чакаю вас заўтра.

*Усе выходзяць.*



# СЦЭНАРЫІ СВЯТАЎ НА АСНОВЕ ТРАДЫЦЫЙНЫХ СЯМЕЙНЫХ АБРАДАЎ

### *Методыка падрыхтоўкі*

Перад тым як скласці сцэнарыі абрадаў радзін і вяселля, кіраўнікамі гурткоў была вывучана вялікая колькасць літаратуры з апісаннем гэтых абрадаў. Таксама былі сустрэчы з мясцовымі старажыламі, у памяці якіх жывуць яшчэ і беларускае вяселейка, і радзіны. Таму сцэнарыі адлюстравалі ў некаторай ступені тэрытарыяльныя асаблівасці гэтых абрадаў. Была праведзена і вялікая растлумачальная работа з дзецьмі аб сакральным значэнні пэўных дзеянняў. Паколькі ўзрост вучняў не зусім дазваляў, каб рэалізаваць сцэнарый, мы падключылі і дарослых. Тым больш што ў рэальным жыцці сацыялізацыя маладога чалавека адбывалася натуральна: дзеці заўсёды ў час свята былі побач з дарослымі.

І хаця многія даследчыкі сямейнай абраднасці супраць іх сцэнічнага ўзнаўлення, бо кожны абрад быў звязаны з верай у магічную сілу таго ці іншага дзеяння, мы паглядзелі на праблему з іншага боку. Калі людзі нараджаюцца і жэняцца, чаму б не паспрабаваць данесці да іх традыцыі нашых продкаў. Тым больш што ва ўмовах вялікай колькасці разводаў, пакінутых дзяцей, адчужэння бацькоў і дзяцей у апошні час у людзей з'явілася цікавасць да інфармацыі такога кшталту. А чаму б не пачаць з дзяцей такую культурна-адукацыйную работу?

### *Методыка правядзення*

## Радзіны

Бацька, свякроў і свёкар сядзяць за сталом. На ложку сядзіць парадзіха, люляе сыночка і спявае калыханку.

**Свякроў.** Трэба нашага Іваньку хрысціць, а для гэтага кумоў выбраць.

**Свёкар.** Выбар хросных бацькоў — не простая справа. Можа, за кума ўзяць Міню Кузькіна? Чалавек ён вельмі працавіты і спакойны.

**Свякроў.** Ды што ты! Хоць ён і працавіты, ды ў апошні час часта да чаркі стаў прыкладвацца. Не хапала, каб і наш Іванька п'яніцам вырас.

**Маці.** А можа, мама, возьмем Юрку Пратасевіча?

**Свякроў.** Добрая кандыдатура: і каваль на ўсю ваколіцу, і сем'янін выдатны, і ў гасцях сябе паводзіць умее. Трэба яго і запрасіць.

**Свёкар.** А за куму, можа, Настассю Гэліну папросім?

**Свякроў.** Не, Настасся не захоча. Дзяўчына вельмі ганарыстая, ды і вучоная.

**Свёкар.** Чаму не захоча, чым мы горшыя за астатніх? Ды і грэх жа адказваць.

**Маці.** Не горшыя мы, тым больш што дзяўчаты імкнуцца хлопцаў першых хрысціць, каб замуж хутчэй выйсці. Але ж трэба спытаць у Настассі. Калі не згодзіцца, то возьмем першых сустрэчных, счакаўшы на крыжавой дарозе. Так наш Іванька шчаслівым будзе, ды і куме будучай пашанцуе ў жыцці.

**Свёкар.** Ну, а бацька што думае?

**Бацька.** Так, пэўна ж, так будзе лепей. Згодны я з вамі. Каго паважаць, з тым і кумаваць. Пайду пагавару з абоімі. (*Ідзе.*)

**Свякроў.** Дачушка-нявестачка, мабыць, яшчэ ў адведкі прыйдуць да цябе сяброўкі. Ты да хрышчэння дзіцяці лежачы ў ложку ўсіх прымай, каб малачко ў цябе не прапала і здаровая была.

**Надзейка.** Пэўна ж, не ўсе яшчэ перабылі (*глядзіць у акно*). Вунь і Манька Сцяпанава ідзе (*кладзецца ў ложак*).

**Манька** (*заходзіць у хату з клуначкам, садзіцца ля парадзіхі, аддае клуначак і жадае*). Каб хутчэй набралася сіл маці, каб дзіця было здарова і зубкі хутка раслі.

*Свёкар запрашае да стала, частуе. Устае тады і парадзіха.*

**Надзейка.** Дзякуй, Манечка, што адведала нас.

**Маня.** Ды што ты, Надзейка, а як жа інакш? Але ж выбачайце, трэба бегчы дадому. Хутка Пятро з работы вернецца, трэба ежу гатаваць. (*Адыходзіць.*)

*На другі дзень Ясь запрашае куму з кумам.*

**Ясь.** Дзень добры паненцы!

**Насця.** Здарова, галубок, што добрае скажаш?

**Ясь.** Усё добрае, паненачка. Будзь ласкава, не пагардуй перахрысціць майго сыночка.

**Насця.** Добра, Яську, ад Хрыста ніхто не адмаўляецца, ды вось бяда, галубок, — абраднасцей вашых не ведаю.

**Ясь.** Калі не пагарджаеш, то навучым.

**Насця.** Што трэба для гэтага, раскажы.

**Ясь.** Вазьмі, паненачка, булачку хлеба, драбок солі і палатна на рукавы ды трохі грошай.

**Насця.** Колькі ж грошай трэба?

**Ясь.** А як твая спрамога, вазьмі з грывеньку ды тры капейкі — бабе на кашу. Ды калі хочаш нашы ўсе мужыцкія парадкі рабіць, то скажы зварыць горшчык кашы. Ды толькі, паненачка, не абаўляйся.

**Насця.** Не, Ясю, я бавіцца не буду, іду з табой разам.

**Ясь.** Хадзем, а па дарозе я яшчэ па Рыгора забягу. Ён кумам згадзіўся быць.

**Насця.** Што ж мне рабіць і гаварыць, калі я прыйду ў хату?

**Ясь.** Хлеб і соль на стале палажы і скажы: «Няхай жа добрае вядзецца». Дай парадзісе грывеньку — тады ўжо будзем збіраць дзіця несці хрысціць; толькі прашу цябе, кумачка, як будзеш несці дзіця хрысціць, то не гавары з кумам!

**Насця.** А гэта чаму?

**Ясь.** А дзеля таго, каб дзіця не было крыклівае.

**Насця.** Добра, буду маўчаць.

*Заходзяць у хату. Настасся кладзе хлеб і соль на стол, прыгаварваючы: «Няхай жа добрае вядзецца».*

**Свёкар.** Ну вось і кум з кумою ёсць. Хутка і бабка-павітуха прыйдзе. Трэба святочны стол накрываць, гасцей чакаць ды дзіця да хрышчэння збіраць.

**Свякроў.** А вунь і павітуха ідзе, трэба ваду дзіцяці прынесці. (*Нясе ночвы з вадой.*)

**Павітуха.** Добры дзень у хату! Ці не спазнілася я?

**Бацькі.** Якраз у пару.

**Павітуха.** То давайце наша немаўлятка купаць будзем. (*Маці перадае хлопчыка павітусе.*) Пакладзём лекавыя травы ў ваду, дабавім пару кропель малака, каб твару бялявага быў наш прыгажун. А вада не кіпячоная?

**Свякроў.** Не.

**Павітуха.** Глядзіце ж, а то дзіця будзе злое, крыклівае. Пакладзём яшчэ ў вадзіцу зерне, каб багаты быў. Памыем ручкі чыста-чыста, ножкі белымбела, і піпачку-нос, і вушы, і шыйку, і спіначку, каб вялікі рос, добра спаў. Вадзічка ў мора, а Ванечка — угору. А пупавіну ты схавала ў дзірку ў сцяне, каб ён далёка ад дому не ад'язджаў жыць? У тры гады дасі сыночку вузельчык, каб ён розум свой развязаў. Ой, як добра, што Іванька ў суботу нарадзіўся.

**Надзея.** А чаму?

**Павітуха** (*спавіваючы дзіця*). Таму што існуе цэлая сістэма варожбаў аб будучым лёсе дзіцяці ў залежнасці ад дня яго нараджэння. Так, лічаць, што ў панядзелак з'яўляюцца на свет няўмекі, у якіх усё з рук валіцца. Такіх людзей чакае беднасць, гаротнае жыццё. У аўторак нібыта нараджаюцца вельмі працавітыя людзі, ім шанцуе ў вытворчых справах. Тых, чый дзень нараджэння прыпаў на сераду, чакае неакрэслены лёс, ні тое ні сёе. Дзіця, якое з'явілася ў чацвер, рана пачынае хадзіць, гаварыць, праяўляе кемлівасць і спрыт ва ўсіх справах, але яму прадказвалі хуткую смерць. Пятніца прыносіць бацькам лайдакоў і зладзеяў, горкіх п'яніц. Тыя дзеці,

што нарадзіліся ў суботу, будуць шчаслівымі і ўдачлівымі. У нядзелю ж з'яўляюцца на свет самыя шчаслівыя людзі, якіх заўсёды чакаюць шанаванне і поспех.

*Затым павітуха разам з кумамі, трымаючы на руках дзіця, абыходзіць 3 разы стол, на якім ляжыць хлеб, хлеб 3 разы цалуюць. Павітуха кладзе дзіця на кажух, які разасланы на падлозе каля печы, пераступае праз дзіця некалькі разоў, прыгаворвае.*

**Павітуха.** Каб вялікае расло, каб добра спала.

Як шуба касмата, будзь так багата.

Даём вам народжанае, а нам прынясіце хрышчонае (*да кумоў*).

**Кума.** Бацькі, дзядзькі, дзядзіны і цёткі, суседзі і прыяцелькі, благаславіце яго да хрышчэння.

**Прысутныя.** Няхай яго Бог гадуе, шчасце, долю гатуе, бацьку і мацеры на пацеху і на паслугу.

**Свякроў.** Сцяпан, ты не забыўся ў парозе сякеру пакласці, пілу ды долата, каб наш Іванька быў працавіты, умелы?

**Свёкар.** Не, не забыўся, Ганначка, хай спраўдзяцца твае словы.

*Усе ідуць у царкву, застаюцца свёкар і свякроў, парадзіха, яе муж і старэйшая дачка.*

**Ясь.** Ідзі, дачушка, пакліч гасцей.

**Дзяўчынка** (*падыходзіць да гасцей*). Прасілі тата і мама, і я прашу на хрэсьбіны.

*У хату збіраюцца госці, нясуць ежу, перавязаную белымі ручнікамі, па дарозе перамаўляюцца.*

**Мужчына.** Яшчэ не з'явіліся з царквы?

**Жанчына.** А што ты хочаш, вунь дарога якая гразкая.

**Мужчына.** Дзіва што, цэлы дзень дождж ідзе.

**Жанчына.** Добрая прыкмета. Кажуць, што калі ў той дзень, як хрысцяць дзіця, ідзе дождж, то дзіця багатае будзе.

**Мужчына.** Бачыш, ужо людзі тут, а мы заўсёды апошнія. Усё збіралася, пудрылася.

**Жанчына.** Папудрышся з табой. Пакуль свіней накарміла, курэй зачыніла, дык ледзь паспела лепшую сукенку на сябе накінуць.

**Мужчына.** Цішэй, а то людзі пачуюць.

**Разам.** Добры дзень у хату!

**Свёкар.** Сядайце, з хвіліны на хвіліну прыедуць. Ужо чуваць, як званочкі звіняць.

*Усе вяртаюцца з царквы.*

**Кума** (*аддае дзіця бацьку*). На табе тваё раджонае, а наша хрышчонае.

**Ясь** (*аддае дзіця маці*). Глядзі ж, Надзейка, пакладзі яго на правы бок, каб ляўшой не быў. (*Запрашае грамаду за стол.*) Сядайце на пачэснае месца, кум з кумою. І вы, бабка, сядайце, і вы, паважаныя госці. (*Усе садзяцца.*)

**Кум.** Каб мы відзелі Іваньку пад вянцом, каб ён добра пахаў ды добра малаціў. (*Да бацькоў.*) Дай Бог вам і налета гэта.

*Гучыць песня.*




Да дзякуй Богу за дар Божы,
Што ў гэтым даму гаспадар гожы,
Што ў гэтым даму гаспадар гожы,
Гаспадынечка, як маліначка.
Гаспадар гэты — наварыў піва,
Наварыў піва і гарэлачкі,
Наварыў піва і гарэлачкі —
Паіць жа гасцей да й суседачак.

**Адзін з гасцей.** А давайце велічальную песню маці заспяваем.




— Ой, устань, устань, парадзішачка,
З-за белыя прасціны!
Паглядзі сама, парадзішачка,
Ці ўся твая радзінка,

Ці ёсць брацішкі, ці ёсць сястрыцы,
Ці ёсць татка з мамкай.
— Ой, ёсць брацеткі, ой, ёсць сястрыцы,
Ёсць мая родна й мамка.
Ёсць з кім піць-гуляць,
Ёсць з кім пагукаць.
Ёсць з кім пагукаць,
Горачка й расказаць.

**Кума.** Жадаем бацькам у Іваньку мець пацеху, у старасці — уцеху. Каб быў моцны, як вада; багаты, як зямля; вясёлы, як пчала; прыгожы, як вясна.

**Госці.** Нашлі, Божа, у гэты дом хлеб ды соль, у полі — капамі, на лугах — стагамі, у амбарах — карабамі, а ў печы — пірагамі.

**Госці** (*пытаюцца ў маці*).

А хваліся, наша Надзейка,
Ці часценька к табе бабка прыходзіла?
А якія адведкі прыносіла?

**Надзейка.** Прыходзіла бабка не раз, прыносіла каўбасу і квас.

**Госці.** Добрая бабка!

*Гучыць песня.*




Сядзіць бабка на куце,
Як галубка ў гняздзе*.

— Я й далоў не зляту,
Я ж дамоў не пайду.

Я ж за гэты куток
Адразала пупок.

Сядзіць кума на куце,
Як галубка на гняздзе.

— Я ж далоў не зляту,
Я ж дамоў не пайду.

Я ж за гэты куток
Атрымала laскуток.

---

* Кожная страфа паўтараецца.

**Госць.** Нешта мы ўжо засядзеліся. Пара і ногі размяць крышачку.

*Танцуюць «Падыспань».*

**Бабка.** Глянь, кумка, якія мужчыны прыйшлі нябрытыя.
**Насця.** А вось зараз я іх і пабрыю.
**Бабка.** Нясі, Настасся, мыла, брытву, пэндзаль.

*Брыюць мужчын, за гэта атрымліваюць грошы, аддаюць іх маці.*

**Мужчына.** Вой, насмяшыла ты нас, Настасся. Давайце ёй за ўдалы торг паспяваем.

*Гучыць песня.*




— Кума мая, кумачка,
Дзе жывеш?*

Чаму мяне ў госцейкі
Не завеш?

— Ці ты, куме, розуму
Пытаеш?

Ці ты маёй хатачкі
Не знаеш?

А вунь мая хатачка
Ля вады,

З высокага дзераўца
З лебяды.

Яшчэ к таму сенечкі
Прыпляту,

З харошага дзераўца
З асату.

Тады цябе ў госцейкі
Пазаву,

Як свежае рыбанькі
Навару.

А свежая рыбачка —
Акунёк,

А любенькі госцічак —
Мой кумок!

**Галасы.** І куму песню! Песню куму!

*Гучыць песня.*

---

*Кожная страфа паўтараецца.




— А дзе кум-верабей? — Дома.
— А што ён робіць? — Хворы ляжыць.
— А што яму баліць? — Галоўка.
— Сходзі, кумка, ў агарод,
Выдзеры маркоўку, папар яму галоўку.

Прыпеў: — Парыла я, кумушка, парыла, галубушка,
Пар яго не бярэ, толькі к сэрцу прыстае!

— А дзе кум-верабей? — Дома.
— А што ён робіць? — Хворы ляжыць.
— А што яму баліць? — Ручкі.
— Схадзі, кумка, ў агарод,
Вырві кусцік бручкі, папар яму ручкі.

Прыпеў.

— А дзе кум-верабей? — Дома.
— А што ён робіць? — Хворы ляжыць.
— А што яму баліць? — Бачочак.
— Схадзі, кумка, ў агарод,
Выдзерні мачочак, напар яму бачочак.

Прыпеў.

— А дзе кум-верабей? — Дома.
— А што ён робіць? — Хворы ляжыць.
— А што яму баліць? — Пяткі.
— Схадзі, кумка, ў агарод,
Вырві кусцік мяткі, папар яму пяткі.

Прыпеў.

*Заходзяць пераапранутыя «цыганка», «урач», «афіцэр», уносяць сваю «кашу»: гарбуз — «урач», ката — «цыганка», капусту — «афіцэр».*

**Афіцэр.** Мая каша з-за граніцы, выкупляй, кум, не скупісь.

**Урач.** Купі лепш у мяне, мая хоць і не заморская, але ж у ёй вітамінаў многа.

**Цыганка.** Не слухай іх, куманёк, не паскупісь на маю кашу. Мая каша ўсім кашам нарасхват. Як толькі яе паспытаеш, адразу ўсімі чарамі авалодаеш. Ты толькі паглядзі.

**Баба** (*уносіць закручаную кашу*).

Я к унуку збіралася,
Цэлы тыдзень гатавалася,
У панядзелак у млын ездзіла,
А ў аўторак з млына прывезла,
А ў сераду муку сеяла,
А ў чацвер цеста ўчыняла,
А ў пятніцу мясіла,
А ў суботу ў печ садзіла,
А ў нядзелю з печы выняла
Ды да ўнука прыйшла,
Піражок прынясла.

*Баба ставіць кашу на стол, але яе выкрадаюць дзеці.*

**1-ы госць.** Лавіце, лавіце малых зладзеяў!

**2-і госць.** Трэба выкупіць бабіну кашу, бо малыя пакрыўдзяцца, ды каб нашага Іваньку ў крапіву не саджалі.

**3-і госць.** Нясі, Маня, хрушчыкаў і грошай трохі.

*Дзеці аддаюць кашу, яе зноў бабка ставіць на стол. Паміж бабкай і кумам разыгрываецца «шпіктакль».*

**Кум.** Адкуль прыйшла?

**Бабка.** Пусціце нанач.

**Кум.** Вашы дакументы.

**Бабка** (*працягвае палатно — дакументы, становіцца на лаву, абгортваецца ім*). Вось мае дакументы.

**Кум** (*бярэ, чытае, пытаецца*). Пусціць старуху нанач?

**Усе госці.** Раз дакументы харошыя, пусціць нанач. Старуха харошая.

*Бабка садзіцца за стол.*

**Кум** (*няўдала кідаючы гаршчок*). Ой, баба, які гаршчок крэпкі ў ганчара выбрала. Б'ю, б'ю, ніяк разбіць не магу.

**Бабка.** Ну, кумок, у другі раз як пайду, дык не буду браць такога крэпкага. Ужо прыстаўлю дзіравы, абы кашу зварыць.

**Кум** (*б'е ціхенька 2 разы*). Ой, баба, ці не жалезны твой гаршчок? Ніяк не разаб'еш.

**Бабка.** Ну-тка, бі, бі! Відна, кумок, мала еў.

**Кум** (*за трэцім разам разбівае гаршчок і спрабуе кашу*). Вой, якая смачная каша (*прыцмоквае*).

**Бабка.** Да гэтага вы, дарагія госцікі, пілі, елі бясплатна, без грошай, а цяпер кашу будзе есці той, хто адкупіць яе!

Я баба Ярохава,
Мая каша гарохава,
У маёй кашы бублікі,
А вы, мужчынкі, кладзіце па рубліку.

**Кум.** Прашу адведаць кашу, бабку пацешыць, унучка паславіць, маці з бацькам паздравіць.

**Госці** (*падыходзяць па чарзе*).

— Дару гузік, каб праз год у хаце быў яшчэ адзін карапузік.

— Каб на яго долю паслаў Бог усяго ўволю.

— Каб ваш сынок вялікім рос ды вяселлем трос.

— Гадуй, Надзейка, малое, ды каб на той год было другое.

— Каб у вашым дамочку, у вашым хлявочку, у вашым садочку ўсё радзіла ды пладзіла.

— Каб у вашага дзіцяці ў клеці было мяшкамі, а на стале — пірагамі.

— Вой, дык нешта каша зусім нясмачная, горкая.

**Бабка.** Пацалуй сваю жонку — будзе салодкая або памачы язык у соль — будзе салёная.

**1-ы госць.** Ну вось, кашу паспрабавалі. Цяпер і заспяваць можна.

*Гучыць песня.*




Цераз гай, цераз гай, цераз Бандароўку
Вёз, вёз стары дзед маладую жонку*.

Вёз, вёз, не давёз ды стаў яе біці,
Пытаецца ў людзей, ці ўмее рабіці.

— А ні рабіць, ні прыбраць, жаці не сагнецца,
Як убачыць кавалера — мала не спражэцца.

А пацерак поўна шыя, а каўнера не зашые,
А рубчыка не зарубіць — кавалераў добра любіць.

А ты, стары, барадаты, бараду валочыш,
А сам, стары, небарака, маладую хочаш.

**Парадзіха.** Дзякую, бабка, дзякую вам, кумы мае, за такую прыхільнасць да майго дзіцяці. (*Цалуецца па 3 разы, адорвае іх.*) Выбачай, бабка, выбачай, любка, можа, не ўгадзіла. Кроіла падарунак пры лучыне, можа, укараціла.

**Бабка** (*надзявае намітку на галаву, перакручваецца на месцы 3 разы, а затым падскоквае 3 разы ўверх*). Каб мой унук вялікі рос, шчаслівым быў, каб на яго долю паслаў Бог усяго ўволю. (*Капрызнічае.*) Але ж нешта ў цябе, унук, хата цесная, і паскакаць мне няма дзе.

**2-і госць.** Ці ёсць у цябе, гаспадар, коні, каб пакатаць нашу княгінюбабку?

**Гаспадар.** І коні ёсць, і карэта, пайду запрагаць.

**3-і госць.** Бабка-княгіня, паедзем у карчму, там і паскачам.

---

* Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

*Двое мужчын бяруць бабку за рукі і садзяць у ночвы, падтрымліваючы яе, каб не саскочыла. Некалькі чалавек цягнуць бабку ў «карчму» — пачаставацца ў бабкі дома.*

*Гучыць песня.*




Запражыця, запражыця
Да дзвенаццаць валоў*,

Адвязіця, адвязіця
Да бабульку дамоў.

Наша бабулька, наша рабулька
Да паязды любіць.

Завязіця ў карчомачку,
Кварту гарэлкі купіць.

Запражыця, запражыця
Да дзвенаццаць валоў.

Адвязіця, адвязіця
Нашу кумку дамоў.

Наша кумка, наша галубка
Да паязды любіць.

Завязіця ў карчомачку,
Кварту гарэлкі купіць.

Запражыця, запражыця
Да дзвенаццаць валоў.

Адвязіця, адвязіця
Да кумочка дамоў.

Наш кумочак, наш галубочак
Да паязды любіць.

Завязіця ў карчомачку,
Кварту гарэлкі купіць.

**Госці** (*збіраюцца дамоў, даюць наказы*).

— Каб Іванька не быў злы, не біце яго нават смехам.

— Не паказвайце да года ў люстэрка, зубы будуць ісці балюча.

— Да года не стрыжыце, каб не жыў Іванька ў беднасці, каб памяць добрую меў.

— Не бярыце задам, каб не рос Іванька ўпартым.

**Усе госці.** Усяго добрага вам. Каб жылося і каб вялося.

---

* Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

## «А вяселейка, а вяселейка едзе з песняй да сяла»

**Вядучы.** Хай на скрыпках, цымбалах музыкі зайграюць,
А чароўныя гукі хай гасцей нам збіраюць,
Хай дзяўчаткі-кабеткі звонка песні спяваюць,
На зямлі ўздзенскай зноў вяселле спраўляюць.
Так гулялі раней, хай жа вернецца зноў!
Паспяшайцеся, госці! Уздымаем заслону!

*Беларуская хата. У хаце маці, дачка, хросная маці. Заходзяць дзяўчаты.*

**Маці.** Добры дзень, любыя. Заходзьце, калі ласка. Дзякуй вам, даражэнькія, што прыйшлі. Ну, дачушка, трэба да шлюбу збірацца. Хутка жаніх прыедзе.

*Гучыць песня.*




Суборная суботачка настала*.
Наша Манечка ўсіх дзевачак сабрала.
А сабраўшы, у радок саджала.
Сама села, усіх дзевачак пасадзіла,
Скланіла яна галовачку найніжэй,
Сваёй мамачцы, сваёй родненькай найніжэй,
Бо яна ў яе за ўсю радзінку наймілей.

---

* Кожны радок паўтараецца 2 разы.

**Дзяўчаты.** Ляцелі гусачкі цераз сад,
Махнулі крыльцамі на ўвесь лад.
Пара табе, Марысечка, на пасад.

**Дзяўчына** (*да Марылі*).
Ці ёсць у цябе, Марысечка, родны брат?
Хто ж цябе завядзе на пасад?
На шчасліvenькае месцечка,
На залатое крэслічка?

*Гучыць песня.*




Яснае сонца калясом ідзе раненько!
Да брат сястру на пасад вядзе раненько!
Ён яе вядзе ды спыняе раненько!
Да брат сястру праўду пытае раненько:
— Ды хто ж табе наймілей, найлюбей, раненько?
— Род, брацейко, наймілей, найлюбей, раненько!

*У час песні маладая падыходзіць да бацькі, маці, хросных. Цалуецца. Да Марылькі падыходзіць брат.*

**Нявеста.** Братка, я ўся дрыжу.
**Брат.** Ты ж ідзеш не за мядзведзя.
Лепш садзіся на дзяжу (*дзяжа накрыта кажухом*).
Садзіся, сястрычка, на мяккую воўну,
Хай будзе і шчасця і радасці поўна.

*Гучыць песня.*






Наша Манечка на пасад ідзець,
Мамачка валоскі стрыжэць.
Стрыжы валоскі, стрыжы
Памалу, галоўкі не спалі.

**Нявеста.** Дзевачкі-сястрыцы, перапёлачкі,
Бярыце шчотачкі, грабеньчыкі,
Счашыце золатца мне з галовачкі.
Золатца асыпаецца,
Бо мая красата ўся мінаецца.

*Дзяўчаты выносяць столік з прыладамі: шчоткі, грабяні, заколкі; па чарзе расчэсваюць і заплятаюць валасы, надзяваюць вянок.*

**Хросная.** Цяжка з хатай развітацца,
З бацькам, маці і з сябрамі.
Трэба ж з сіламі сабрацца,
Бо жаніх не за гарамі.
Едзе, едзе ён, каханы,
Едзе, едзе, паспяшае.
Ён даўно зачараваны,
І яна даўно чакае.

*Чуецца музыка, звіняць званочкі. З-за сцэны галасы: «Едуць! Едуць!» На сцэне з'яўляецца жаніх, яго дружына. Наперад выходзіць сват. Дзяўчаты выносяць стол. Маладую хаваюць.*

*Гучыць песня.*



Чаго ты, малойчык, прыехаў?
Мы табе дзевачкі не дадзім!
Мы табе дзевачкі не дадзім,
Мы тваёй паходкі паглядзім,
Мы табе ганьбачкі тры дадзім:
А першая ганьбачка — конь малы,
Другая ганьбачка — сам стары,
Трэцяя ганьбачка — п'яніца.

**Сват**. Прыехалі мы да вашага двару,
Шукалі дзявіцу-куніцу
Для нашага хлопчыка-малойчыка.
Нявеста нам вельмі трэба,
Але каб вочы сінія, як неба,
Каб ручанькі, як у лябёдушкі крылы,
Каб вясёлая была і спраўна рабіла.

**Сваццproperly.** Многа ты, сваточак, хочаш, вядома,
Але адкажу: ёсць у нас такая дома,
Ды дорага яна каштуе,
А мо, сват, і не пашкадуеш?

**Сват.** Ды прашу ў вас не бясплатна.
Вось наш жаніх, у яго розуму багата.
Падыдзі, Іван, пакажыся сватам,
Глядзіце — прыгажун, а які ў яго стан!
Каштуе жаніх немалыя грошы,
Ён рахманы, з нявестай будзе харошы.
Тавар на тавар абмяняем,
Яшчэ мёду збан зверху прыбаўляем.

*Гучыць песня.*



Як казалі, так і ёсць:
Вялікія вочы, доўгі нос,
Вялікія вочы, доўгі нос,
Бруха, як начоўкі, — чуць унёс.
Чаму, Манечка, не ўглядалась,
За чым жа ты пагналась?

**1-ая дзяўчына.** Наша Марылька — ягадка,
Ваш Іванька — калодка.

**2-ая дзяўчына.** Наша Марылька — мілы дзень,
Ваш Іванька — гнілы пень.

**3-яя дзяўчына.** Казалі, Іванька вельмі харош,
А ў яго ж доўгі нос.

**4-ая дзяўчына.** Рыжыя бровы, як у каровы,
Рыжыя вусы, як у лісы,
А нажышча, як качаржышча.

**Усе разам.** Не аддадзім Марыльку!

**Хлопцы.** Ды што ж нам зрабіць, каб Марыльку забраць?

**1-ая дзяўчына.** А ў баярына з кішэні пірог точыцца,
І нам яго хочацца.
Калі нам яго не дасі, то і сам не з'ясі.
Сабачкі цябе пераймуць,
З кішэняй пірог адарвуць.

**2-ая дзяўчына.** Ты ж, маладзенькі Іванька,
Ці любіш нашу Марыльку?
Калі любіш — дык дары пірог,
А не любіш — дык дзяры за парог.

**Дружок маладога.** Дам вам за Марыльку сена вязанку
І яшчэ ў прыдатку бобу лапатку,
Медзі ў ручку, рабую сучку.

**Дзяўчына.** Давай, дружка, паболей медзі ў ручку
І пакінь сабе сваю сучку.

*Дружкі перадаюць дзяўчыне вялікі пірог, бутэльку і сыплюць цукеркі, абаранкі, грошы. Сват выводзіць маладую за ручнік.*

**Сват.** Дом гасцінны, пір гарой,
Музы́кі цешаць гасцей ігрой.
Панове музы́кі, прашу не іграць —
Будзем мы Марыльку благаслаўляць.
Дай Божа ў добры час пачаць,
А ў злы памаўчаць.
Родныя бацька і маці, станьце на пастаці,
Дайце рады свайму дзіцяці ды шлюб прыняці,
Век векаваці, гора не знаці,
Дабро нажываці ў добрым здароўі,
Вясёлым жыцці, сабе на радасць, людзям на ўцеху.

**Дзяўчаты**. Карыся, дзяўчына, карыся,
Старому, малому кланіся,
Старому, малому да ножак,
Бацьку, маці да слёзак.

**Бацька** (*благаслаўляе Марыльку і Івана хлебам-соллю).*
Дару вам хлебам і соллю, шчасцем і доляй
У добрым здароўі на ўвесь век доўгі.

**Усе прысутныя**. У добры час! У добрую гадзіну! На доўгі век! На Марыльчына шчасце!

*Маладых абводзяць тры разы па ўсёй сцэне, абсыпаючы іх жытам.*

**Бацька**. Благаслаўляю вас, дзеткі, на ўсё добрае, а на благое самі навучыцеся.

**1-ы госць**. Горка рэдзька, ды ядуць,
Дрэнна замужам, ды ідуць.

**2-і госць**. Жні пшанічаньку празеляненькую, аддавай дзеўку маладзенькую.

**3-і госць**. Замуж не калі хочаш, скачаш, а ідзеш, калі бяруць.

**4-ы госць**. Жонку трэба браць не ў золаце, а ў розуме.

**5-ы госць**. Дачку аддаваць, ночкі не спаць, а плакаць, гадаць.

**6-ы госць**. Жонку бяры не на год, а на век.

**7-ы госць**. Жаніся, каб дурні не зваліся.

**8-ы госць**. Няхай сабе мужык, як шкарпэтка, абы я была, як кветка.

**9-ы госць**. Хоць бы муж быў, як лапаць, абы мне не плакаць.

**Сват.** Мір вясёлы, дом асвятлёны! Браты-сястрыцы, красныя дзявіцы, добрыя маладзіцы! Госцейкі сабраныя, сазваныя, дальнія, бліжнія! Просім вашага дазволу — пад высокім вянцом, пад бацькоўскім крылом, за новымі сталамі — нашых маладых прывітаць, шчасця, долі пажадаць.

**Усе.** Вітаем, вітаем, шчасця, долі жадаем!

*Усе садзяцца за стол.*

**Сват.** Сем гадоў пацеў, гэтую свадзьбу хацеў.
Сем год на печы валяўся, на гэтую свадзьбу спадзяваўся.
Пакуль за стол залез, дык увесь аблез.
Бабы лён трапалі, кастрыцы ў рот папалі,
Дайце квасцу піці, у роце памачыці.

*Гучыць песня.*



Прыйшоў на вяселле наш сваток,
Павязаўшы крыжам ручнічок…
Нам казалі, сват наш вельмі харош,
А у свата доўгі, буслаў нос.
А у свата лыса галава
Ды казліна рыжа барада.
Плавае па хаце, як таран,
Лыпае вачамі, як баран.
Барадою сватка патрасе,
Маладзіцам чарку паднясе.
— Калі, сват, гарэлкі не дасі,
Караваю трасцу ты з'ясі.

**Адзін з гасцей.** Мілыя ягамосці, ці не пара нам размяць косці?
**2-і госць.** Правільна, правільна, давайце паскачам.

*Танцуюць кадрыль, польку, лявоніху.*

**Госця**. Свацейка з Арэхава нядаўна прыехала.
Зараз будзе частушкі пець,
Нам на месцы не ўсядзець.

*Удзельнікі спяваюць частушкі.*

Мяне сваты сваталі,
Сваталі багатыя.
Кажуць, што скаціны многа:
Два каты махнатыя.

Ох ты, мацць, мая мацць,
Нашто мяне жэніш?
Аддадуць мяне ў салдаты,
Куды жонку дзенеш?

Мяне маменька будзіла,
Не будзіла — плакала:
— Уставай, маё дзіцятка,
Ты ужо засватана.

Каля рэчкі я хадзіла,
Дзе шумеў зялёны гай.
Я Міколу палюбіла,
Ды не знала, што гультай.

Ды чаму ж мы ўсе танцуем,
Ды чаму ж мы ўсе пяём?
А таму, што Ваню жэнім,
Марыльку замуж аддаём.

Ой, танцуйце, чаравічкі,
Вам не доўга танцаваць:
Замуж выйду, бабай буду —
Вам пад лавачкай стаяць.

Не ідзіце, дзеўкі, замуж,
Замужам нядобра жыць:
Адна дзеўка выйшла замуж
І штодзень дамоў бяжыць.

Мяне мама нарадзіла,
Чорным шоўкам спавіла.
Ручак, ножак не сціскала,
Каб танцорачка была.

Няхай мышы пражу трубяць,
Няхай хлопцы мяне любяць.
Мышы пражу патрубілі,
Мяне хлопцы палюбілі.

Баляць ручкі, баляць ножкі,
Баліць сэрца й галава.
Каб мілога не любіла —
Здаравёшанька б была.

**Адзін з гасцей.** Бацька, маці, благаславіце каравай несці!

**Бацькі.** Бог благаславіць!

**Госць.** Ці дазволіце каравай у камору схаваці ці на людзі раздаці?

**Маці.** На стол падаваці, людзям раздаваці!

*Госці пяюць.*




Нясу, нясу каравай з клеці*,
Сядзь сабе ды на покуці.

Нясу, нясу каравай з клеці,
На харошанькім месцы.

Нясу, нясу каравай з клеці,
Дай, Божанька, маладым жыці.

**Сваццця.** У нашай маладой ёсць багаты вясельны каравай. Што ў гэтым караваі — ужо і сама не знаю: сямі палёў пшаніца, сямі крыніц вадзіца, дзесяці кароў масла ды яек паўтараста. Сама сеяла, сама пякла, сама гасцей гукала, каб каравай паспыталі, шчасця, долі пажадалі.

**Сват.** Ёсць у нашай маладой бацька, маці, што начэй не спалі, дачку гадавалі, дабру навучалі. Мы іх і вітаем, караваем надзяляем.

**Бацькі.** Даруем вам павагі, каб не было і нам знявагі.

**Брат.** Дарую сад, у садзе грушы і слівы, каб вы заўжды былі здаровы і шчаслівы!

**Сват.** А цяпер станавіся, радзіна, у адзін рад ды дары Марылечку хто чым багат! А хто не падорыць, у таго воўк свінню зловіць.

*Да маладых падыходзяць дружкі.*

**Дружкі.**

— Дарую бульбу ў падоле, каб было ў дзяцей застолле.

— Дарую гектар грэчкі, каб вяліся авечкі.

— Дарую лес, а ў лесе дубкоў. Колькі ў лесе дубкоў, каб столькі ў вас было сынкоў.

— Дарую стог жыта, каб не была ніколі біта.

---

* Першы радок кожнай страфы паўтараецца 2 разы.

— Дарую стакан суніц, каб не хадзіў да другіх маладзіц.

— Дарую мяшок медзі, каб дзеці былі як мядзведзі.

— Дарую мяшок гліны, каб праз год былі радзіны.

— Дарую падарунак на чатыры канты, каб было чатыры сыны, і ўсе музыканты.

— Дарую дугой, каб малады не бегаў да другой.

*Свякроў здымае з нявесты вянок. Гучыць песня.*




Ой, знаці, знаці, што чужая маці  
Ні хоча прыняці чужога дзіцяці.  
Ні хоча прыняці чужога дзіцяці,  
Павярнула кажушок — хоча адпужаці.  
— Я ж цябе, мая мамка, я ж цябе не баюся  
Ды нізенька ў ножкі табе пакланюся.

**Маці маладой**. Благаслаўляем вас, дзеці, на шчаслівую долю  
Разам з лясамі, лугамі і полем.  
Разам з уздзенскай роднай старонкай,  
Хай зашчабечуць унукі нам звонка.  
Але старых нас не забывайце,  
Хоць на хвілінку да нас забягайце.

*Гучыць песня «Бывайце здаровы» (гл. Дадатак).*



# ПАЗНАВАЛЬНА-ЗАБАЎЛЯЛЬНЫЯ ПРАГРАМЫ

З чаго пачынаць далучэнне школьнікаў да багатай этнакультурнай спадчыны нашага народа? Як развіваць цікаўнасць у нашай моладзі да беларускага, роднага, свайго?

Вопыт паказвае, што трапны жарт, вясёлая народная песня, добры беларускі танец, казкі, загадкі, прыказкі і прымаўкі, багаты гульнявы фальклор запальваюць у сэрцы дзіцяці агеньчык зацікаўленасці, выклікаюць імкненне глыбей зазірнуць у таямніцы першапазнанага. Таму пры складанні сцэнарыяў такіх святаў педагогу варта паклапаціцца не толькі пра эмацыянальнае, але і пра пазнавальнае ўздзеянне на дзяцей.

На нашу думку, такая форма выхаваўчай работы ў цесным адзінстве з руплівай працай настаўніка на ўроку павінна паспрыяць фарміраванню ў вучняў адчування беларускасці, далучанасці да духоўных каранёў сваіх продкаў.

## На кірмашы

*Методыка падрыхтоўкі*

Для таго каб свята стала сапраўды агульнашкольным, трэба даць кожнаму класу пэўнае заданне: падрыхтаваць касцюмы дзеючых асоб, намаляваць яркія вывескі, выпусціць свае школьныя «грошы», арганізаваць конкурс на лепшую цацку, кампазіцыю з садавіны і агародніны, падрыхтаваць прызы для бяспройгрышнай сельскагаспадарчай латарэі.

Свята мэтазгодна праводзіць у канцы кастрычніка. Да гэтага часу завершаны работы ў полі, на агародзе, таму і бацькі могуць стаць на кірмашы актыўнымі ўдзельнікамі.

У сучасных вучняў сфарміравана ўяўленне пра кірмаш як месца, дзе можна нешта купіць ці прадаць, таму важна паказаць, што раней на кірмашы можна было не толькі зрабіць пакупку, але і цікава, весела правесці вольны час.

### *Методыка правядзення*

*З'яўляюцца зазывалы з барабанамі.*

**1-ы зазывала.** Гэй, добрыя людзі!
Паглядзіце, што будзе!

**2-і зазывала.** На забавы спяшайцеся!
Ды не вельмі штурхайцеся!

**1-ы зазывала.** На кірмаш спяшайся,
Грошай набірайся!
Знойдзеш рэчы для патрэбы —
Не шкадуй, бяры хутчэй,
Заўтра будзе даражэй!

**2-і зазывала.** Не проста спяшайся, прыгажэй апранайся,
Калі хлопец нежанаты,
Прыглядзіш дзяўчыну ў сваты.
Калі дзеўка малада, пакажы сябе спаўна.
Будуць гумар і пацехі,
Гульні розныя на ўцехі,
Песні, казкі, карагоды — не ўтрымаеш свае ногі!

**1-ы гандляр.** Добрае піва, усім на дзіва!

**2-і гандляр.** Хто хоча мёду, мёду на выгоду?

**3-і гандляр.** Гузікі, пацеркі, стужкі!
Купляйце, дзяўчаты-падружкі!

**4-ы гандляр.** Кашулі, спадніцы, ручнікі вышываныя!

**5-ы гандляр.** Салодкія цукеркі — ласунак для каханкі!
Свежыя куханы, гарачыя абаранкі!

**6-ы гандляр.** Прыгожыя хусткі, хусткі для кабетак!
Лялькі, свісцёлкі, цацкі для дзетак!

*На пляцоўку выходзяць дзве жанчыны, у руках у іх кошыкі з аднолькавымі таварамі. Яны распачынаюць гандаль, перабіваючы адна адну.*

**Ганна.** Глякі, глякі! Купляйце, калі ласка, глякі!

**Насця.** Купляйце і ў мяне глякі, цудоўныя глякі!

**Ганна.** Абаранкі, абаранкі! Купляйце смачныя абаранкі!

**Насця.** Купляйце лепш у мяне абаранкі!

**Ганна.** Яйкі! Яйкі! Купляйце яйкі свежыя, толькі з-пад курыцы.

**Насця.** Што з табою, баба, стала? Ці то ад круп, ці то ад сала? Міленькая мая, даражэнькая, я ўвесь час на гэтай плошчы гандлявала.

**Ганна.** Цікава! А я ўчора тут стаяла, кума з Турцыі чакала і цябе не бачыла.

**Насця.** Глякі! Глякі! Купляйце глякі!

**Ганна.** Купляйце ў мяне глякі, мае лепшыя.

**Насця.** Яйкі, яйкі, крэпкія яйкі з тоўстым шкарлупіннем, двухжаўтковыя!

**Ганна.** Не, я так жартаваць не згодна, з гэтым трэба нешта зрабіць.

**Насця.** Давай так, мая галубка. Калі лепшы тавар твой, то заставайся тут і стой. Калі мой, то выбачай, другое месца пашукай, згодна?

*Гучыць музыка, жанчыны рыхтуюць свае тавары, дастаюць з кошыкаў аднолькавыя ручнікі і паказваюць іх гледачам.*

**Ганна.** Вось мой ручнік лепшы за твой.

**Насця.** Дзе ж твой лепшы? Мой лепшы, усе бачаць.

**Ганна.** Усё роўна мой. Людцы добрыя, адкажыце, у каго ўсё ж лепшы?

*Прысутныя адказваюць.*

**Насця.** Не чуваць нікога, не зразумелі.

**Ганна.** Давай так зробім: вось гэтая палова твая, а гэтая палова кірмашу мая. Чыя палова гучней крыкне, той тавар і лепшы. Я першая, мая палова, што ёсць моцы крычым беларускае слова «кросны».

**Насця.** Ну, зараз наша чарга. Мая палова, не падвядзі, што ёсць моцы крычым наша беларускае слова «чаўнок».

**Ганна.** Ну што, мае грамчэй крычалі, таму мой тавар лепшы.

*У гэты час прысутным раздаюцца абаранкі.*

**Насця.** Чаму твой? Ну і дасадлівая баба папалася. Людцы добрыя, дапамажыце нам гэтую спрэчку вырашыць. Падыдзіце, калі ласка, у каго мае абаранкі, да мяне.

**Ганна.** А да мяне падыдзіце, у каго мае абаранкі.

**Насця.** Станьце, калі ласка, парамі. Хлопец з дзяўчынаю, мужчына з жанчынаю.

*Становяцца парамі.*

**Ганна.** Вось гэта мой ручнік, і я яго даю свойму гурту.

**Насця.** А гэта мой гурт, таму прыміце мой ручнік. Станьце пара за парай.

*Праводзіцца гульня «Ручнік». Гульню можна імправізаваць па-свойму.*

**Ганна.** Ну, малайцы, мае першыя справіліся, таму мой ручнік і лепшы.

**Насця.** А мае спазніліся, таму што на мой прыгожы ручнік загледзеліся, усё роўна ён лепшы.

**Ганна.** Ну, няхай сабе твой ручнік і лепшы, але ў цябе такога тавару няма, як у мяне. (*Дастае лялькў ў беларускім адзенні.*)

**Насця.** Не разыходзьцеся, даражэнькія, усё-такі вызначыць трэба, чый тавар лепшы. Станьце, калі ласка, у круг парамі, а каму не хапіла партнёркі, станьце ў сярэдзіну круга. Той, хто ў крузе, танцуе з лялькай.

*Праводзіцца танец-гульня.*

**Ганна.** Зараз танцуем парамі пад музыку. Калі музыка спыніцца, спадары павінны памяняць сваіх спадарынь. Каму не хопіць пары, танцуе з лялькай.

**Насця.** За тое, што вы так добра ўмееце скакаць, трэба вам усім падарункі даць. (*Раздае падарункі.*)

**Ганна.** У мяне ёсць такі тавар, што ўсім таварам тавар.

**Насця.** Цікава, а што ж гэта такое?

**Ганна.** А гэта такі тавар, за яго нават валютаю плацяць. А атрымае яго самы смелы хлопец.

**Насця.** А ці ёсць такія?

*Выбіраецца хлапчук і некалькі памочнікаў, якія расцягваюць доўгія паясы, трымаючы на ўзроўні прыкладна 60 см.*

**Ганна.** Каб атрымаць цудоўны тавар, трэба прайсці вось праз гэтыя перашкоды з закрытымі вачыма, не дакрануўшыся да паясоў. (*Да хлапчука.*) На ўсякі выпадак пачакай, а то ў цябе можа не атрымацца, пакуль я не пашапчу.

Сем зім зімавала, мінавала,
Справіліся на дзеле.
Шыпцы-хлопцы, шанавалы-кашавалы,
Цыдзікі-гуляшкі.
Адкасніcь — адкалупніcь
Ад звычайнай часці, ад хрыбетнай косці.
Дунь, плюнь, устань, мой хадога,
Чорны чалавеча.

Усё, можаш ісці.

*Калі хлапчук пачынае ісці, памочнікі апускаюць паясы на зямлю. І толькі калі ён пройдзе ўвесь шлях, зноў падымаюць, аб чым ён не здагадваецца. Гульня-жарт «Перашкоды».*

**Насця** (*да Ганны*). Ну, дзе ж твой тавар, што ўсім таварам тавар?

**Ганна** (*звяртаецца да ўдзельнікаў гульні*). А вось вам і наш цудоўны глячок. Калі ласка, трымайце і квасок папівайце. (*Да прысутных.*) Ну што, мой тавар лепшы?

**Насця.** Не, я так болей спрачацца не магу. Лепш музыкантаў найму і музыку паслухаю.

**Ганна.** А я таксама найму.

**Насця.** Выйдзіце да мяне, хто ўмее іграць на музычных інструментах.

**Ганна.** А да мяне — хто зусім не ўмее іграць.

*Падыходзячым раздаюцца розныя музычныя і шумавыя інструменты: чыгункі, патэльні, пральная дошка і г.д.*

**Насця.** Вось на гэтых інструментах зараз і будзем іграць чароўную мелодыю. Але іграць будзем незвычайна. На каго я пакажу рукой, той павінен некалькі музычных фраз прайграць на сваім інструменце. Потым зноў іграем усе разам. Але сваё майстэрства павінен прадэманстраваць кожны па чарзе, на каго я пакажу. А каму не хапіла інструмента, той будзе называць сваё імя. Зразумела? Увага! Пачалі!

*Іграюць.*

**Ганна.** Як добра ігралі! Ну, Насця, добры ў цябе тавар, але ж мой лепшы.

**Насця.** Ой, Ганна, можа, ужо хопіць сварыцца, можа, раскажам усім усю праўду?

**Ганна.** А то праўда, бо дадому ўжо пара.

**Насця.** Людцы добрыя, гэта ж мы разыгралі вас троху. Гэта ж мая кума Ганна.

**Ганна.** А гэта мая кума Насця.

**Насця.** А разыгралі вас таму, каб трошачкі павесяліць ды прадаць свой тавар. Ну, нам пара дадому.

**Скамарохі.**

— Сюды! Сюды! Прадстаўленне пачынаецца! Усе запрашаюцца!

— Спыніся, падзівіся, да цудаў звярніся!

— І грошай не трэба — у апладысментах патрэба!

— А хто да гумару гожы, той не пашкадуе і грошай.

*З-за шырмы з розных бакоў выходзяць хлопец, пераапрануты ў дзяўчыну, і дзяўчына — у хлопца. «Хлопец» прыхарошваецца, завівае на палец чупрыну, чысціць аб штаны чаравікі. «Дзяўчына» глядзіцца ў люстэрка, папраўляе спадніцу. Потым бачаць адзін аднаго і сыходзяцца разам, спяваюць прыпеўкі.*

**«Дзяўчына».** Не дай Божа з такім лёсам —
Любіць хлопца з доўгім носам.
Каб яго пацалаваць,
Трэба нос адпілаваць.

**«Хлопец».** Мая мілка недалёка —
За канаваю жыве.
Захацела пакатацца,
Села ў рэшата — плыве.

**«Дзяўчына».** А на уздзенскім базары
Прадаюць мужчын вазамі.
Адна баба ўсіх любіла —
За капейку сем купіла.

**«Хлопец».** Запрагу я кошку ў дрожкі,
Кацянят у тарантас.
Павязу сваю сяброўку
Ўсім суседзям напаказ.

**«Дзяўчына».** Чаму, мілы, не прыйшоў?
Ці штаны ты не знайшоў?
Хоць бы дзедавы надзеў,
Дзед на печы б пасядзеў.

**1-ы зазывала.** А цяпер — хто хоча грошай зарабіць?

**2-і зазывала.** А для гэтага трэба ўмець хутка гаварыць.

*Выклікаюць чатырох чалавек, якія гавораць скорагаворкі.*

**1-ы зазывала.** Я гуляў адзін ля горкі
І збіраў скорагаворкі.
Ці не лепшая першая?

**1-ы вучань.** Прыляцелі госці, селі на памосце,
Сталі шчабятаці, просяць есці даці.
Вазьму ў сенцах сіта, вынесу ім жыта.

**Скамарох.** Неблагая, следам бяжыць другая.

**2-і вучань.** Мама-мышка сушыла шышкі,
А мышка-малышка мыла лыжкі.

**Скамарох.** Як да рэчкі дайшоў —
Раптам трэцюю знайшоў.

**3-і вучань.** Вось пацеха, дык пацеха!
Лось заходзіцца ад смеху:
Паглядзіце — для казы
Лапці воўк пляце з лазы.

**Скамарох.** Вось табе, Рыгорка, чацвёртая скорагаворка.

**4-ы вучань.** Скрып-скрып, скрып-скрып!
Снег ад холаду ахрып,
І ў яго, напэўна, грып.

*Уваходзіць Несцерка.*

**Несцерка.** Добры дзень, сябры-браточкі! Эге-ге! Колькі вас тут набралася, не раўнуючы, як дроў у лесе. Ой, перапрашаю, можа, каго абразіў, як кветачак у лесе. Як тут красна! Як тут ясна! Скажы, галубок, куды гэта я трапіў?

**Ганна.** Што ты, Несцерка, на нашым кірмашы жадаеш сабе купіць?

**Несцерка.** А вунь таго бычка, што бабка прадае *(падыходзіць да яе)*. Добры дзень, бабулечка!

**Насця.** Дзень добры, чалавеча. А чаго ж ты хочаш?

**Несцерка.** Вельмі спадабаўся мне твой бычок, вунь той, зграбненькі. Але ж прыгожанькі. Можа, прадасі?

**Насця.** А што ты з ім будзеш рабіць?

**Несцерка.** Як гэта што? Выгадую, падкармлю, а потым... (*Паказвае жэстам, што зарэжа.*)

**Насця.** Што-о? Ану, прэч адсюль! Бач, які знайшоўся? Рэзаць будзе! (*Замахваецца на яго.)*

**Несцерка.** Прабач мне! Я яго чыстаю вадзіцай буду паіць ды свежай траўкай карміць.

**Насця.** Свежай, кажаш, без нітратаў?

**Несцерка.** Ну, вядома ж! Прадай, га?

**Насця.** Усё роўна не прадам!

**Несцерка.** Ну чаму?

**Насця.** А таму! (*Паварочваецца спінаю.*)

**Несцерка.** Дзяўчаткі, каханенькія, родненькія! Дапамажыце, калі ласка, угаварыць бабку прадаць бычка.

*Інсцэніруецца песня «Прадай, бабанька, бычка».*

— Ой, да прадай, бабанька, бычка!
Ой, да прадай, бабанька, бычка!
Вось бычка, бычка, бычка.
Прадай, бабанька, бычка.
— Ну якога?
— Лысага.
— Ён у мяне лысы-лысы,

Ён памые лыжкі, місы.
Ён у мяне не благі,
Ён у мяне дарагі,
Яго не прадам.

— Ой, да прадай, бабанька, бычка!
Ой, да прадай, бабанька, бычка!
— А якога?
— Шэрага.
— Ён у мяне шэры-шэры,
Ён зачыніць вокны, дзверы,
Ён у мяне лысы-лысы,
Ён памые лыжкі, місы,
Ён у мяне не благі,
Ён у мяне дарагі,
Яго не прадам.

— Ой, да прадай, бабанька, бычка!
Ой, да прадай, бабанька, бычка!
Вось бычка, бычка, бычка.
Прадай, бабанька, бычка.
— Ну якога?
— Рабога.
— Ён у мяне ра́бы-ра́бы,
Ён мне робіць вілы, граблі,
Ён у мяне шэры-шэры,
Ён зачыніць вокны, дзверы,
Ён у мяне лысы-лысы,
Ён памые лыжкі, місы,
Ён у мяне дарагі,
Яго не прадам.

— Ой, да прадай, бабанька, бычка!
Ой, да прадай, бабанька, бычка!
— Ну якога?
— Бурага.
— Ён у мяне буры-буры,
Ён загоніць свінні, куры.
Ён у мяне шэры-шэры,
Ён зачыніць вокны, дзверы,
Ён у мяне лысы-лысы,
Ён памые лыжкі, місы,
Ён у мяне не благі,
Ён у мяне дарагі,
Вось які ў мяне бычок —
Пазалочаны бачок,
Яго не прадам.

**1-ы скамарох.** Назбіралася гасцей на свята
З усіх валасцей багата.
Усе мы іх шчыра вітаем
І плёну на сцэне жадаем.

**2-і скамарох.**
Завітала свята ў горад,
Усіх вас песнямі адорыць.
Песні сыплюцца, нібы зоры,
Сэрцу хочацца прасторы.

*Выходзіць група людзей з Аўцюкоў. Расказваюць анекдоты.*

### Працавітая

— Чаго ты ўсё ляжыш і ляжыш на печы, узяўся б за якую работу, гультай ты! — кажа Наталля на свайго мужа.

— А што ж табе шкодзіць, што я ляжу?

— Шкодзіць не шкодзіць, але ж калі ты нічога не робіш, дык і мне ападаюць рукі і рабіць не хочацца.

### Бацькавы штаны кароткія

— Чаму ты не арэш?

— Бо малы.

— А чаму штаны кароткія?

— Бо бацькавы.

### Разгаварыліся

Стары Клім быў глухаваты і чуў толькі тады, калі яму хто крычаў над самым вухам. Аднойчы капаў ён гліну. Падышоў да яго сусед і вітае:

— Дзень добры, Кліму.

Клім адказаў:

— Але, але, капаю гліну.

Сусед запытаў:

— Што ты, Клім, ужо аглух?

Клім:

— Сам капаю, а не ўдвух.

Сусед пытае:

— Ці даўно ты стаў недачуваць?

Клім:

— Пайду дадому начаваць.

І зноў сусед пытае:

— Ці не бачыў ты мае казы?

Клім:

— Накапаў ужо тры вазы.

Сусед пытае:

— Ці даўно ты стаў не чуць?

Клім:

— Бывай, сусед, здароў будзь.

## Дзяцей няма…

— Сведка, як ваша імя і прозвішча?

— Мікола Касаты.

— Колькі гадоў?

— Восемдзесят два.

— Дзеці ёсць?

— Нямашака.

— Сакратар, запішыце, што дзяцей няма. Ну, расказвайце, Касаты, што вам вядома ў гэтай справе.

— Іду я, значыцца, са сваім сынам Гаўрылам…

— Пачакайце, вы ж казалі, што ў вас дзяцей няма.

— Але, няма.

— Ну, кажыце далей.

— Іду я з сынам Гаўрылам праз поле…

— З сынам Гаўрылам? Вы ж кажаце, што ў вас дзяцей няма.

— Ну, няма.

— А Гаўрыла?

— Якое ж гэта дзіця? Яму ўжо пяцьдзесят гадоў стукнула.

## Разумны хлопец

— Чаго плачаш, Янук?

— Капейку згубіў.

— Вось табе дзве, толькі не плач.

Янук узяў дзве капейкі, схаваў ды зноў плача.

— Ды чаго ж ты плачаш?

— Як жа мне не плакаць? Калі б не згубіў той капейкі, дык меў бы ўжо тры.

## Пад старасць адгукнецца

Пачула маці, што Антон яе плача. Хлопчык быў ужо сямігодка, крамяненькі. Выскачыла на задвор'е і пытае:

— Чаго ты, сынок?

— Певень на нагу наступіў.

— То што ж за бяда, певень не конь, нагі табе не скалечыў.

— Ага, не скалечыў, а як пад старасць, то і гэта адгукнецца.

## Пашкадавалі

Бацька і дарослы сын былі вялікімі гультаямі. Неяк ляжаць яны і назіраюць, як маці носіць мяшкі з бульбай. Бацька і кажа:

— Не бяры, Алеся, многа, на плечы не закінеш.

А сын падбадзёрвае:

— Нічога, мама, бяры, я паддам.

### Разумныя сыны

Адзін бацька хваліўся сваімі сынамі:

— Разумееце, ну і сыны ў мяне! Такія разумныя! Калі адзін з іх скажа, што будзе дождж, а другі — добрае надвор'е, то абавязкова што-небудзь ды будзе.

### Суцешыў

У аўтобусе маладая жанчына дакарала падлетка, які не ўступіў месца старому.

— Нічога, не лайце хлапчука, — суцешыў дзядуля, — стане ён старым, таксама настаіцца.

### Цікавая

— Мамка, ці людзі ў зямлі родзяцца?

— Чаму так пытаешся, дзіцятка?

— Бо ўчора дзядзька Нупрэй пытаўся аб табе ў таты: «А дзе ж ты выкапаў такую бабу?»

### У школе

Вясковы настаўнік пытаецца ў малога вучня, як ён завецца. Той не ведае, як адказаць.

— Ну, як маці кліча твайго бацьку на вячэру? — спрабуе высветліць настаўнік.

— Сідару, хадзі есці!

— А як бацька матку?

— Марыля, крупнік давай.

— Ну, а як жа цябе?

—Мяне не трэба клікаць есці, я заўсёды першы пры місцы.

**Мужчына** (*з аўцюкоўцаў*). Людзечкі, калі мы ехалі да вас, каб вы ведалі, каго мы падабралі? Нашых суседзяў з Галасістай воласці. Яны столькі песень везлі да вас на кірмаш, што аж воз зламаўся. Сустракайце іх!

*Гучыць музыка. Выконваецца папуры беларускіх народных песень. Гучыць фанаграма цыганскай музыкі. На кірмаш едуць «цыганы».*

**Цыган.** Ось гэта кірмаш дык кірмаш! Злазьце, дзеўкі, прыехалі! Ідзіце пагадайце, трохі грошай з кішэняў павыцягайце.

**1-ая гандлярка.** Гэй, Раман, а што гэта ты прывёз на торг?

**Цыган.** Як што? Мяшок дабра! О! Глядзіце сюды, кабеты! Бяру сто рублёў за ўсё гэта!

*На возе ляжыць мяшок, у ім нешта варушыцца. «Цыганкі» рагочуць, штурхаюць мяшок.*

**2-ая гандлярка.** Братка ты мой! Відаць, там добры парсюк! Гэй, Раман, даю чырвонец!

**3-яя гандлярка.** Раман! Даю два чырвонцы! Мой мяшок, мой!

**Цыган.** Ану, дзеўкі, цягніце гэты вялікі мех на зямлю! Свой тавар я задарма вам аддам!

*Мех сцягваюць на зямлю, з яго выскаквае чорт і пачынае бегаць навокал. Усе ловяць чорта, смяюцца. Злавіўшы, прымушаюць яго скакаць. Затым чорт загадвае загадкі.*

**Чорт.** Усе кажуць: хітры як чорт. Вось і адгадайце мае хітрыя загадкі.

1. Які год цягнецца адзін дзень? (*Новы год.*)
2. Без чаго чалавек не можа жыць? (*Без імені.*)
3. Што бывае пасля сямі год? (*Восьмы.*)
4. З якіх варот Пётр Першы выязджаў на вайну? (*З адчыненых.*)
5. Што робіць дворнік, калі на яго галаве верабей сядзіць? (*Спіць.*)
6. Пералічыце пяць дзён па парадку, не называючы чыслаў і назваў дзён. (*Пазаўчора, учора, сёння, заўтра, паслязаўтра.)*
7. Дзве дачкі, дзве мацеры і бабка з унучкай. Колькі іх? (*Тры.*)
8. Які прадукт харчавання можна зварыць з соллю адзін кілаграм на адзін кілаграм, каб можна было есці? (*Яйкі.*)
9. Што ў першы дзень года пачынаецца, а ў апошні канчаецца? (*Каляндар.*)

**Зазывала.** Як на кірмашы заўжды,
Тут ёсць гандлёвыя рады.
Ай, што за тавар!
І той харошы, і гэты харошы.
Даставай хутчэй грошы.

*Ганна і Насця аб'яўляюць, якія працуюць крамы, выказваюць свае пажаданні ўдзельнікам кірмашу.*

Крамы. 1. «Крыштальная кропелька» (сокі—воды).
2. Кафэ «Яблычак» (яблыкі, бананы).
3. «Уздзенскі ласунак» (цукеркі, пячэнне, пернікі).
4. «Цуды з агарода» (падзелкі з агародніны).
5. «Цудоўная палітра» (партрэт за 3 хвіліны).
6. «Саломінка» (вырабы з саломкі).
7. «Эй, пракачу!» — за плату можна праехаць на кані.
8. Сельскагаспадарчая латарэя (бяспройгрышная).

*Дзеці разыходзяцца па крамках і за «грошы» набываюць розныя тавары.*

## У нас уваходзіны

### *Методыка падрыхтоўкі*

Важна не толькі паказаць школьнікам, як праводзіліся ўваходзіны, але і пазнаёміць іх з рытуальнымі дзеяннямі, павер'ямі, звязанымі з выбарам месца, матэрыялу для хаты, закладзінамі першага вянца зруба і г.д. Можна выпусціць рукапісную кнігу «Беларуская хата», у якой кожны клас аформіць сваю старонку («Выбіраем месца для будучай хаты», «Нарыхтоўка матэрыялу», «Мы — цесляры», «Упрыгожым нашу хату» і інш.).

Члены гурткоў рыхтуюць для гаспадароў новай хаты падарункі: саламяных павукоў, разныя дошчачкі, вышытыя сурвэткі і інш.

## *Методыка правядзення*

*Пасярод сцэны лаўка. На лаўцы сядзяць старыя: бабуля абірае бульбу, дзядуля праглядае газету. Убягае малая дзяўчынка, садзіцца на лаву.*

**Дзяўчынка.** Бабулечка, а куды гэта тата з мамай так прыгожа апранутыя паехалі?

**Бабуля.** То ж, дзетка, на ўваходзіны да цёткі Ганны падаліся.

**Дзед.** Добрую хату Сцяпан выстраіў. Ды і пару выбралі добрую, каб засяліцца: акурат зараз поўня.

**Бабуля.** Казалі, што яны ўсё чэсць чэсцю зрабілі: і ікону са свечкамі ўносілі, і пеўніка праз акно ўпусцілі. А ён і закукарэкаў. Добры знак. І бацюшку прывозілі, каб асвяціў новую хату.

**Дзед.** А ці помніш, старая, як мы засяляліся? Твая маці прыйшла, мёдам вуглы нам у хаце мазала, каб соладка жылося.

**Дзяўчынка.** А што матуля дарыць будзе цётцы Ганне?

**Бабуля.** Посцілку харасцвенную купіла. А раней дык усё саматканае дарылі, мэблю самаробную. Мой дзядзька, помніцца, лаву цудоўную на ўваходзіны прынёс.

**Дзед.** А ці помніш, бабка, колькі жывёлы нам на ўваходзіны прынеслі: і гусей, і цялушачку, і парасятак.

**Дзяўчынка** (*смяецца*). Ну і дзіўныя падарункі. А раскажыце яшчэ што цікавае пра тое, як хату будавалі.

**Дзед.** Ох, унучачка, нам на цэлы вечар успамінаў хопіць.

**Дзяўчынка** (*настойліва*). Раскажы, дзедка, раскажы. Нам жа, дзецям, цікава паслухаць.

**Дзед.** Ну, то слухай. Хату ніколі не будавалі на скрыжаванні дарог, бо такое месца называлі «чортавымі шляхамі». Непрымальным для жылля, бо лічылася прыстанішчам ведзьмаў, было і месца, дзе раней стаяла лазня. Праклятым называлася месца, на якім адбылося забойства ці знайшлі чалавечыя косці.

**Бабуля.** Яшчэ некалі мой тата казаў: «Будуй хату на тым месцы, якое аблюбавала рагатая жывёла».

**Дзяўчынка.** А на якім месцы вы сабе хату стаўлялі?

**Бабуля.** Узяў стары гаршчочак з мёдам і паставіў на ноч на двары. Прыйшлі мы ранкам і ўбачылі: там мурашак-мурашак! Вось і сталі там будавацца.

**Дзяўчынка.** А калі б мурашак там не было?

**Бабуля.** То другое месца шукалі б.

**Дзед.** А яшчэ, унучачка, ніколі не будавалі хату з сухога дрэва. Лічылася, што ў хаце хвароба будзе — сухоты. Не бралі для будаўніцтва паваленыя бурай дрэвы, нахіленыя ці скручаныя. Бо ўсе яны на дрэннае варажылі.

**Бабуля.** А помніш, стары, як пры закладзіне першага вянка зруба пад кожны вугал закопвалі кавалачкі хлеба, сыру, грошы, купальскія зёлкі?

**Дзяўчынка.** А нашто так рабілі?

**Дзед.** Каб задобрыць дамавіка, добрых духаў.

**Бабуля.** А яшчэ, калі страха была гатова, гаспадар перакідваў цераз хату свянцонае яйка і закопваў яго там, дзе ўпала. Гэта было абярэгам ад няшчасных выпадкаў і стыхійных бедстваў.

**Дзяўчынка.** А я-то думаю, чаму гэта ў Мані з Петрыкам падчас урагану дах з хаты сарвала? Відаць, не кідаў Петрык яйка, каб хату засцерагчы.

**Бабуля.** Ах ты, мая вумніца-разумніца. Замарыў нас дзед сваімі байкамі. Ідзі лепш, стары, дроў прынясі, каб бульбу зварыць. А ты, унучка, пабяжы, парасяткам травы ўкінь. Ну а я пайду кароўку даіць.

*Разыходзяцца. На сцэне прыбраны пакой. Збоку стаіць куфар, на якім уссядае Сцяпан.*

**Сцяпан.** Ганна!

**Ганна** (*аднекуль*). Га-а!

**Сцяпан.** Ой, жонка, нешта ў нашай хаце горача.

**Ганна.** Дык, Сцяпанка, я ж тры дні ў печы паліла, пякла, варыла, смажыла. Сёння ж уваходзіны ў нас. З усёй вёскі моладзь, малыя дзеткі, старыя сыдуцца. Пачаставаць трэба смачна.

**Сцяпан.** Хадзі сюды.

**Ганна.** Чаго?

**Сцяпан.** Паглядзі, што я ад бабкі Магрэты прыцягнуў!

**Ганна.** Я табе прыцягну!

**Сцяпан** (*смяецца*). Ужо!.. Ідзі падзівіся...

*З'яўляецца гаспадыня з кашолкай у руках. Убачыла куфар, пакінула кашолку ля ўвахода, набліжаецца да Сцяпана.*

**Ганна.** Во дурань! Скрыню прывалок...

**Сцяпан.** Якая табе скрыня? То ж куфар! Антыкварыят.

**Ганна.** Навошта нам гэтая старэча, хутка імпартны гарнітур купім.

**Сцяпан.** Разбеглася... Ты яго яшчэ дастань... А тут прыгожа, зручна.

**Ганна** (*спахапіўшыся*). Вой! Галава мая дурная! Мне ж бегчы трэба! (*Кідаецца да кашолкі.*)

**Сцяпан.** Куды цябе нясе?

**Ганна** (*прыхарошваючыся*). Як гэта — куды? За абаранкамі, вядома.

**Сцяпан** (*здзіўлена*). Якія абаранкі?

**Ганна.** Уздзенскія. З макам. Смачныя.

**Сцяпан** (*узрушана*). Во, здурнела баба! Госці ўжо хутка ў двор будуць збірацца, а яна пяткі намыліла...

**Ганна** (*лагодна*). Які ж ты ў мяне, Сцёпачка, дурненькі! Чай ды абаранкі — сядзі хоць да ранку. Ну, я пабегла!

*Накіроўваецца да выхаду, прыхапіўшы кашолку. Сцяпан хоча яе затрымаць, але Ганна, адмахнуўшыся, выходзіць.*

**Сцяпан.** Во жонкі пайшлі! (*Аглядае хату.*) З чаго ж тут пачынаць? Да раніцы самому не ўправіцца... (*Да гледачоў.*) Людзі добрыя, суседачкі даражэнькія, дапамажыце, калі ласка.

*Выходзяць жанчыны на сцэну.*

Вось вам сурвэткі, ручнікі, дапамажыце мне. Але ж як іх вешаць, калі іх нібыта карова пажавала?! Во гаспадыня... Трэба прасаваць... Але ж у нас

яшчэ электрапраса няма (*паглядае ў бок куфэрка*). Ну, бабка Магрэта, дапамагай!

*Сцяпан адкрывае куфар, дастае качалкі, валкі і аддае ўсё жанчынам. Пакуль жанчыны прыбіраюць, Сцяпан прыносіць карзіну з кветкамі.*

**Сцяпан** (*да гледачоў*). Сёння мая Ганначка стане гаспадыняй нашай новай хаты. І ведаеце, хочацца, каб была яна незвычайна прыгожай і шчаслівай. Вось кветак назбіраў, вяночак хацеў ёй сплесці, ды не атрымалася. Дзяўчаткі, можа, вы дапаможаце? Вяночкі плесці ўмееце? Тады выходзьце, калі ласка, сюды. Ідзіце і спляціце вяночкі для сябе, а самы прыгожы — для маёй Ганусі, бо яна ўжо хутка вернецца. (*Да жанчын.*) Ці не змарыліся вы, суседачкі, а то прысядзьце, можа?

*Жанчыны садзяцца, у гэты час дзяўчаты танцуюць.*

**Сцяпан.** Дзякуй вам, дзяўчаты,
Добра пастараліся.
Мне вашы вяночкі вельмі спадабаліся.
Выбраў я найлепшы і прыгожы самы —
Падарункам будзе ён маёй каханай.

*Заходзяць дзве суседкі.*

**Агата.** Людцы мае родныя! Мужчынкі мілыя! Жоначкі прыгожыя! Як сёння ў вас тут хораша! Прывітанне вам! А я яшчэ ехаць не хацела. «Агатачка, — прасілі, — паедзь, ты ж такая добрая гаспадыня. І з выгляду, — казалі, — як артыстка з тэлевізара». Ну, думаю, паеду, хоць ад суседкі сваёй адпачну. Людцы мае, ну і суседачка ў мяне — чыстая шалпатня і малатарня. Вось паслухайце, было гэта...

*Уваходзіць Куліна.*

**Куліна.** Прывітанне вам, сябры!

**Агата.** А ты што тут робіш?

**Куліна.** Вось не ведаю, што ты тут робіш, а я асабіста на ўваходзіны да суседа прыйшла.

**Агата.** Ты — на ўваходзіны? З чартапалохам? Вунь, цэлы кошык прынесла.

**Куліна.** Сама ты чартапалох. А ты што прывезла? Пакажы людзям.

**Агата.** Гарбузы! Глянь, якія прыгожанькія, тоўсценькія, усе адзін у адзін.

**Куліна.** Ды якія ж гэта гарбузы? Гэта ж заморкі нейкія, а не гарбузы. Сама — во, а гарбузы — во! Гаспадыня знайшлася!

**Агата.** Гаспадыня не гаспадыня, але такога, як у цябе, няма. Не было чаго на ўваходзіны прывезці, пустазелля з агарода насушыла.

**Куліна.** Якое гэта пустазелле? Хіба ты не ведаеш, навошта чартапалох у хаце? Ведама ж, каб нячыстую сілу адганяць. Людцы добрыя, дапамажыце! Дайце мёду атруціцца, а гарэлачкі ўпіцца.

**Сцяпан** (*спыняе іх*). Хопіць сварыцца, заходзьце, калі ласка, у хату. А можа, жанчыны, пакуль мая Ганулька прыйдзе, вы паспяваеце якую песню?

*Жанчыны спяваюць «Чаму ж мне не пець...» (гл.* Дадатак*).*
*З'ўляецца Ганна.*

**Ганна** (*аднекуль*). Сцяпан, Сцёпачка!

**Сцяпан.** Во, управіліся да пары. Ужо і гаспадыня на двары.

**Ганна.** Ну, як ты тут? (*Ставіць кашолку з абаранкамі на лаву.*)

**Сцяпан.** Управіўся!

**Ганна** (*аглядаючыся*). Як гэта?

**Сцяпан.** Вось, палюбуйся, усё зрабіў, і ходнікі паслаў.

**Ганна** (*недаверліва*). Сам?

**Сцяпан** (*прызнаецца*). Суседачкі дапамаглі.

**Ганна** (*раўніва*). Суседачкі? (*Адвярнулася, каб схаваць крыўду. У гэты момант Сцяпан хуценька надзявае ёй вяночак на галаву.*) Ой, што гэта? (*Падбягае да люстэрка.*)

**Сцяпан.** Гэта табе, Ганначка.

**Ганна** (*расчулена*). Дзякуй, Сцёпачка!

***Сцяпан і Ганна ідуць да гасцей. Ганна вітаецца са сваімі суседкамі, сяброўкамі. Уваходзіць сусед.***

**Сусед.** Добры вечар! Зайшоў да вас, дзядзька, тытуню пазычыць...

**Ганна.** Ой, даражэнькі! Ды сёння ж свята вялікае! Хіба ў такі дзень хто пазычае? Тады ж увесь год будзеш пазычаць! Зайграй нам лепей што, а мы са Сцяпанам паспяваем.

***Сусед грае, а гаспадар з гаспадыняй спяваюць.***

Сядзіць голуб на галіне,
Салавей на ветцы.
З адной дзевачкай гуляю,
Другая на прыкметцы.

Як на рэчцы, на руч'ю
Цалаваў — не знаю ч'ю.
Думаў, у сукенцы новай,
Ажно гэта пень хваёвы.

Мой мілёнак не цялёнак,
Не карова, не бычок.
А надзене шэру шапку —
Ну, сапраўдны дурачок.

**Ганна.** Сядайце, музыканцікі, на лаву
Ды добра рабіце сваю справу.
Бо ў нас сёння госці цікавыя,
З усёй акругі сазваныя.

**Сцяпан.** З Мінска, што не далёка ад нас і не блізка!

**Ганна.** З Нёмана, дзе да добрых традыцый прывучаны.

**Сцяпан.** З Уздзенскага раёна, самага цёплага і зялёнага.

**Ганна і Сцяпан** (*разам*). Рады вас вітаць у нашай хаце.

**Ганна.** Госцейкі дарагія, раскажыце, як жывецца вам, як здароўе ваша, што дзе новага чуваць?

**1-ая жанчына.** Слухай, суседачка, а чаго твой мужык, калі п'е, вочы закрывае?

**2-ая жанчына.** Бо ён мне абяцаў, што на гэту гадасць болей глядзець не будзе. Але вось ты такая прыгожая і статная, а замуж за кульгавага пайшла.

**1-ая жанчына.** Нічога, ён жа кульгавы толькі тады, калі ходзіць.

**3-яя жанчына.** Слухай, сяброўка, а чаго ты сёння без свайго Хвядоса прыйшла? Мо ты яго на кірмашы прадала?

**4-ая жанчына.** Прадала. А нашто мне гэта завала ў хаце. Сенца кароўцы даўно накасіла, а кароўка ў мяне ладная, аж дзесяць літраў малака дае.

**3-яя жанчына.** Усяго дзесяць? А мая дык пятнаццаць!

**4-ая жанчына.** Дык мая раніцай дзесяць, а ў абед дваццаць.

**3-яя жанчына.** А мая дваццаць пяць.

**4-ая жанчына.** А чаго твая карова дваццаць пяць літраў дае?

**3-яя жанчына.** Як чаго — малака!

**4-ая жанчына.** А мая — дык смятаны!

**Сцяпан.** Суседачкі, вы нядаўна так прыгожа спявалі, можа, яшчэ паспяваеце?

**Жанчына.** Чаму ж не паспяваць.

*Гучыць песня «Як на рэчцы, на масце» (гл. Дадатак).*
*Уваходзіць Цярэшка з торбаю на плячах.*

**Цярэшка.** Ці дазволіце мне, паважаныя гаспадары, прысутнічаць на вашым святце?

**Гаспадары.** Калі ласка, запрашаем.

**Цярэшка.** Мой нос заўсёды чуе, дзе народ гуляе. Ды і прынёс я вам многа гумару, прыпевак. Усе будуць задаволены: і старыя, і малыя. І вы, паважаныя гаспадары.

**Ганна.** А гэта мы паглядзім, бо яшчэ такі чалавек не нарадзіўся, каб усяму свету прыгадзіўся.

**Сцяпан.** Годзе, годзе вам спрачацца, годзе, годзе гаварыць,
Трэба польку драбней маку пад гармонік задрабіць.

*Скачуць польку.*

**Цярэшка.** Дазвольце, браце, небыліцу сказаці.
Небыліцу, небываліцу.
Чаго не было, таго і не будзе. На павеці куры сена косяць.
І грабуць, і стагі кладуць. Усё гэта, браце, небыліца.
Быліца-небыліца. Чаго не было, таго і не будзе.
Пякла баба калачы ў халоднай пячы.
І якраз ляцеў камар і калачыкі пакраў.
Цераз вулачку ўцякаў, камізэлечку парваў.

**1-ая жанчына.** Ой, дзядзька Цярэшка, ды ці бачыў дзіва?
Была ў дзядзькі свіння ды на ліпе гняздо звіла.

**Цярэшка.** Ды на ліпе гняздо звіла?

**2-ая жанчына.** Ой, дзядзька Цярэшка, ды ці бачыў ты дзіва?
Была ў дзядзькі кабыла, яна люльку курыла,
Яна люльку курыла, на вячоркі хадзіла.

**Цярэшка.** На вячоркі хадзіла? Ды не можа быць!

**1-ая жанчына.** Жанчынкі, давайце паспяваем, павесялім гэту хату, каб нашым Ганначцы і Сцёпку жылося весела.

*Гучыць песня «Арэ прымак» (гл.* Дадатак*).*

**Ганна.** Сцёпачка, а ты ўсё зрабіў добра?

**Сцяпан.** Усё, любая, усё.

**Ганна** (*зачапіўшыся за ходнік*). А вось не ўсё — ходнікі не прытаптаныя!

**Сцяпан.** Не прытаптаныя — дык зараз прытопчам. Госцейкі дарагія, давайце паскачам трохі.

*Танцуюць «Падыспань».*

**Ганна.** Дзякуй вам, хлопцы і дзяўчаты,
Прыгажуня цяпер наша хата!
Хоць вы ходнікі крыху скруцілі,
Але ж да падлогі моцна прыбілі,
Таму і пірог заслужылі.

*Ганна падае пірог.*

**1-ая жанчына.** Раскажу я вам, людцы, што здарылася з маім мужам. Збіраліся гэта мы на вяселле. Адзяе ён новыя боты. «Не адзявай, — кажу, — бо згубіш». Не паслухаў, адзеў. А як вярталіся дадому, то ён п'яны і заснуў на дарозе. Нехта тыя боты і зняў. У гэты час ехаў чалавек на кані і гаворыць: «Прымі ногі з дарогі!» А мой дурань падняў галаву, глянуў на свае ногі і кажа: «Едзь смела, чалавек, гэта не мае ногі, бо мае былі ў новых ботах».

**2-ая жанчына.** А я раскажу вам, суседзі, якое гора здарылася ў маёй суседкі. Мае пяць дачок, ды ніводнага зяця. Хіба гэта не гора?

**3-яя жанчына.** Якое гэта гора? Вось у маёй суседкі гора. Мае адну дачку і пяць зяцёў. Ад кожнага зяця па дзіцяці, а ад апошняга так і двое.

**2-ая жанчына.** Хіба ж яны разам не жывуць?

**3-яя жанчына.** Ды дзе ты бачыла?

**2-ая жанчына.** Учора іду, а яны дровы пілуюць.

**3-яя жанчына.** Якія дровы? Гэта ж яны мэблю дзялілі!

**2-ая жанчына.** Вось якім чынам у нас цяпер мэблю дзеляць.

**Куліна.** А чаму ж, Агатачка, сёння ты нас нічым не пачаставала? Ты ж такая добрая гаспадыня.

**Агата.** Я такіх смачных пірагоў напякла. Прыгожыя атрымаліся, не наглядзецца. Паставіла на стол перад Хвядосам. Пайшла, а ён як запусціць мне імі ў плечы, дык што каменем, думала, пазваночнік зламае.

**Куліна.** Я ж ведала, што з цябе гаспадыня — што з мяне альпініст. Не хоча яна нас частаваць — і не трэба.

**3-яя жанчына.** Хопіць нам ужо байкі баяць, давайце лепш заспяваем.

*Гучыць песня «Хацела ж мяне маці...» (гл.* Дадатак*).*

**Мужчына.** Я вось загадкі загадаю вам, а вы адгадайце іх.
Адзін другога есць ды ў вочы ўглядаецца.

**Жанчына.** Можа, цмок які?

**Мужчына.** Не — гэта маці дзіця корміць. А вось другая.

Што зробіць жанчына з гаршком, перш чым пачне гатаваць абед?

**Жанчына.** Напэўна, зазірне ў яго?

**Мужчына.** Правільна. А вось яшчэ адна. Усім патрэбна, а ніхто не робіць сабе. (*Усе думаюць, паціскаюць плячамі.*) Гэта ж, жанчынкі, труна.

**Жанчына.** Ой, каб табе ліха.

*Сцяпан і Ганна частуюць гасцей пірагамі.*

**Ганна.** Ой, Сцяпан, пакуль мы пірагамі частавалі, нашы госці па добрай песні засумавалі. Музыканцікі! Такую песню зайграйце, каб мы яе ўсе падхапілі ды так заспявалі, каб усюды было чуваць, што ў гэтай хаце сёння свята вялікае.

*Гучыць песня «Ой, я жыта ды не сеяла» (гл.* Дадатак*).*

**Ганна.** Мужчыны, нешта вы засумавалі, можа, вы нам што паспяваеце ці раскажаце?

**Мужчына.** Паслухайце-ка, суседкі, байку:

Ту-ду-ду! Гу-ду-ду!
Сядзіць голуб на дубу,
Прылятае сініца,
Голубава сястрыца,
І пытае Васіля:
«Ці далёка да сяла?»
Васіль кажа: «Тры мілі».
Баба кажа: «Чатыры».
Вазьмі, Васіль, булаву,
Стукні бабу па лбу.
Няхай баба коціцца
І ў балоце топіцца.
А ў даліне гусі
Пайшлі да Марусі,
А ў Марусі ганкі —
Смаловыя лаўкі.
Як сеў — прыкіпеў
Ды дадому не паспеў.
Цяляты рыкнулі,
Сабакі брахнулі,
Поп з краваці
Малітву чытаці,
Пападдзя з грубы
Вышчарыла зубы,
Матушка з печы —
Пабіла спіну, плечы...

**Сцяпан.** Цікава, усё цікава. Але ж давайце яшчэ заспяваем.

*Гучыць песня «Ой, ляцелі гусі з броду» (гл.* Дадатак*).*

**Ганна.** Ой, як хораша разам спяваці, смяяцца,
Нам бы часцей так, сябры, збірацца.
Госці жаданыя ўсе ў гэтай хаце...
Я так наспявалася, што сёння буду спаць як пшаніцу прадаўшы.

**Мужчына.** Добра, што напомніла пра сон. Ужо, мабыць, позна, трэба ісці дадому і спаць класціся. Усім адпачываць трэба. Колькі ўжо можна весяліцца!

**Ганна.** Хай бы на развітанне праспявалі што-небудзь вясёлае.

*Гучыць песня «Гуляць дык гуляць» (гл.* Дадатак*).*

**Жанчына.** А на развітанне хочам пажадаць вам усяго добрага.

**Госці.**

— Каб у вашым дамочку, у вашым хлявочку, у вашым садочку ўсё радзіла і пладзіла.

— Каб у нашых суседзяў у клеці было мяшкамі, на стале пірагамі.

— Няхай будзе грэчка, абы не спрэчка.

— Жыць ды маладзець, багацець ды дабрэць.

— Каб у вас вяліся свінні, авечкі і вы жылі як чалавечкі.

— Здаровы бывайце, нас не забывайце. Каб у вас было ўвесь час на стале, у місцы і ў калысцы.

— Жадаем вам долі, здароўя, як у таго дуба. Каб жылі люба.

— Каб было ў пячы пячыста, а на стале краіста.

— Каб дома ўсё ладзілася, каб багацела ваша гаспадарка, каб куры неслі вялікія яйкі.

— Усяго добрага! Прыходзьце да нас на вячоркі!

## Запрашаем на вячоркі

### *Методыка падрыхтоўкі*

Вячоркі сталі ўжо традыцыйнымі ў нашай школе. Таму падрыхтоўка да свята — гэта творчая справа ўсяго калектыву. Жадаючыя ўдзельнічаць у вячорках маюць магчымасць звярнуцца да ініцыятыўнай групы са сваімі прапановамі, абгаварыць свой удзел у свяце (нехта хоча спець, нехта — станцаваць, расказаць жарт ці правесці гульню).

Дзеці прыносяць з дому вырабы з дрэва, саломкі, вязаныя, тканыя і вышытыя рэчы, зробленыя рукамі сваіх родных, і ўпрыгожваюць імі залу.

### *Методыка правядзення*

*Зала ўпрыгожана ў нацыянальным стылі: ручнікі з беларускім арнаментам, вышыўкай. Каля печы гаспадыня. Яна ставіць на стол самавар, ласункі, потым падмятае падлогу, спявае «Чаму ж мне не пецъ...». У гэты момант вядучы звяртаецца да гасцей.*

**Вядучы.** Сёння ў нашай хаце свята
І гасцей у ёй багата.
Усіх на свята запрашаем

І сардэчна вас вітаем:
І дарослых, і дзяцей,
І шаноўных ўсіх гасцей.
Шанаванне добрым людзям,
Хай вам радасці прыбудзе.
Хлопцы, дзеўкі, мамы, таты!
Запрашаем вас на свята!

**Гаспадыня.** Добры вечар, сябры, паважаныя бацькі і дзеці! Вельмі добра, што вы завіталі сёння да нас. З глыбокай даўнасці прыйшоў да нас гэты народны звычай — вячоркі. Як ні цяжка было жыць у тыя далёкія часы, а ўсё ж заставалася ў народа любоў да песень, танцаў, гульняў, жартаў.

Наш час таксама не вельмі лёгкі. Таму мы вырашылі: будзем вучыцца ў нашых продкаў, якія ў горы і ў радасці не забывалі сваіх песень і танцаў. Вось таму сёння мы запрасілі вас на нашы вячоркі.

І як кажуць нашы людзі,
Хай вам даспадобы будуць
Жарты, песні, смех,
Бо без песні, хоць ты трэсні,
Без гармоніка, дуды
Ходзяць ногі не туды.

*Чуюцца стук, крокі, смех, прыпеўкі. Заходзяць удзельнікі. Спяваюць прыпеўкі.*

На вячоркі мы ідзём,
Дарагія дзевачкі,
Гарманіст у нас прыгожы,
Грае нам прыпевачкі.

Мы прыпеўкі вам спяваем,
Каб смяяліся ўвесь час.
Калі мы вам даспадобы,
Запрашаем ўсіх да нас.

Будзем рады мы сябрам,
Пачастуем ласкай.
Няхай сонца свеціць вам,
Як у добрай казцы.

Ці я ў мамкі не дачка,
Ці я не дачушка.
Хоць малая я расточкам,
Але ж весялушка.

**1-ы госць.** Добры дзень у хату,
Шчыра ўсіх мы вас вітаем,
Добрага здароўя ўсім жадаем.
Ці можна да вас на вячоркі?

**Гаспадыня.** Заходзьце, калі ласка.

**Госці.**
— Добры вечар таму, хто ў гэтым даму!
— Цераз ваш дварок цячэ ручаёк!
— Масці кладачку, заві ў хатачку!
— Музыканты мы не хаджалыя!
— Добра мы пяём, танна бяром!

**Гаспадыня.** Вітаю вас, даражэнькія госці, заходзьце, калі ласка. Сядайце. Паглядзіце, мае даражэнькія, якія прыгожыя вырабы я сабрала сёння ў сваю хату, каб паказаць вам, каб парадаваць вашы вочкі такой дзіўнай прыгажосцю.

*Звяртае ўвагу на выставу вышыўкі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.*

А паглядзіце, які прыгожы куфэрак стаіць у нас. Гэта як бы маленькая копія вялікага куфра. З'явіліся гэтыя куфры даўным-даўно, яшчэ ў дванаццатым стагоддзі. Куфар займаў самае ганаровае месца ў хаце. Па яго прыгажосці меркавалі аб гусце і майстэрстве гаспадыні. На ім маляваліся кветкі ў выглядзе букета або гірлянды. Матулі захоўвалі ў куфрах пасаг сваім яшчэ незамужнім дочкам. Гэты звычай дайшоў і да нашага часу.

Умелі людзі і працаваць і адпачываць. Давайце і мы з вамі павесялімся трошкі.

*Спяваюць песню «Чыя ж то ніва, чые ж то пакосы»* (гл. Дадатак).

**Гаспадар.** Што такое ў нашай хаце? Што за тлум? Што за шум? Што за весялосць?

**Гаспадыня.** Сёння свята ў нашай хаце! Гасцей цэлая хата, на вячоркі прыйшлі, а ты недзе затрымаўся.

**Гаспадар.** Затрымаўся я па важнай справе, даглядаў жывёлу ў сваім хляве.

**Дзеці.** Я якую жывёлу вы даглядалі?

**Гаспадар.** Адгадайце мае загадкі, тады і даведаецеся, якую жывёлу я даглядаў!

1. Пасярод двара стаіць капа.
   Спераду вілы, ззаду мятла. (*Карова.*)
2. Не кароль, а ў кароне,
   Не гусар, а пры шпорах,
   Гадзінніка не мае, а час знае. (*Певень.*)
3. Нос пятачком, хвост кручком,
   Нічога не баліць, а ўсё стогне. (*Парсюк.*)
4. Усіх возіць, а сам пехатою ходзіць. (*Конь.*)
5. З людзьмі сябруе, хату вартуе,
   Жыве пад ганкам, хвост абаранкам. (*Сабака.*)
6. Белыя, як снег, цэлы дзень у рэчцы,
   А на бераг выйдуць сухімі. (*Гусі.*)

Малайцы! Адгадалі мае загадкі і даведаліся, якая жывёла жыве ў нашым падвор'і. А зараз я магу таксама з вамі адпачываць і весяліцца.

**Гаспадыня.** Але ж, можа, перш чым прыступіць да працы, трэба трошкі размяцца. Ногі так і рвуцца ў танец.

*Танец «Падыспань». Чуецца песня. Едуць на «кані» Лявон з Лявоніхай, пад'язджаюць да хаты.*

**Лявон.** Тр-р... Прыехалі! Злазь, даражэнькая, зараз гаспадыня нас будзе сустракаць. Мы і так ужо спазніліся на вячоркі.

*Лявоніха злазіць, Лявон адпускае «каня».*

**Гаспадыня.** Вітаю вас, даражэнькія Лявонка і Лявоніха!

**Госці** (*крычаць*). Дзядзька Лявон з Лявоніхаю прыехалі!

**Лявон.** Добрага здароўя, кумачка!

**Лявоніха.** Добры вечар у хату!

**Госці.** Добры вечар!

**Лявоніха.** Ой, як вас тут многа! А колькі цудоўных рэчаў сабралі вы ў сваёй хаце, шаноўныя гаспадары!

**Гаспадар.** А вось вырашылі паказаць сваім гасцям, што ўмелі рабіць у даўнія часы, ды і зараз робяць нашы беларускія жанчыны. Паказаць іх вялікую прагу да працы, іх захапленне працай і ўменне працаваць.

**Лявоніха.** Добра, вельмі добра, даражэнькія. Нездарма наш народ столькі прыказак і прымавак склаў аб працы. Вось, напрыклад: «Зямлю грэе сонца, а чалавека — праца».

**Госці.**

— А мы таксама ведаем прыказкі і прымаўкі аб працы.

— Без працы не будзе шчасця.

— Чалавек без працы, што птушка без крылаў.

— Хто працуе, той і мае.

— Добра працуем — павагу маем.

— Якая справа — такая і слава.

— Грэе не шуба, а праца.

— Без працы няма чаго хлеба шукаці.

**Лявоніха.** Лявонка, паглядзі, якія тут майстры сядзяць (*уважліва разглядае работы*). Бачу, нават партрэты малююць.

**Лявон.** Лявоніха, у нашай хаце няма ніводнага здымка, то, можа, гэты мастак і зробіць нашы партрэты?

**Мастак.** Я з задавальненнем выканаю вашу просьбу. Але ж чым вы плаціць будзеце?

**Лявоніха.** Чым скажаш, даражэнькі. Можам нават грошай табе даць.

**Мастак.** Не, не ў грашах шчасце, а калі радасць і вяселле ў хаце. Мы любім не толькі працаваць, але ж і весяліцца, спяваць ды смяяцца. Можа, вы нас чым павесяліце? Лепшай платы мне і не трэба!

**Лявоніха.** Сабраўся аднойчы Лявонка брата свайго праведаць, што ў салдатах служыў, але перад гэтым заехаў на базар кабана прадаць. Прадаў кабана, пайшоў закусіць. З'еў тры міскі капусты з боханам хлеба, сала хатняга з фунт. Тут купіў яшчэ тры порцыі смажанай каўбасы і ўмяў. Пасля бульбы змамоніў міскі тры. Зноў баршчу міску ўбіў з булкай. А пасля як успомніў, што брат у салдатах, то як завязала! Чуллівы чалавек, праўда? Есці не можа, калі брату цяжка. Ой, а яшчэ ж я вам раскажу, як мы з Лявонам у госці аднойчы збіраліся.

**Лявон.** Навошта расказваць, давай лепш паспяваем. Эй, музыкі, браточкі, зайграйце!

*Спяваюць песню «Сабірайся ў госці, мой дзядок» (гл.* Дадатак*).*

Ох, давайце цяпер пагуляем трошкі.

*Праходзіць гульня «Яшчар». Яшчар назірае, каб ніхто не засмяяўся. Хто парушыць правіла, прэзентуе фант. Фанты разыгрываюцца.*

**Гаспадыня.** Дзякуй, Лявонка, за вясёлую гульню. За гэта, госцейкі дарагія, давайце Лявонку з Лявоніхай іх любімы танец падорым. Бачу, вашы ножкі туп-туп-тупацяць і на месцы зусім не стаяць. (*Танцуюць «Лявоніху»*.)

Ні адны вячоркі не абыходзіліся без беларускіх народных песень. І мы з вамі сёння спяваем іх, і раней спявалі. А чаму гэтыя песні называюцца народнымі?

**Хлопчык.** Таму што раней людзі простыя не ўмелі ні пісаць, ні чытаць і перадавалі песні адзін аднаму ў вуснай форме. Вось таму некаторыя народныя песні некалькі адрозніваюцца ў розных кутках Беларусі.

**Дзяўчынка.** А я яшчэ паданне ведаю, адкуль песня беларуская ўзялася. Ішлі тры падарожнікі. Ішлі яны тры дні і тры ночы ды яшчэ паўдня. Прытаміліся. Прыселі. Раптам чуюць — нехта спявае. Прыслухаўся першы:

— Відаць, жаўранак.

— Не, — кажа другі, — гэта лес шуміць.

А трэці прыпаў вухам да зямлі і прашаптаў:

— Дык гэта ж зямля наша беларуская спявае.

**Несцерка** (*уваходзячы ў хату*). Добры вечар усім! Ой, колькі вас тут! Нават і Лявон з Лявоніхаю мяне апярэдзілі.

**Гаспадыня.** Добры вечар, Несцерка! Як мы доўга цябе чакаем. У нас тут вячоркі ў поўным разгары, а цябе ўсё няма. Ведаем, што ты з пустым мехам не прыходзіш.

**Несцерка.** Паважаныя сябры, прывёз я вам смеху мяшочак і чароўны гаршчочак. Я смяшыў вашых дзядоў. Хто мяне яшчэ не ведаў? Запрашаю вас на гульні, каб павесяліцца. Тут ваш спрыт і ваша лоўкасць вельмі прыгадзяцца. Бачу, які тут сёння малады і вясёлы народ. Калі ласка, хутчэй станавіцеся ў карагод.

*Дзяўчаты выконваюць песню «А ў полі вярба нахілёная (гл.* Дадатак*».*
*Водзяць карагод.*

**Гаспадыня.** Добра пагулялі. Але ж ты, Несцерка, з дарогі. Сядай вось, адпачні ды паглядзі, як нашы госцейкі працуюць.

**Несцерка.** Таленавітыя госці ў вас: што працаваць, што гуляць — усё адно.

**Гаспадар.** Так, так, але ж давайце яшчэ паспяваем.

*Гучыць песня «Ой, аралі хлопцы ніву» (гл.* Дадатак*).*

**Госць.** А што гэта мы ўсё спяваем ды скачам? Нічога смешнага не расказваем. Вось я вельмі люблю анекдоты.

*Расказваюць па чарзе анекдоты.*

1. — Разумееце, не можам прыняць вашага сына ў музычную школу.

— Чаму?

— Слыху няма.

— А божачкі ж! Няўжо аглух? Учора ж ён яшчэ ўсё чуў.

2. — Вось каб мне такія доўгія вушы, як у зайца, тады б я вельмі лоўка падхопліваў усе падказкі, — заўважыў Коля.

— Не, не згодзен, — запярэчыў Вася. — Доўгія вушы трэба доўга мыць.

3. Сын:

— Тата, сёння я адзін ва ўсёй школе мог адказаць настаўніку.

Бацька:

— А што ён пытаў, сынок?

Сын:

— Хто разбіў акно?

4. — Паважаны грамадзянін, ваш сабака ўкраў у мяне цэлы кілаграм мяса.

— Дзякуй, што вы гэта мне паведамілі. Я сёння не дам яму есці.

5. Хлопчык прыйшоў у магазін і падае прадаўцу бідончык:

— Мама прасіла, каб вы адпусцілі поўную пасудзіну малака.

— Які разумны хлопчык, памагае маці, — хваліць прадавец. — Вось табе малако. Мама, відаць, дала табе і грошы на малако?

— Дала. Я паклаў іх на дно бідончыка, каб не згубіць.

6. Маленькі Рыгорка пытаецца ў свайго сябрука:

— Васька, а ты ведаеш, чаму ў зайца вушы доўгія?

— А-а, здагадаўся! Заяц, калі быў маленькі, не слухаўся свайго бацькі.

7. — Ты смелы? — пытаецца Цішка ў Колі.

— Смелы, — адказвае той.

— То чаму ж ты зайца спалохаўся, калі мы ў лес хадзілі?

— Дык я ж не ведаў, што гэта заяц.

**Лявоніха.** Лявон, бачыш, колькі ўсяго смешнага нарасказалі. А што ты маўчыш? Можа, ты дзе быў, дзіва сустракаў? Ці што смешнае бачыў?

**Лявон.** Бачыў.

**Лявоніха.** А карову, што люльку курыла, бачыў?

**Лявон.** Бачыў.

**Лявоніха.** А ці бачыў авечку, што несла яечкі?

**Лявон.** Бачыў.

**Лявоніха.** Бачыў камара, які поле араў?

**Лявон.** І гэта бачыў.

**Лявоніха.** Ну дык цябе нічым не здзівіш.

**Несцерка.** Сябры, наш край вельмі багаты сваімі талентамі. Наш народ шмат усяго ведае: казак, небыліц, прымавак, прыпевак. Я мяркую, што і сярод прысутных ёсць такія таленты. Таму зараз пачынаем конкурс новы — падыходзьце, хто гатовы. Гэй, смялей, хлопцы і дзеўкі, пачынаем прыпеўкі!

*Гучыць вясёлая музыка, спяваюць прыпеўкі.*

**Лявон** (*да Лявоніхі*). Пайшлі мы першыя, можа, які прыз атрымаем.

**Лявон.** А ў кругу не размінуцца,
Танец каруселіцца.
І прыпеўкі не здаюцца,
Самасеем сеюцца.

**Лявоніха.** Папрашу цябе — не руш,
Баба я бядовая.
Гарадскі твой капялюш —
Галава садовая.

**Лявон.** На гары стаіць бяроза,
Дробны ліст угору ўе.
Што за жонка ў Лявона —
Разгуляцца не дае.

*Спяваюць усе па чарзе.*

Стары заяц сена косіць,
А ліса зграбае,
Муха сена к возу носіць,
А камар скідае.

Ой, купіў сабе штаны —
Не дам ніяк рады:
Як зашыю спераду,
Яны рвуцца ззаду.

Пагарэлі хамуты,
Хай гараць і лямцы.
Як такі з цябе танцор,
Лепш сядзець на лаўцы.

Не глядзіце на дзяўчат,
Што ў дзяўчат за брошкі,
А вазьміце паглядзіце,
Ці памыты ножкі.

Ой, праду, праду я кужаль
З белага павесна.
Прысядзь бліжэй, мілы-любы,
Нам не будзе цесна.

Гусі жыта паглумілі,
Хто-та будзе жаці?
Хлопцы дзеўку сцалавалі,
Хто захоча ўзяці?

Вецер кветачку калыша,
А я песенькі пяю.
Скора міленькі запіша
На фамілію сваю.

**Лявон.** Ой, Лявоніха, паглядзі, нашы партрэты ўжо гатовы.

**Лявоніха.** І сапраўды, бачыш, якім цудоўным ты выглядаеш, нават лысіны не відаць.

**Лявон.** Але ж і ты, жонка, атрымалася лепш, чым на самай справе. Паглядзі, якая ты ў мяне тоўстая. Ой, прабач, жоначка, я хацеў сказаць — магутненькая, як той дуб, што ў полі стаіць, а на партрэце ты такая маладзенькая, як дзяўчынка. Нездарма я закахаўся ў цябе ў маладосці.

**Лявон з Лявоніхай.** Дзякуй табе, добры мастак, дай Бог табе здароўя.

**Несцерка.** Давайце яшчэ пагуляем ці паспяваем.

*Гучыць песня «Ручнікі» (гл. Дадатак).*

**Гаспадыня.** Паважаныя госці, дзякуй вам за вашы цудоўныя песні, добрую музыку. А зараз я запрашаю ўсіх на нашу беларускую «Польку-трасуху».

*Танцуюць усе.*

А цяпер і пачаставацца пара, запрашаю вас да нашага стала.

*Частуюцца сокам і выпечкай. Гульня з гледачамі «Іванька і Марылька».*

**Госці.**
— Няхай вам часценька шанцуе на госці!
— Ніхто каб ніколі не меў на вас злосці!

**Гаспадар.** Не мінайце нашай хаты,
Прыязджайце вы да нас.
Пірагамі мы заўсёды
Пачастуем, госці, вас!

**Лявон.** Ну вось, сябры, мы з Лявоніхай наскакаліся, пачаставаліся, ці не час ужо і дахаты ісці?

**Лявоніха.** Так, Лявон, а то гаспадыня ўжо, мабыць, стамілася.

**Гаспадыня.** Дзякуй вам, Лявон і Лявоніха, Несцерка, дарослыя і дзеці, што завіталі да мяне на вячоркі.

**Несцерка.** Трэба нам ужо ў дарогу.
Дзякуй, госці, за падмогу.
Вы так дружна рагаталі,
Нас так хораша віталі,
Пляскалі ў ладкі, адгадвалі загадкі.

**Лявон.** Хоць шкада, а ўсё ж бывайце,
Толькі нас не забывайце.

**Лявоніха.** Дружна жывіце, хутка расціце, край свой любіце.

**Гаспадыня.** Не таму любіце, што за ўсё цяплейшы і прыгажэйшы, а таму любіце, што за ўсё мілейшы, за ўсё даражэйшы.

*Гучыць песня «Бывайце здаровы». Усе выходзяць.*

## «Кошык весялосці на вясковым падвор'і»

Свята з'яўляецца своеасаблівым вечарам беларускага гумару. У сцэнарыі цесна пераплятаюцца беларуская народная песня і сучасная гумарэска, гульня і ўдалы жарт, камічныя сучасныя сцэнкі і небыліцы. У кожным з гэтых жанраў знайшла адлюстраванне адна з лепшых рыс нашага нацыянальнага характару — пачуццё гумару. Аптымізм, здольнасць пажартаваць так неабходны сёння ў нашым жыцці.

### *Методыка правядзення*

*Сцэна стылізавана пад вясковы двор: за плотам высяцца дрэвы, на плоце вісяць гліняныя збанкі. Непадалёку — калодзеж-журавель, драўляная лаўка.*

**Вядучы.** Прывітанне добрым людзям!
Сёння свята для ўсіх будзе.
Песні, гульні, карагоды,
Смех, і жарты, і прыгоды.
Запрашаем ўсіх ласкава
На вясковыя забавы.

*Выходзіць хлопец, сядае на лаўку.*

**Хлопец.** Эх, павандраваў я па свеце. Шмат усяго цікавага бачыў. Але лепш нідзе няма, як у роднай вёсцы (*разуваецца*). Ох, як добра адчуць пад нагамі зямельку родную. Вёсачка наша Аглабелька хоць і невялічкая, затое багатая і працавітая, вядомая на ўсю ваколіцу. А вы хіба пра яе не чулі?! Не можа такога быць. Тут жа такія справы вынікаюць, што надта кожнага займаюць. Не верыце?! Ну дык глядзіце, заўважайце і на вус матайце. А вось і самыя відныя бабкі на ўсю вёску. Хоць і сварлівыя, але праз дзень зноў ужо найлепшыя сяброўкі.

*Уваходзяць Сымоніха і Лявоніха.*

**Сымоніха, Лявоніха** (*разам*). Цып-цып-цып.

**Лявоніха.** А дзе ж мае куры падзеліся? Каб на іх каршун!

**Сымоніха.** А дзе ж мой певень прапаў? Каб ён здох!

**Лявоніха.** Добры дзень, Сымоніха!

**Сымоніха.** Добры дзень, Лявоніха!

**Лявоніха.** А даўненька мы з табою не бачыліся, суседачка.

**Сымоніха.** А во, іду даведацца, як ты маешся, міленькая.

**Лявоніха.** Эт, жыву-гадуюся, як той гарох пры дарозе, кратаюся як колечы. А што чуваць у цябе, кумачка-любачка? (*Убок.*) Трасца табе ў бок, ліха тваёй матары. Прыйшла ты даведацца, што ў маёй хаце робіцца.

**Сымоніха.** Эт, дабра не чуваць і ад ліха не ціха. Ой, бедная мая галовачка! Ой, жыццё маё палыном-травіцаю зарасло. Прыяцельніцы ж можна крыху паскардзіцца ды пажаліцца. (*Убок.*) Каб ты не дачакалася, пакуль я табе буду хваліцца, нячыстая душа, багаццем сваім. Працую і жыву. Бог і рубельчыкам, і тым, і сім не абміне. (*Убок.*) Я ж не такая крывуля, як ты!

**Лявоніха.** Скажы, любанька, твой Сымон ужо перастаў піць? Ён да цябе рукамі болей не соваецца? (*Убок.*) Думаеш, не ведаю, як тваю скуру лупіць і ўдзень і ўначы? Але ты і гэтага мужыка не вартая!

**Сымоніха.** Ха-ха-ха, золатца маё, дзякаваць Божаньку, як толькі знахар даў мне той вады, дык як рукою адняло — другім чалавекам Сымон зрабіўся: цяпер у мяне не жыццё, а проста рай. (*Убок.*) Хоць трэскайся, хоць лопайся, хоць макам рассыпайся, не буду табе на радасць жаліцца, што ў мяне бакі пабітыя, як цапамі, ад жалезных кулакоў Сымона.

**Лявоніха.** А праўду кажаш, дальбог праўду! Ты цяпер нават куды лепей выглядаеш. Такая чырвоненькая, кругленькая, як тая макавачка, ат зай-

здрасць бярэ. (*Убок.*) Прыгажэйшую за цябе ў труну кладуць. Ой, добранька ведаю тваё жыццё-быццё пякельнае. А скажы, суседачка, ну ніхто ў нашым сяле так дружна не жыве, як мы з табою.

**Сымоніха.** Дык як жа іначай, сэрца маё, як іначай, даражэнькая. (*Убок.*) Няпраўда, мана, фальш.

**Лявоніха.** Хадзі ка мне, зязюлечка, у хату. Пагаворым аб тым ды аб сім.

**Сымоніха.** Во, гвалтам цягне ў хату. Дзякую, сястрычка, але ж пойдзем у маю хату — і мы людзі хрышчоныя.

**Лявоніха.** Заходзь да мяне!

**Сымоніха.** Не, заходзь да мяне!

**Лявоніха.** Як, ты ганьбуеш маёй хатай?

**Сымоніха.** Як, ты пагарджаеш маім кутком?

**Лявоніха.** Ты — такая, ты — сякая!

**Сымоніха.** Ты — сякая, ты — такая!

**Лявоніха.** Шэльма!

**Сымоніха.** Гадаўка!

**Лявоніха.** Шэльма, шэльма!

**Сымоніха.** Гадаўка!

**Лявоніха.** А во табе!

**Сымоніха.** На і табе (*б'юцца*).

*На лаўцы сядзіць дзеўка Дрыпа і румзае. З'яўляецца «цыганка».*

**Дрыпа.** Ы-ы-ы-ы.

**Цыганка.** Што здарылася, прыгажуня? Мо гарох не ўрадзіў ці малако ў каровы пракісла?

**Дрыпа.** Не-е-е... Замуж хачу!

**Цыганка.** Вось гора дык гора! А чаму ж не ідзеш? Ці жаніха няма?

**Дрыпа.** Жаніхоў ажно два, але не ведаю, якога выбраць. А татка не пускае ні за аднаго, ні за другога.

**Цыганка.** Гэта яшчэ чаму?

**Дрыпа.** Сямён паспрабаваў сані майстраваць. Як пачаў полаз гнуць, дык жардзіна саскочыла ды — бэнц! — проста яму ў лабаціну. Сцяпан быў узяўся гаршкі ды міскі круціць на ганчарным коле, але першаму пакупніку не дагадзіў, той зазлаваў, што гаршчок дзіравы, ды разбіў яго аб ягоную галаву.

**Цыганка.** Дзе ж гэта запісана, каб шляхцюк сам майстраваў сані ды гаршкі ляпіў? Не такое рамяство ў шляхцюкоў!

**Дрыпа.** А якое?

**Цыганка.** На вараным коніку скакаць, шаблечкай махаць, паганага ворага перамагаць. Ды іншыя геройскія подзвігі звяршаць. А пасля — мёд-гарэлачку смактаць, кілбасы ды кумпякі таптаць.

**Дрыпа.** Вой, гарэлку смактаць ды кілбасы таптаць яны добра ўмеюць!

**Цыганка.** Значыцца, сапраўдныя шляхцюкі! І астатняму навучацца. Дам табе добрую параду: выпраўляй сваіх жаніхоў у белы свет подзвігі здзяйсняць. Каторы з іх самы ганаровы подзвіг учыніць, за таго і замуж выходзь. А мне за добрую параду — пазалаці ручку.

**Дрыпа.** Дзякуй табе, цётачка. Навучыла неразумную дзеўку, як з бяды выйсці. А вунь і мае жаніхі па адказ ідуць.

*«Цыганка» знікае. Да лаўкі падыходзяць Сямён і Сцяпан.*

**Сямён.** Маё вам шанаванне, паненка Дрыпа!

**Сцяпан.** Чэсць!

**Сямён.** Дык што ж адкажа ясная паненка на маю прапанову? Ці пойдзе за мяне замуж? Я з такой нагоды паненцы Дрыпе новую сукню куплю...

**Сцяпан** (*перапыняе*). Ага, калі толькі грошай дзе-небудзь пазычыш. Не слухай, прыгажуня, выходзь за мяне. Я цябе на жарабцы катаць буду. У мяне ёсць такі жарабец — агонь, а не жарабец. У стайню не можа прасунуцца, такі вялікі, дык ён я-а-ак разгоніцца і ў дзірку пад дзвярыма — шусь! Цьфу, пра што гэта я?

**Сямён.** Мусіць, гэта ў пана Сцяпана сабака такі, а не жарабец.

**Дрыпа.** Ну, досыць, наслухалася ўжо я вас, панове. І вось мой адказ: годзе вам на печы ляжаць ды семкі лускаць. Выпраўляйцеся ў белы свет геройскія подзвігі здзяйсняць. Хто з вас смялейшы акажацца, за таго і замуж пайду. З тым і бывайце. Я пайшла карову даіць.

**Сцяпан.** Ну што, наперад, пан Сямён.

**Сямён.** Толькі пасля вас, пан Сцяпан.

*Ідуць са сцэны. Выконваецца жартоўны танец «Уздзенская санаторная кадрыля». На сцэне з'яўляецца хлопец. У адной руцэ вуды, у другой — сачок. Калашына разарваная.*

**Хлопец.** Цьфу ты! Нідзе ад гэтых дзяўчат не схаваешся. Куды ні кінь — усюды яны, трасца ім у бок! Усё цягнуць на свае вячоркі. Гарэлі б яны гарам разам з імі. З-за іх толькі на рыбалку спазніўся. Ды яшчэ бяды нарабіў. Уцякаючы, скакаў цераз плот, зачапіўся і парваў калашыну. Вось з'яды дык з'яды. Я сюды, я туды — усюды яны. Але нічога, тут яны мяне не знойдуць.

*Садзіцца вудзіць рыбу з калодзежа, мурлыча пад нос песню. З другога боку, аглядаючыся, спяшаецца другі хлопец. Штурхае першага ў бок. Абодва спалохаліся.*

**1-ы хлопец.** Га? Дзе? Што?

**2-і хлопец.** Лепш не пытай. Думаў, уцяку. Пайшоў агародамі. І што ты думаеш? Гэта Анельчына дачка ўсё-такі ўбачыла. Не паспеў я ступіць нагой на кладку, яна як запішчыць: «Вось ён, дзяўчаткі, сюды!» Што рабіць? Я тады — плясь на зямлю і дзе бокам, дзе скокам пачаў уцякаць. Гора дый годзе з імі. Але цяпер яны нас не знойдуць.

**1-ы хлопец.** А ведаеш, браток, давай мы іх перахітрым, а заадно і перапалохаем. І няхай гэтыя задавалы-запявалы думаюць, што мы ўтапіліся.

**2-і хлопец.** Давай, а самі схаваемся і паглядзім, што далей будзе.

*Хаваюцца. Вуды ляжаць ля калодзежа. Убягаюць дзяўчаты.*

**Дзяўчаты.**

— Яны недзе тут. Я ж толькі што іх бачыла. (*Заглядае ў студню.*) Утапіліся! Ой, утапіліся! Што рабіць? Людзі, ратуйце!

— А можа, яшчэ і не ўтапіліся, а пасмяяліся з нас?

— Пасмяяліся. Тады няхай не трапляюць нам на вочы. Бо гэты смех вылезе ім бокам.

— Ды хопіць вам, пайшлі лепш шукаць.

— А я ім такога вераб'я падпушчу, што яны яшчэ прыйдуць ласкі прасіць.

*Дзяўчаты выходзяць. З'яўляюцца хлопцы.*

**Хлопцы.**

— Алесь! Змітрок! Дзе вы? Вылазьце. Яны пабеглі ў другі бок. Не бойцеся.

— Вылазьце, калі што якое, то мы вас абаронім ад гэтых красунь.

*Хлопцы вылазяць, азіраючыся.*

— Што гэта вы такія ўзрушаныя? Што здарылася? Хіба што смешнае з'елі? Ці, можа, рыбіну злавілі во такую? (*Паказвае.*)

— А можа, на вудачку сом велічэзны папаўся і вы не маглі яго выцягнуць?

— Якая тут рыба! Гэта ж дзяўчаты нашы, як тыя цялушачкі, толькі хвастом не махаюць, а бегаюць, што не дагнаць, цягнуць нас на свае вячоркі, трасца ім у бок.

— А мы не хочам. Вось яны нас за гэта і не любяць. Не, хлопцы, трэба адсюль змывацца. Бо смех смехам, але хітрыкі могуць нам бокам вылезці.

*Хлопцы выходзяць. З'яўляюцца дзяўчаты.*

— А што гэта нікога няма? Я ж толькі што чула песні. Можа, гэта здань якая ці трава спявае? Але дзе ўсе? А вось яны! Хлопцы! Дзяўчаты! Будзем песні спяваць, танцаваць.

*Гучыць песня «Мамачка, родна, пусці на сяло» (гл.* Дадатак*).*
*З'яўляюцца Ён і Яна.*

**Яна** (*радасна*). Пуся-Пусінька, дай бусінькі. (*Цалуе яго ў шчаку.*)

**Ён.** Муся-Мусінька! (*Здзіўлена.*) Ты ўжо на рынак схадзіла?

**Яна** (*паказваючы авоську*). Зірні, якой маліны купіла.

**Ён** (*усміхнуўшыся*). А мне прыснілася, што я на рынку з гэтай авоськай быў і прадаваў ягады.

**Яна.** Чырвоныя?

**Ён.** Чарніцы. Прадаю, а ягад усё больш і больш становіцца.

**Яна.** Пуся! Калі ты сон бачыў? Звечара?

**Ён.** Толькі што.

**Яна** (*з трывогай*). Божа мой! Сёння ж нядзеля! Значыцца, усё збудзецца да абеду.

**Ён.** Ты аб чым вядзеш гутарку?

**Яна.** Бачыць у сне чорныя ягады — значыць, нейкія слёзы, нейкая сварка будзе. І трэба яшчэ ў нядзелю такі сон! Успомніш мяне, да абеду ўсё збудзецца.

**Ён.** Муся-Мусінька! Не звяртай увагі. Мала што чалавеку прысніцца. (*Цалуе яе.*) Я пастараюся не даць ніякай зачэпкі для сваркі. Ты ж ведаеш — я першы не пачну.

**Яна** (*абурана*). А хто? Я, па-твойму, пачну?

**Ён** (*насцярожана*). Муся! Давай не будзем! А то і сапраўды сон збудзецца.

**Яна.** Не выкручвайся, як уюн! Выходзіць, я без прычыны першай задзіраюся? Выходзіць, я заўсёды першая калатэчу ў хаце заводжу? (*Падступае да Яго.*) Так? Адказвай!

**Ён.** Муся!

**Яна** (*да гледачоў*). Чуеце? Я з ім хачу спакойна пагаварыць, а ён не даецца. (*Да Яго.*) На дыбкі становішся?!

**Ён.** Прашу! Памаўчы хоць сёння! А то зранку завялася, як той удод. Усё ду-ду-ду!..

**Яна.** Хто ўдод?

**Ён.** Бачыш, кранула, не падабаецца, што параўнаў з удодам. А табе, значыцца, усё можна? Можна мяне і ўюном, які выкручваецца, і кім хочаш абазваць? Чаго ты хочаш ад мяне, чаго ты лезеш асою ў вочы?

**Яна** (*да гледачоў*). Вось у нас і загарэўся сыр-бор. (*Бярэ кій, да Яго.*) Пуся! Хадзем у хату, каб людзі не чулі і не бачылі...

**Ён** (*у залу*). Усё-такі сны збываюцца. Бачыце, і сварка пачалася, і, напэўна, слёзы будуць... (***Нехаця выходзіць за жонкай.***)

*Гучыць беларуская народная песня «Дзе мая Маруся» (гл.* Дадатак*). Уваходзяць Дзед з Бабай.*

**Хлопцы.**

— Ой, гляньце, хто гэта шкандыбае да нас?

— Ого! Дык гэта ж дзед Піліп, што да лаўкі прыліп.

— І бабка Мальвінка, вясёлая дзяўчынка.

**Дзед.** Ох-ох! Старасць — не радасць.

**Баба.** Праўду кажаш, дзед. Усё баліць. Косці ныюць.

**Дзед.** І спіну ломіць.

**Баба.** Рукі і ногі млеюць.

**Дзед.** Кашаль во зноў душыць.

**Баба.** Вочы дрэнна бачаць.

**Дзед.** Так, здароўе ўжо не тое. Давай тут сядзем адпачнём. (*Селі.*)

**Баба.** Слухай, Міхалыч, што за моладзь пайшла. Жах што робяць!

**Дзед.** Да-а-а.

**Баба.** Ці ты ведаеш, чым яны займаюцца? Хоць бы вунь тыя патлатыя, што «Кэмал» кураць. У наш час такога не было.

**Дзед.** Да-а. Раней такіх цыгарэт не прадавалі.

**Баба.** Згодна. Ці стрыгліся ж мы так? Адзін ходзіць, па плячах валасы распусціўшы, другі — пад «зэка».

**Дзед.** Мода ў іх такая. Я, як бачыш, таксама модны. (*Паказвае лысіну.*)

**Баба.** Не. Я сур'ёзна. А дзе яны бяруць такую смешную вопратку?

**Дзед.** Самі робяць.

**Баба.** Гэта як?

**Дзед.** Ды звычайна. Купляюць у магазіне адзенне, у кашулі адразаюць рукавы, у штанах калошы, вось і гатова.

**Баба.** А дзе грошы бяруць? Самі ж, пэўна, яшчэ не зарабляюць — вусы пад носам не выраслі. А вось мы...

**Дзед.** Ага, мы зараблялі — вагоны разгружалі, пустыя бутэлькі здавалі.

**Баба.** Вось паглядзі на гэтых крыклівых. І не сорамна ім галёкаць на ўсю вёску. Не зважаюць, што людзі тут. Што за моладзь пайшла!

**Дзед.** Чаго ты бурчыш, яны ж цябе не чапаюць.

**Баба.** Усё роўна навошта крычаць? Мы такімі не былі... А ці чуў ты, Міхалыч, якую яны музыку слухаюць? Мой унук як завядзе свой грамафон, ці як ён цяпер там называецца, то аж вушы дзярэ.

**Дзед.** Дык жа мы калісьці адпачывалі, а яны цяпер — тусуюцца.

**Баба.** Што за моладзь пайшла!

**Дзед.** Не пайшла, а пабегла, і адсталі мы з табою ад іх, баба, ого як далёка. (*Выходзяць.*)

**1-ы хлопец.** Дзед Піліп, пачакайце!

**2-і хлопец.** Чакайце, бабка Мальвіна! Дарэмна вы так пра нас тут гаворыце. Хіба вы ў маладосці, бывала, глупстваў не рабілі?

**Баба.** Глупстваў-то не рабілі. А вось танцаваць і спяваць любілі. Ці памятаеш ты, Міхалыч, як дзяліліся на два гурты і спявалі, хто каго пераспявае?

**Дзед.** Чаму ж не, было-было, памятаю.

**1-ы хлопец.** Давайце і мы так зробім, хлопцы. Хто каго пераспявае: вы нас ці мы вас.

*Спяваюць прыпеўкі. Гучыць беларуская народная песня «А я ў печы не паліла» (гл.* Дадатак*). З'яўляецца Дрыпа.*

**Дрыпа.** Куды ж гэта жаніхі мае падзеліся? Пайшлі — як скрозь зямлю праваліліся, хоць бы вестку якую даслалі. А я ўжо галасіла-галасіла. (*Плача.*) Усе валасы на галаве выдрала. (*Паказвае.*) Вось зірніце. Людзей жа — што кіем набіта. А гоману — аж у вушах гудзе.

*З будана выскаквае Пастрыгач у белым фартуху, з агромністымі нажніцамі.*

**Пастрыгач.** Шаноўныя мамзелі і мусью, хто хоча пастрыгчыся па апошняй французскай модзе, валі сюды! (*Дрыпа ўтаропілася ў яго, адвесіўшы губу.*) Чаго зяпу раскрыла, шаноўная мамзеля?

**Дрыпа** (*нясмела*). Выбачайце, паночку, ці не вашэць стрыгла летась авечкі ў тутэйшага пана Васіля?

**Пастрыгач.** Не, гэта не я! Я — з Парыжу, парыжскі цырульнік, гэта, па-вашаму, пастрыгач. Магу й цябе пастрыгчы, шаноўная мамзеля. Станеш вочынна красівая, вужасна прыўкрасная.

**Дрыпа.** Чаго мне стрыгчыся, калі я валасы павырывала з гора. Бяда ў мяне. Жаніхі мае недзе прапалі, пан Сцяпан ды пан Сямён... Не даводзілася, спадарыку, такіх сустракаць?

**Пастрыгач.** Гм... А якія яны на выгляд, твае жаніхі?

**Дрыпа.** Ну, такія, крыху худаватыя, а можа, і таўставатыя трошачку. Не сказаць, каб дужа высокія, але і не нізкія. У кожнага два вухі, адзін нос, спераду.

**Пастрыгач.** Пардон, такіх многа. (*Знікае.*)

**Хлопцы.**

— Дрыпа, чаго па свеце хадзіць, сумаваць ды нейкіх прайдзісветаў шукаць?

— Паглядзі, якія гарныя хлопцы сядзяць. Прыгожыя, маладыя, як дубы.

— Чаму ж ты нам ганьбу даеш? Што спяваць, што працаваць — на ўсё малайцы.

*Гучыць песня «Полька беларуская» (гл.* Дадатак*).*

**Жэня.** Дык ты, Вася, возьмеш мяне ў горад заўтра?

**Вася.** Паглядзім на твае паводзіны. (*Усміхаецца.*)

**Жэня.** Мне ж трэба яйкі на базары прадаць.

**Вася.** А мне што за бяда? На аўтобусе едзь. (*Смяецца.*)

**Жэня.** А я ў цябе і пытацца не буду, сяду і паеду: не твая машына — калгасная.

**Вася.** А я вазьму і зганю. Не гарэць жа мне праз цябе перад аўтаінспекцыяй: ты ж мне не грузчык ніякі і ў пуцёўку не будзеш упісана.

**Жэня.** У кабіне ж ты маеш права аднаго чалавека везці.

**Вася** (*абдымае Жэню*). Паедзем, паедзем, Жэнечка! Я цябе не толькі ў раён, але і ў сталіцу без усякіх пуцёвак кацiць магу, і ніводзін аўтаінспектар мне не страшны... Але што я атрымаю за гэта?

**Жэня** (*усміхаецца*). Мех кулакоў. (*Прымае баксёрскую позу.*) І паўмеха авансам усыплю. (*Частуе яго тумакамі ў грудзі.*)

**Вася.** Ну-ну, я ж не падушка пуховая, каб падбіваць мяне.

**Жэня.** Праўда што, толькі руку пабіла аб скабы. (*Дзьмухае сабе на пальцы.*)

**Вася.** Будзеш ведаць. Гэтак жа, мусіць, і мне балела.

**Жэня.** Ваша мужчынская скура цвёрдая. (*Зноў пачынае бойку, але адной рукой.*)

**Вася.** Мацней, мацней! Можа, хоць сон разгоніш.

**Жэня.** Ага, а што ж ты сказаць па дарозе збіраўся мне?

**Вася.** О, вельмі важнае нешта!

**Жэня.** Ну, я слухаю.

**Вася.** Пачакай, гэта ж не вельмі проста сказаць.

**Жэня.** Гавары ж хутчэй! Цярпенне лопне, пакуль дачакаешся.

**Вася.** Та-ак, адкуль жа мне пачаць?

**Жэня.** З сярэдзіны, з канца, калі не можаш з пачатку.

**Вася** (*бярэ яе за руку*). Дык бачыш... Я... люблю.

**Жэня.** Я гэта не раз ад цябе чула.

**Вася.** Дык не цябе, машыну сваю: яна ў мяне такая ж капрызная і наравістая, як і ты ўсё адно. (*Рагоча.*)

**Жэня.** І я люблю...

**Вася.** Адыграцца хочаш? Каго ж, цікава?

**Жэня.** Бычэчка Рыжыка: ён акурат тваёй масці, а хвост матляецца ўсё роўна, як твой язык.

**Вася** (*смеючыся*). Малайчына! Здорава пад'ехала! (*Прытуляе да сябе.*) Мне і крыць няма чым, апрача як... (*Цмокнуў дзяўчыну ў шчаку.*)

**Жэня.** І ўсё, што ты меўся сказаць мне?

**Вася.** Ну. А што?

**Жэня.** Нічога. Я думала...

**Вася.** А ты думала, мусіць, я пра вяселле наша выпалю? Дык ты ж малая яшчэ, падрасці хоць крыху раней.

**Жэня.** Карбюратар ты ржавы! Ты спытаў бы наперад, ці пайду я за цябе, развінчанага?

**Вася.** А дзе ж ты дзенешся? Ваша ж дзявочая доля такая: бяруць — ідзі, абмінаюць — сядзі.

**Жэня.** Бывае і наадварот: браў бы, ды рукі кароткія.

**Вася.** Гэта бывае рэдка, як град улетку. (*Смяецца.*)

**Дзяўчына.** Ды перастаньце вы, давайце лепш песню заспяваем.

*Гучыць песня «Сена маладое».*

**Жэня.** Слухайце, штосьці мы засядзеліся. Давайце ў «Яшчара» пагуляем.

**Сымоніха.** Лявоніха, давай і мы з табой з моладдзю пагуляем.

Фанты:

— расказаць гумарэску,

— загадаць загадкі,

— правесці гульню «У пеўніка»,

— выканаць песню «Ой, у полі тры крынічанькі».

Загадкі:

1. Ад чаго ў вуткі ногі чырвоныя? (*Ад каленяў.*)
2. Без чаго хаты не пабудуеш? (*Без стуку.*)
3. Чаму купляюць чобаты? (*Бо дарма не даюць.*)

Гумарэска «Госці ў хату» (*з мясцовага*).

Пазайздросціў як каму,
Пажадай у злосці:
Хай часцей тады к яму
Прыязджаюць госці.
Пакаранне гэта ўсім —
Горшага не трэба,
Не адбудзеш тут тым-сім,
Агурком ды хлебам.
Трэба масла, трэба сала,
Яшчэ сыр і кумпякі,
Памідоры каб стаялі.
Будзе во расход які!
Госці ў хату — сустракай,
Кланяйся, круціся.
Раздзявацца запрашай
І ў душы маліся:
«Божа мілы, памажы
І прыдай мне сілы!»
Гасцям ласкава кажы:
«Дзякуй, не забылі!»
Наразай хутчэй ім сала,
І кумпяк, і каўбасу,

«Ешце, госці, будзе мала,
Дык яшчэ я прынясу».
Сунеш ім пад нос талеркі,
Мо далёка хто сядзіць,
Бегаеш ды мітусішся,
Каб гасцям хоць дагадзіць.
Госці п'юць, ядуць удала,
Напаўняюць сабе рот.
«Яшчэ нам не памяшала б,
Каб прынесла нам кампот». —
«Ён стаіць зусім тут блізка,
Мігам вам я прынясу». —
«Ды збірай пустыя міскі,
Наразай больш каўбасу...»
Я спужалася, не бачу,
Што паелі на стале,
У душы хаджу і плачу:
«За што кара гэта мне?»
З'елі госці сала, рыбу,
І салат, і халадзец.
Валасы аж сталі дыбам:
«Божа мілы, дзе ж канец?»
Халадзільнік адчыняю
І шукаю, што падаць.
Госці ж нават не зважаюць,
Як сядзелі, так сядзяць.
Позна сталі апранацца,
Я кажу: «Прабачце нас,
Рэдка сталі навядацца,
Заязджайце кожны раз!..»

**Дзяўчына.** Мае вы мужчыначкі,
Навіну скажу вам:
Сівая свіння
На дубе гняздо звіла,
Казлянятак прывяла.
А мой мужык хітры быў,
Сена шылам накасіў,
Пад прыпечкам стог злажыў,
Кошку сенам накарміў.

**Хлопец.** Вось знайшла навіну!
Калі я жыў у Маркавічах,
Дык начаваў я у Мятлавічах.
Там дзіковіна была:
Курачка бычка прывяла.
Парасёначак яйка знёс,

На высокую палічку ўзнёс,
А палічка зламалася
Ды яечка разбілася.

**Дзяўчына.** А ў нашага суседа
Учора была бяседа:
Свіння ў дуду іграла,
А курыца скакала,
А пятух прыпяваў
І ножачкай прыбіваў.

**Хлопец.** А што гэта за чутка была,
Ды што курачка бычка радзіла,
Парасёначак яечка знёс,
А бязрукі яечка ўхапіў
Ды голаму за пазуху заклаў.
А бязногі іх пабег даганяць,
А сляпы на старожках стаяць,
А глухі стаў падслухваць,
А нямы закрычаў: «Каравул!»

*Чуваць галасы: «Сымон, выганяй!», «Ганна, праспала!». Кукарэкае певень, мычыць карова.*

**Госці.**

— Во загуляліся, засядзеліся. Світаць пачынае. Кароў выганяюць.

— Дзяўчаты, а ў мяне ёсць для вас сакрэт. Дзед Ахрэм запрашае заўтра на танцы ў сваю хату. Згодны?

— Згодны! Згодны!

— Тады заўтра працягнем свае забавы.

— Бывайце!

— Бывайце!

*Разыходзяцца пад песню «Колькі ў небе зор» (гл.* Дадатак).

## «Няма смачней вадзіцы, як з роднай крыніцы»

Прапанаваныя ў сцэнарыі матэрыялы накіраваны на развіццё творчых здольнасцей канкрэтнай асобы. Дамінуючым у ім з'яўляецца асобасна-арыентаваны падыход.

Знітаванасць фальклору і сучаснай літаратуры і музыкі дазваляе фарміраваць у вучняў цэласнае ўяўленне пра нацыянальнае мастацтва. Такія святы варта праводзіць як з мэтай выяўлення, падтрымкі і развіцця маладых талентаў, так і з мэтай прапаганды беларускай культуры.

### *Методыка правядзення*

*Зала ўпрыгожана беларускімі ручнікамі, гучаць грамзапісы беларускіх народных песень.*

**Марыля.** Добры дзень, шаноўнае спадарства! Віншую ўсіх вас са святам! Бо кожная з вамі сустрэча — гэта свята.

**Васіль.** Але ж я нешта не бачу нашых гаспадынь, якія запрасілі нас сюды. Мабыць, яны не дагаворацца ніяк, да каго першага ісці нам у госці. А вось і яны.

**Куліна.** Спачатку да мяне пойдзем. У мяне хата большая.

**Агата.** Затое я з самага ранку сваю печ выпаліла хораша, а ў цябе такі холад, што хоць ваўкоў ганяй.

**Куліна.** Ты толькі языком балбатаць умееш! Пра такіх у нас кажуць: «Параска, Параска, у языку ў цябе траска!»

**Агата.** Пра такіх разумных, як ты, кажуць: «Гром грыміць, зямля трасецца, Дуня з торбаю нясецца!»

**Марыля.** Шаноўныя гаспадыні, супакойцеся, калі ласка, ды павітайцеся з гасцямі. Аб чым гэта вы спрачаецеся?

**Куліна.** Добры дзень, госцейкі дарагія!

**Агата.** Добры дзень! Мы зусім не спрачаемся. Пойдзем, даражэнькія, пойдзем хутчэй да мяне.

**Куліна.** Бач ты яе! Першая яна хоча быць! Спачатку да мяне. Запрашаю, шаноўныя! Бо гэта ж балбатуха і прывітаць як след гасцей не можа, а ўсюды хоча быць першай.

**Марыля.** Чакайце, чакайце, даражэнькія! Зноў вы за сваё. А вось мы зараз пабачым, хто з вас самы гаваркі. Як кажуць, даведаемся, у каго язык лепш падвешаны.

**Васіль.** Цётачкі! Не трэба сварыцца. Свае здольнасці вы яшчэ на працягу вечара паказаць паспееце, а каб нікога не пакрыўдзіць, застанёмся мы ўсе тут ды і будзем разам весяліцца. Ці не так я кажу?

**Агата.** А што? Можа, і праўда? Але ж якое гэта свята без песень ды без танцаў?

**Куліна.** Пачакай, мая даражэнькая. Усяму свой час. Давай лепш месца сабе знойдзем ды паслухаем, што далей будзе.

*Гучыць песня «Гуляць дык гуляць» (гл.* Дадатак*).*

**Марыля.** Паважаныя сябры! Як добра, што наша песня падняла ваш настрой. І гэта зразумела. Што яшчэ можа быць бліжэй да сэрца, як родная песня!

**Васіль.** «Няма смачней вадзіцы, як з роднай крыніцы» — якія праўдзівыя гэтыя словы.

**Марыля.** Родная мова, якую засвойвае чалавек, знаёмячыся з народнымі песнямі, казкамі, гульнямі, калыханкамі, з'яўляецца тым падмуркам, на якім вырастае потым пачуццё любові да свайго краю.

*Адзін з удзельнікаў чытае верш Петруся Броўкі «Калі ласка».*

У любімай мове, роднай, наскай,
Ах, якія словы: «Калі ласка!..»
Як звіняць яны сардэчнаю струною,
Праз усё жыццё ідуць са мною.
Трапіць госць у будзень, а ці ў свята:
— Калі ласка, калі ласка, ў хату!
Не паспелі сесці пры сустрэчы,

Як патэльня засквірчэла ў печы,
Ды і чарка бліснула дарэчы.
Бульба, смажаніна і каўбаска,
Пакаштуйце, людцы, калі ласка!
Хлопец кажа дарагой дзяўчыне:
— Калі ласка! Будзеш гаспадыняй!
Эх, жыццё збудуем мы прыгожа,
Ўсе з табой нягоды пераможам.
Гром грыміць. З нябёсамі размова:
— Калі ласка, цёплы дождж вясновы!
І не вельмі буйны і не рэдкі —
На сады, на пушчы, на палеткі,
На грыбы, на ягады, на кветкі...
— Калі ласка! — наш зварот бясконцы.
Мы гаворым ранішняму сонцу:
— Калі ласка, сонца, выйдзі з хмары,
Радасцю аблашчы нашы твары,
Ты ўзнімі з сабою нашы мары!
Калі ласка!.. — нашай роднай мовы
Шчырыя і ветлівыя словы.

**Васіль.** Чуеш, Марылька, дзіцятка плача. Толькі на свет нарадзілася. Як ты думаеш, з чаго для такой малечы пачынаецца Радзіма?

**Марыля.** Я думаю, што з калыханкі матулі, гэтага першага зярняткі роднай мовы.

*Выходзіць дзяўчынка, спявае калыханку «Добрай ночы...» (гл.* Дадатак*).*

*Дзяўчынкі малодшага школьнага ўзросту выконваюць танец з лялькамі. З'яўляюцца 2 дзяўчынкі, адна пераапранута ў «мышку». Чытаюць па ролях пацешку «Мышка».*

**Дзяўчынка.** Мышка, мышка, дзе была?
**Мышка.** Была ў пана караля.
**Дзяўчынка.** Што рабіла?
**Мышка.** Лыжкі мыла.
**Дзяўчынка.** А што далі?
**Мышка.** Кусок сала.
**Дзяўчынка.** Дзе паклала?
**Мышка.** Пад лаўкаю.
**Дзяўчынка.** Чым накрыла?
**Мышка.** Халяўкаю.
**Дзяўчынка.** Дзе тое сала?
**Мышка.** Кошка з'ела.
**Дзяўчынка.** А ці ведаеце вы, сябры, што гэта мы вам зараз прачыталі?
**Дзеці.** Верш.

**Мышка.** Не. Гэта не зусім верш, гэта пацешка. Успомніце, як бабуля ці матуля пацяшалі вас ці вашых маленькіх брацікаў і сястрычак.

**Дзяўчынка.** А я таксама ведаю забаўлянку. Хто з вас, дзеці, хоча апынуцца ў дзяцінстве? (*Выходзіць на сцэну.*)

Сарока-белабока
Кашку варыла,
Дзеткам дарыла.
Гэтаму дала,
Гэтаму дала,
Гэтаму дала,
Гэтаму дала.
А ты, хлопчык, —
Вялікі гультайчык:
Вады не насіў,
Дзяжы не мясіў.
Злыя каўкі прыляцелі,
Тваю кашку з'елі
І шух-шух — паляцелі.

**Мышка.** Вось бачыце, якія мы весялухі. А яшчэ мы вам і паспяваем.

*Гучыць песня «Пра добрую мышку і мудрую кошку» (гл.* Дадатак*).*

**Агата.** Слухай, сяброўка, я ўчора свайго ўнука да лагапеда запісала.

**Куліна.** А што ён там рабіць будзе? Гэта што, такі від транспарту: мапеда, веласіпеда, лагапеда?

**Агата.** А вой, Куліначка, якая ты цёмная. Лагапед — то ж спецыяліст, які вучыць дзяцей правільна вымаўляць гукі.

**Куліна.** А што ты думаеш, усе так добра ўмеюць іх вымаўляць?

**Агата.** Дзіва што ўмеюць.

**Куліна.** Давай заспорым на тваю квактуху чорненькую, што не. (*У залу.*) Ідзі сюды, галубочак.

*Праводзіцца гульня ў скорагаворкі.*

1. Уцякай, цецеручыха з цецеручанятамі.
2. Мы відзелі бабра, і сказаў нам бобра, што нам будзе добра.
3. Добры госць
Есць, што ёсць.
У благога свая чэсць:
Што ёсць — не есць.
4. Цвыркун на скрыпачцы
Цвіркоча
У кутку пад печчу
Летняй ноччу.
5. Скача чапля па балоце,
Чачотачка — у чароце.

**Васіль.** Ці памятаеш ты, Марыся, калі ўпершыню пачула казку? Хто быў тваім першым казачнікам у жыцці?

**Марыля.** Як жа можна забыць, Васілёк, матуліны казкі? Дзе яшчэ можна навучыцца распазнаваць дабро і зло, праўду і крыўду, справядлівасць і жорсткасць, як не на яркіх казачных вобразах, увасобленых і ў людзях, і ў жывёлах, і ў розных пачварах, страшыдлах.

**Васіль.** Чалавеку патрэбна не слава,
А людская увага і ласка,
І сардэчнае шчырае слова,
І вясёлая добрая казка.

*З'яўляецца Дзед Барадзед. Ён выконвае песню «Дзед Барадзед» (гл. Дадатак), а затым дзеці паказваюць казку «Мужык і Жонка».*

*Невялікая хата з бедным сялянскім начыннем.*

**Казачнік.** Дзень добры ўсім! Вы ведаеце, хто я? Так, я Казачнік. Але на гэты раз хачу вам расказаць не казку, а сапраўдную гісторыю. Дык вось слухайце. У адной вёсцы жыў Мужык з Жонкаю. І быў гэты Мужык вельмі нялюдскі: заўсёды шукаў прычыну, каб пасварыцца з Жонкаю. А што было далей — глядзіце самі.

*Выходзіць. Заходзяць Мужык, потым Жонка.*

**Мужык** (*крычыць на Жонку*). Гультайка ты, я адзін усё раблю: і ару, і сею, і кашу, а ты нават палудзень лянуешся прынесці мне ў поле!

**Жонка** (*апраўдваючыся*). Вазьмі яду з сабою, бо мне няма калі насіць табе палудзень — дома многа работы.

**Мужык** (*раздражнёна*). Якая ў цябе дома работа? Яе гуляючы можна зрабіць. Спіш тут, мусіць, цэлымі днямі!

**Жонка** (*спакойна*). Вось і зрабі ўсё гуляючы, а я замест цябе ў поле пайду.

**Мужык** (*узрадавана*). Нарэшце! Хоць зведаеш, што ў полі працаваць — гэта не гаршкі ў печы перастаўляць.

**Жонка** (*завязваючы хустку*). Ты ж глядзі, каб усю работу дома зрабіў: печ напалі, цеста замясі — рашчына ў дзяжы стаіць — ды хлеб спячы... Масла збі... яшчэ глядзі, каб авечкі ў шкоду не залезлі. А яшчэ крупнік звары... ды за квактухай сачы, каб з яек не злезла, бо ахалодаюць. (*Выходзіць.*)

**Мужык** (*наўздагон жонцы*). Я не толькі ўсё перараблю, а яшчэ і выспацца паспею, пакуль ты вернешся! (*Прывязвае да пояса бойку са смятанай і пачынае мясіць у дзяжы цеста.*) Вось як працаваць трэба: я буду цеста мясіць, а масла само саб'ецца. Я ж не дурны, каб кожную работу паасобку рабіць!

*З двара чуюцца крыкі дзяцей.*

**Дзеці.** Дзядзечка, дзядзечка! Вашы авечкі ў нашым жыце пасуцца!

**Мужык.** Ах, каб іх ваўкі пахваталі! (*Ірвануўся бегчы, спатыкнуўся аб бойку і грымнуўся вобземлю. Вечка з бойкі выскачыла, смятана разлілася. Ускочыў на ногі, бегае разгублена па хаце, рукамі размахвае. Курыца спалохана саскочыла з яек і пабегла з хаты.*) Яйкі ахалодаюць — кураняты не выведуцца. Прыйдзецца самому сесці, пакуль квактуха вернецца. (*Садзіцца на рэшата.*)

*У хату ўваходзіць Гайдук.*

**Гайдук** (*да Мужыка*). Чаго ты на рэшата ўсеўся, ёлупень?

**Мужык.** Куранят выседжваю. Жонка пайшла сена касіць, а я гаспадарыць застаўся. Ды вось квактуха збегла... я сеў, каб яйкі не ахалодалі.

**Гайдук** (*рагоча*). Ах ты, баран бязглузды, ах, гультаюга! Жонку касіць заставіў, а сам куранят выседжвае! (*Раскручвае бізун і хвошча ім Мужыка.*)

*Баронячыся ад бізуна, Мужык падушыў яйкі, потым саскочыў з рэшата і схаваўся ў вялізным карабе, дзе было пер'е.*

**Гайдук** (*чэрпае кубкам ваду і п'е*). Цьфу, абібок, нават вады свежай з калодзежа не прынёс. Цёплая, як памыі. (*Кідае зневажальны позірк на Мужыка і выходзіць.*)

*У хату заходзяць госці — Дзед і Баба, жончыны бацькі.*

**Баба** (*непрыемна ўражаная*). Ой-ёй! Што тут робіцца! Я і не думала, што наша дачка такая неахайніца. Дзіва што зяць сварыцца з ёю.

**Дзед** (*сцвярджальна ківае галавой*). Так, так, праўду кажаш, Баба. Не заслугоўвае яна нашага гасцінца. А ведаеш... Давай аддамо яго зяцю.

*Мужык высунуў ускалмачаную галаву з кораба, каб паглядзець, які гасцінец прывезлі цесць з цешчаю, нязграбна павярнуўся, грымнуўся вобземлю разам з корабам, увесь у пер'і, і спалохана пазірае на гасцей.*

**Баба** (*хрысцячыся*). Чорт, чорт! Уцякайма!

**Дзед** (*бярэ качаргу*). Не-е, даражэнькая. Перш я адваджу гэтага нячысціка ад даччынай хаты. (*Дубасіць зяця.*) Бач, панадзіўся куды хадзіць! Вон адсюль! І каб духу твайго тут не было!

*Мужык, баронячыся, уцякае з хаты. Зморaны Дзед садзіцца на лаву. Да яго падыходзіць Баба і садзіцца побач.*

**Баба.** А яшчэ кажуць, што чэрці толькі ў казках бываюць... (*Гладзіць Дзеда.*) Стаміўся.

**Дзед** (*перабівае Бабу*). Стакveля гадоў пражыў, у лес на дзікоў хадзіў, на начлег коней вадзіў, на балоце сена касіў, а чорта сустрэў — у даччынай хаце!

*Вярнулася з поля Жонка, заходзіць у хату. Радуецца, убачыўшы гасцей.*

**Жонка** (*цалуецца з Дзедам і Бабай*). Татачка, мамачка, як я рада, што вы прыехалі! А дзе ж Мужык? Чаму вы адны?

**Баба** (*задаволена*). Мужыка твайго мы не бачылі, а вось чорта выгурылі з вашае хаты!

**Жонка** (*здзіўлена*). Чо-о-рта? Якога чорта?

**Дзед.** Ды таго ж самага, што жыццё вам псаваў, сварыў вас. Я яму так надаваў, што больш ён не паткнецца сюды!

**Жонка.** Дык растлумачце ж мне, што тут адбылося без мяне. Я нічога не разумею.

**Баба.** Хадзем, хадзем. Усё табе раскажу па парадку.

*Садзяцца ўсе каля стала, і Баба нягучна пачынае нешта расказваць. У гэты час на сцэну выходзіць Казачнік.*

**Казачнік.** І сапраўды, зажылі з тае пары Мужык з Жонкаю ў згодзе на радасць і Бабе, і Дзеду, і ўсім суседзям. Яны і сёння жывуць душа ў душу. Мужык поле арэ, жыта сее, сена косіць. Жонка пірагі пячэ, абеды смачна гатуе. Заходзьце, і вас пачастуе!

**Марылька.** Ад нашых родных матуль мы пачулі шмат пястушак, забаўлянак, калыханак, добрых, цікавых казак. І за гэта вялікае дзякуй, нізкі паклон вам, нашы любыя.

**Васіль.** Прыміце ад нас калыханку.

*Гучыць песня «Калыханка маме» (гл.* Дадатак*).*

**Васіль.** Слухай, Марылька, што табе больш падабаецца: легенды ці народныя песні? Мне асабіста легенды.

**Марыля.** А я вось песні слухала б і слухала, бо лічу, што народная песня — узор высокай прыгажосці.

**Васіль.** Песні песнямі, а вось легенды — гэта жывая народная энцыклапедыя. Менавіта з легенд чалавек пазнае, як узніклі гарады, з'явіліся кветкі, назвы рэк.

**Марыля** (*перабіваючы*). Як нам песень не складаць,
Як нам звонкіх не спяваць —
Словы ў сэрцы самі льюцца,
Праўдай ў людзях аддаюцца.

**Васіль.** Ах, Марылька, не разумееш ты мяне. Пайду пашукаю сваю кветку шчасця.

**Марыля.** Што ты, Васілёк, нашто нам спрачацца. Даволі часта песні і легенды жывуць разам. Вось глядзі.

*Прыцемкі. Сярод сцэны папаратнік і ў ім пунсовая кветка.*

**Хлопец.** Сёння апоўначы расцвітае кветка папараці. Хто сарве гэту кветку і будзе насіць пры сабе, той стане шчаслівым і багатым, атрымае ўсё, чаго захоча.

**Дзяўчына.** Знайсці яе можа толькі спрытны і вельмі смелы чалавек, бо, як распускаецца кветка, падымаецца навальніца, б'е маланка, весяляцца нячысцікі.

**Хлопец.** Калі ўбачыш «агністую» кветку і імкнешся дакрануцца да яе, то паказваюцца розныя страшыдлы.

**Дзяўчына.** Калі ўдасца сарваць яе, то трэба ісці дадому, не азіраючыся і не звяртаючы ўвагі ні на што: ні на пагрозы, ні на абяцанкі злых духаў. Прымусяць азірнуцца назад, і тады кветка адразу знікне.

*Дзяўчына і Хлопец, узяўшыся за рукі, ідуць па папараць-кветку. Выконваецца карагод «Купалінка» (гл.* Дадатак*). Выбягае Хлопец на сцэну, махае рукой і кліча сваіх сяброў.*

**Хлопец.** Гэй, Саўка, Мішка, Грышка і Цімох, хутчэй на сцэну, пакуль не занялі. (*Выходзяць хлопцы.*)

**1-ы хлопец.** Чаго ты крычыш, куды ты спяшаешся? Дай з людзьмі прывітацца, прыгожым дзяўчатам на вочы паказацца.

*Усе вітаюцца, нізка кланяюцца.*

**2-і хлопец.** Мы прыехалі з Аўцюкоў, прывезлі жартаў сем вазоў. Пачынай, Саўка.

*Хлопцы па чарзе расказваюць жарты.*

### Ёсць і гэткая

Старая бабуля прыйшла маліцца ў царкву зімою. А з носа цячэ. Яна пытае ў мужчын:

— Як гэта ікона завецца? Я б хацела ёй памаліцца.

А мужыкі кажуць:

— Баба, утры нос!

Баба хрысціцца і кажа:

— Прысвятая утрыносіца, памілуй мяне.

## Добра адказаў

Пытаецца дзед у бабы:

— Калі я памру, што ты на мяне адзенеш?

— Куплю сіні дарагі касцюм, — адказвае баба.

Дзед думае: «Дай жа я праверу». Узяў і прытварыўся мёртвым.

Паплакала баба, паплакала ды пайшла ў магазін глядзець, што купіць, каб дзеда адзець. Прыйшла, паглядзела — усё дарагое. Тады яна падумала: «Што ж дарагое купляць — усё роўна згніе», — і купіла спартыўны касцюм і кеды. Адзела дзеда, села каля яго і плача:

— Куды ж ты, мой дзедухна, сабраўся?

А дзед устае і кажа:

— На стадыён у футбол гуляць.

## А завілюшачкамі

Жылі дзед і баба. Дужа добра жылі. Аднойчы баба кажа дзеду:

— Вытапі лазню.

Вытапіў дзед лазню. Потым баба зноў загадвае:

— Размяці сцежку ад снегу, ды не абы-як, а завілюшачкамі, і добра венік распар.

Зрабіў і гэта дзед. Памылася баба ды крычыць:

— Ідзі папар мяне, ну, скарэй ідзі, стары чорт!

Прыйшоў дзед і пачаў парыць — біць бабу камлём. Выскачыла баба і напрамкі да хаты. А дзед уздагон ёй:

— А завілюшачкамі, а завілюшачкамі!

## Як упартая жонка сваё даказала

Была ў мужыка жонка. Звалі яе Васілісай. І надта ўжо яна была праціўнай: што ёй муж ні скажа — усё яна робіць наадварот. І вось мужык надумаў яе правучыць.

— Ты ж хоць па балоту, Васіліска, не хадзі, — кажа муж.

— А вось і пайду!

— Дык хоць па кладках ідзі.

— А вось і не пайду!

— Ну, дык хоць камення не бяры з сабой.

— Вось і набяру!

Набрала камення поўны мех ды пайшла па балоце. Дык толькі яе і бачылі.

## Бравы салдат

Жыла ў адной вёсцы лянівая сям'я. Была ў іх каза. І вось дамовіліся яны так: хто першы загаворыць, той павядзе пасвіць казу.

Вось зайшоў да іх у хату аднойчы салдат, папрасіў паесці. Маўчаць. Салдат быў не з баязлівых, дастаў з печы жараную курыцу і з'еў яе. Потым

убачыў прыгожую дзеўку і хацеў загаварыць з ёй. Маўчыць дзеўка. Ён пацалаваў яе, а яна ўсё адно маўчыць. Глядзіць салдат — на сцяне вісіць хромавая тужурка. Узяў салдат яе — ды за дзверы. Тут гаспадар не вытрымаў: «Гэй, зладзюга, стой! З'еў курку, пацалаваў Нюрку і хочаш украсці маю тужурку!»

Прыйшлося гаспадару казу ў поле весці.

**3-і хлопец.** Хлопцы, ой, нагаварылі абы-чаго, трэба ўцякаць хутчэй.

**4-ы хлопец.** Куды ж уцякаць, яшчэ ж дзяўчаты нашы будуць спяваць.

*Інсцэніроўка песні «Касіў Ясь канюшыну» (гл. Дадатак).*

**5-ы хлопец.** Эх, браточкі, гуляць дык гуляць! Паспявалі, трэба і патанцаваць.

*Выконваецца танец «Кадрыля».*

**Куліна.** Слухай, Агатачка, як ты за свайго Хвядоса замуж ішла?

**Агата.** Як, як? Як браў, так і пайшла.

**Куліна.** А як жа ты даведалася, ці разумны ён?

**Агата.** З разумнай жонкай і дурань паразумнее.

**Куліна.** А вось у нас з Міканорам усё было, як у той казцы.

**Агата.** У якой яшчэ казцы?

**Куліна.** Ты што, не ведаеш? Паехаў раз царскі сын на паляванне ды заблудзіўся ў лесе. Цэлую ноч блукаў, толькі пад раніцу натрапіў на вёску. Завярнуў ён да адной хаты, зайшоў у дзверы. З-за кроснаў устала дзяўчына.

**Дзяўчына.** Дрэнна, калі двор без вушэй, а хата без вачэй.

**Царэвіч** *(убок)*. Што гэта яна загадкавае сказала? Мо не пры сваім розуме? *(Да дзяўчыны.)* Адна жывеш ці бацькі ёсць?

**Дзяўчына.** Бацькі пайшлі ў пазыку плакаць, а брат пагнаў сто рублёў на пятак мяняць.

**Царэвіч.** Нічога не разумею. (*Убок.*) Якая прыгожая! Белы свет абыдзі — такой не знойдзеш. Толькі пра што яна сказала? *(Да дзяўчыны.)* Што гэта ты сказала пра двор без вушэй і пра хату без вачэй? Я не зразумеў.

**Дзяўчына.** А што тут дзіўнага! Ты не здагадаўся, што вушы двара — сабака! Каб ён быў у двары, то забрахаў бы на цябе, а я ведала б, што хтосьці чужы ідзе. Вось табе і двор без вушэй. А хата без вачэй — гэта хата без дзяцей. Каб былі ў сям'і дзеці, яны б праз акно ўбачылі чужога чалавека і сказалі б пра гэта.

**Царэвіч.** Ну а пра бацькоў і брата што сказала?

**Дзяўчына** (*убок*). Ой, які бесталковы, нездагадлівы, нібы нежывы! (*Да царэвіча.*) Бацькі пайшлі ў пазыку плакаць, бо пайшлі яны на могілкі, на пахаванне суседа. А калі самі памруць — тады добрыя людзі прыйдуць іх пахаваць ды плакаць. Брат пагнаў сто рублёў на пятак мяняць — гэта паляванне, бо брат на сторублёвым кані ганяе зайцоў. Упалюе зайцоў — прыбытку на пятак, а каня загоніць — страты на сто рублёў.

**Царэвіч.** Такой разумнай і прыгожай дзяўчыны я не сустракаў. Ажанюся толькі з ёй.

*Бяруцца за рукі і сыходзяць са сцэны.*

**Агата.** Вось якую прыгожую гісторыю даносіць казка. Але ж у нашым жыцці яшчэ і сёння ў многіх беларускіх вёсках застаўся вясельны звычай: перш чым сесці поруч з маладой, малады павінен разгадаць загадкі сваякоў сваёй будучай жонкі.

**Куліна.** А давай праверым зараз, ці кемлівыя нашы гледачы.
Вось вам загадкі з роднай хаткі.

1. Дзве дачкі, дзве маці і бабулька. Колькі іх? (*Бабуля, маці, дачка.*)
2. Не разаб'еш гаршчочка — не з'ясі і кашы. (*Яйка.*)
3. Поўная бочка круп, а наверсе струп. (*Мак.*)
4. Хата рагата, вокан багата. Як улезеш — не вылезеш. (*Нерат.*)
5. Вечарам нараджаецца, ноч жыве, а раніцай памірае. (*Месяц.*)
6. Крыкнуў вол на сто азёр, на сто міль, на ўвесь мір. (*Гром.*)
7. Ехаў камісар, на акне ўзор напісаў. (*Мароз.*)
8. Малы малышак упаў з вышак, сам не разбіўся, толькі шапачкі пазбыўся. (*Жолуд.*)
9. Твар пахучы, хвост калючы. (*Ружа.*)
10. Круглае, гарбатае, вакол лахматае, па баках белае, а ўсярэдзіне чорнае, як прыйдзе бяда — льецца вада. (*Вока.*)

**Марыля.** Слухай, Васілёчак, мне здаецца, што наш фестываль будзе не зусім цікавы, калі на ім не прагучаць сучасныя беларускія эстрадныя песні.

**Васіль.** Так, так. Я поўнасцю з табой згодзен. Таму з вялікім задавальненнем уступаю сцэну юным талентам.

*Гучаць песні «Сцежачка», «Каля ружаў на стале» (гл.* Дадатак*).*

**Марылька.** Як усё-такі добра, Васілёк, што мы нарадзіліся з табой у такой прыгожай краіне з такой дзіўнай назвай — Белая Русь, сярод такога здольнага народа.

**Васіль.** І пакуль будзе жыць наш народ, датуль будзе заварожваць нашу душу бабульчына казка, матуліна песня, весяліць наша сэрца вясёлы танец і трапны жарт.

*Гучыць музыка «Аве Марыя». Вядучыя чытаюць вершы Я. Купалы са свечкамі ў руках.*

**Васіль.** Я буду маліцца і сэрцам, і думкамі,
Распетаю буду маліцца душой,
Каб чорныя долі з мяцеліцаў шумамі
Ўжо больш не шалелі над роднай зямлёй.

**Марыля.** Малюся я небу, зямлі і прастору,
Магутнаму Богу — ўсясвету малюся,
Ва ўсякай прыгодзе, ва ўсякую пору
За родны загон Беларусі.

# Беларускія народныя песні

## КАСІЎ ЯСЬ КАНЮШЫНУ




Касіў Ясь канюшыну*,
Паглядаў на дзяўчыну.

А дзяўчына жыта жала
Ды на Яся паглядала.

— Ці ты, Ясь, ці ты не,
Спадабаўся ты мне.

Кінуў Яська касіць,
Пайшоў мамку прасіць:

— Люба мамка мая,
Ажані ж ты мяне.

— Бяры тую Станіславу,
Каб сядзела на ўсю лаву.

— Станіславу не хачу,
Бо на лаву не ўсаджу.

— Дык бяры ты Яніну,
Працавітую дзяўчыну.

* Першы радок кожнай страфы паўтараецца 3 разы.

## ЯК НА РЭЧКЕ, НА МАСЦЕ...




Як на рэчке, на масце
Насця платок мыла.

Прыпеў: Чувер, мой чувер,
Чувер, на-вер-вер-вер-вер,
Яшчэ чуда-першачуда,
Чуда — родзіна мая*.

Яна мыла, й паласкала,
Й на ваду яго пускала.

З-пад гарушачкі крутой
Шол Ванюшка маладой.

Шол Ванюшка маладой,
Нёс вуселькі пад палой.

Нёс вуселькі пад палой
І гітару пад рукой.

Стал Ванюшачка іграць,
Стала Насця танцаваць.

Стала Насця танцаваць,
Увідала яе маць.

Ой, ты, маменька мая,
Не ругайся на меня.

Было мяне тагда учыць,
Як я маленька была.

А цяпер я вяліка,
Старайцеся жаніха.

Ні старога, ні малога —
Парнішачку маладога.

* Прыпеў паўтараецца пасля кожнай страфы.

## АРЭ ПРЫМАК, АРЭ ПРЫМАК...




Арэ прымак, арэ прымак,
На свет паглядае,
Усе жонкі нясуць есці,
А маёй немае*.

—Я прынесла, прамачэнька,
Боршча з лебядою,
Не хоч боршча з лебядою —
Еш хлеб із вадою.

Не хоч боршча з лебядою —
Еш хлеб із вадою.
Запрагай жа сівы валы
Ды язджай дадому.

Едзе прымак, едзе прымак
І ў дудачку грае,
Як зачула цешча зяця,
Абед налівае.

Ды не ўспеў жа прымачэнько
З воза ізлезці,
Яму цешча загадала:
— Нясі свінням есці!

— Бадай свінні паздыхалі,
А хата згарэла!
Як жа мне гэта прымацкая
Жызня надаела!

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца.

## ОЙ, ХАЦЕЛА Ж МЯНЕ МАЦІ...




Ой, хацела ж мяне маць
Ды за першага аддаць.
А той первы,
Первы, няверны, —
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маць
Ды за другога аддаць.
А той другі
Ходзіць да падругі, —
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маць
Ды за трэцяга аддаць.
А той трэці,
Як у полі вецер, —
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маць
За чацвёртага аддаць.
Той чацвёрты —
Ні жывы, ні мёртвы, —
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маць
Ды за пятага аддаць.
А той пяты —
П'яніца пракляты, —
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маць
Ды за шостага аддаць.
А той шосты —
Малы, недарослы, —
Ой, не аддай мяне, маць!

Ой, хацела ж мяне маць
Ды за сёмага аддаць.
А той сёмы —
Прыгожы ды вясёлы...
Ён не схацеў мяне ўзяць!

## ОЙ, ЛЯЦЕЛІ ГУСІ З БРОДУ

**Рухава**




Ой, ляцелі гусі з броду,
Скалацілі ў рэчцы воду.
Пакуль вада чыста стала,
Я з Раманам пастаяла.

— Раман, Раман, Раманіку,
Пусці мяне дадоміку.
Я не родну маці маю,
Будзе біці, добра знаю.

Будзе біці, шчэ й караці,
Яшчэ й шэльмай называці.
— Дзе ты, шэльма, валачылась,
Што й вячэра ўжо зварылась?

— Табе, маці, прызнаюся,
Што з Раманам кахаюся.
Ён чарнявы, я бялява —
Будзе пара кучарава.

Ён багаты, а я бедна —
Будзе пара адпаведна.
Ой, ляцелі гусі з броду,
Скалацілі ў рэчцы воду.

## ОЙ, ЧЫЯ Ж ТО НІВА, ЧЫЕ Ж ТО ПАКОСЫ?




Ой, чыя ж то ніва, чые ж то пакосы?
Ой, чыя ж то ніва, чые ж то пакосы,
Чыя ж то дзяўчына распусціла косы?*

Гэта ж мая ніва, то ж мае пакосы.
Гэта ж мая ніва, то ж мае пакосы,
То ж мая дзяўчына распусціла косы.

Выпраўляла маці сына ў салдаты.
Выпраўляла маці сына ў салдаты,
Нялюбу нявестку ў поле лёну рваці.

— Як не вырвеш лёну, то не йдзі дадому.
Як не вырвеш лёну, то не йдзі дадому,
Стань у чыстым полі да й тапаліною.

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца.

Рвала яна, рвала, рвала недарвала.
Рвала яна, рвала, рвала недарвала,
Да й у чыстым полі тапалёю стала.

Адзін год праходзіць, другі наступае.
Адзін год праходзіць, другі наступае,
На трэці гадочак прыходзіць сыночак.

— Маці, мая маці, што ж то за навіна?
Маці, мая маці, што ж то за навіна,
Што на нашым полі расце тапаліна?

— Не пытайся, сынку, пра тую навіну.
Не пытайся, сынку, пра тую навіну,
На, бяры сякеру, рубі тапаліну.

Адзін раз ударыў — яна нахілілась.
Адзін раз ударыў — яна нахілілась,
Другі раз ударыў — яна папрасілась.

— Не рубай, казача, я твая дружына.
Не рубай, казача, я твая дружына,
Пашукай у лісці — там твая дзяціна.

— Маці ж, мая маці, што ты нарабіла?
Маці ж, мая маці, што ты нарабіла,
Што мяне з мілою навек разлучыла?

## САБІРАЙСЯ Ў ГОСЦІ, МОЙ ДЗЯДОК



— Сабірайся ў госці, мой дзядок,
Сабірайся ў госці, галубок.
— Не пайду у госці — холад на двары,
А мне ломіць косці, я ж ужо стары.

— Сабірайся ў госці, мой дзядок,
Сабірайся ў госці, галубок.
— Не пайду у госці, я ж табе кажу,
Лепш на цёплай печы трохі паляжу.

— Як не пойдзеш ў госці, грошай дай:
Трэба ж мне занесці каравай.
— Бяры сабе грошы, — ці мне іх шкада?
Толькі адчапіся ад мяне, бяда!

— Дык ляжы на печы, стары дзед!
А мяне у госці павядзе сусед.
— Пачакай, Ганулька, не спяшай:
Пойдзем разам ў госці, мяне не кідай!

## А Ў ПОЛІ ВЯРБА




А ў полі вярба
Нахілёная,
Маладая дзяўчынонька
Заручоная.

Заручоная
І запітая.
Тады яе запівалі,
Як сад зацвітаў.

Як сад зацвітаў,
Як зара ўзышла,
Маладая дзяўчыначка
Па ваду ішла.

Кася ад вады,
Яся да вады:
— Пастой, пастой, мая Кася,
Дай каню вады.

— Як буду твая,
Напаю каня,
З зімняе крынічэнькі,
З поўнага вядра.

## ОЙ, АРАЛІ ХЛОПЦЫ НІВУ




Ой, аралі хлопцы ніву,
Паламалі ярмо*.
Заплаці ты мне, дзяўчына,
Што я хадзіў дармо.

А я ж табе, мой міленькі,
Плаціла, плаціла.
Цалаваў маё лічэнька,
Я не пярэчыла.

То пры сонцы, то пры зорцы,
То пры месячыку.
Цалаваў ты ночкай цёмнай,
Любы казачэнька.

Бадай кветкі пазасыхалі,
Што рана расцвілі.
Бадай людзям мову адняла,
Што нас разлучылі.

Ой, аралі хлопцы ніву,
Паламалі ярмо.
Хадзіў, хадзіў да дзяўчыны,
Аказалася дармо.

---

* Два першыя радкі кожнай страфы паўтараюцца два разы.

# МАМАЧКА РОДНА, ПУСЦІ НА СЯЛО




Мамачка родна, пусці на сяло.
Дзеўкі гуляюць, ім весяло.
Адзін я гуляў па зялёным саду.
Думаў, на вуліцу век не пайду*.

А цяпер бягу я, аж пяткі гараць,
Так мне, маладому, хочацца гуляць.
Пайду я на вуліцу, дзеўкам падпяю
Ды пагляджу на Манечку любую сваю.

---

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца два разы.

Мамачка, чуеш, сэрца пяе,
А там, за гарою, пляска ідзе.
Мамачка, чуеш, салавей пяе,
А там, за гарою, пляска ідзе.

Песні галасныя весела пяюць,
Мне, маладому, спаць не даюць.
Мамачка, родна, пусці пагуляць,
Мне ж, маладому, не хочацца спаць.

## ДЗЕ МАЯ МАРУСЯ?




Быў у мяне сівы конь
Ды новыя скаты.
У суседняе сяло
Я паехаў ў сваты.

Прыпеў: А я ўсё дзіўлюся,
Дзе мая Маруся?
А я ўсё дзіўлюся,
Дзе ты, мая Маруся?

Як прыехаў я ў сяло,
Там старая хата.
Стара баба, стары дзед
Ды дзеўка гарбата.

Прыпеў.

Запрасілі тут за стол,
Прыгадалі сесці.
Заставілі барабулю
З мундзірамі есці.

Прыпеў.

А я тую барабулю
Па стале качаю,
На паліцы паляндрыцы,
На іх пазіраю.

Прыпеў.

Прытаміліся усе
Ды палеглі спаці.
Я ж за тыя паляндрыцы
Ды давай ўцякаці.

Прыпеў.

Як пабег я уцякаць
Ды праз агароды.
Заблытаўся ў гарбузах,
Нарабіў я шкоды.

Прыпеў.

Дагнаў мяне стары дзед
Ды у пералаза.
Па спіне даў качаргой
Аж чатыры раза.

Прыпеў.

## А Я Ў ПЕЧЫ НЕ ПАЛІЛА

**Умерана скора** ♩ = *116*






— А я ў печы не паліла, мілы мой, міленькі,
А я есці не варыла, голуб мой сівенькі.
— Запалі, міла, навары, міла,
Запалі, о-ха-ха, чарнабровая мая!*

— Я цябе не буду слухаць, мілы мой, міленькі,
Я цябе не буду слухаць, голуб мой сівенькі.
— Я наб'ю, міла, я наб'ю, міла,
Я наб'ю, о-ха-ха, чарнабровая мая!

— Ой, не маю я здароўя, мілы мой, міленькі,
Ой, не маю я здароўя, голуб мой сівенькі.
— Памірай, міла, памірай, міла,
Памірай, о-ха-ха, чарнабровая мая!

— Дзе ж ты мяне пахаваеш, мілы мой, міленькі,
Дзе ж ты мяне пахаваеш, голуб мой сівенькі?
— Пад гарой, міла, пад гарой, міла,
Пад гарой, о-ха-ха, чарнабровая мая!

— А магілу чым засадзіш, мілы мой, міленькі,
А магілу чым засадзіш, голуб мой сівенькі?
— Бур'яном, міла, бур'яном, міла,
Бур'яном, о-ха-ха, чарнабровая мая!

— Ці заплачаш на магіле, мілы мой, міленькі,
Ці заплачаш на магіле, голуб мой сівенькі?
— Засмяюсь, міла, засмяюсь, міла,
Засмяюсь, о-ха-ха, чарнабровая мая!

* Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца.

## ОЙ, У ПОЛІ ТРЫ КРЫНІЧАНЬКІ




Ой, у полі тры крынічанькі.
Любіў хлопец тры дзявічанькі:
Чарнявую, бялявую,
Трэцю рыжу кучаравую.

— Чарнявую ад душы люблю,
З бяляваю павянчаюся,
А з рыжаю кучараваю —
Прыйдзе вечар — развітаюся.

— Ці ж я табе не прыказвала,
Як стаялі над крыніцаю:
Не едзь, мілы, у далёкі край,
Бо застанеш маладзіцаю...

— Любіў цябе дзявіцаю,
Любіць буду маладзіцаю.
Датуль цябе любіць буду,
Пакуль вазьму ўдавіцаю.

Не ўсе ж тыя ды сады цвітуць,
Не ўсе разам асыпаюцца.
Не ўсе ж тыя да шлюбу йдуць,
Што любяць ды кахаюцца.

Палавіна тых садоў цвіце,
Палавіна асыпаецца.
Палавіна да шлюбу йдзе,
Што да шлюбу і не знаецца.

# КУПАЛІНКА




Купалінка, купалінка,
Цёмная ночка,
Цёмная ночка,
Дзе ж твая дочка?

Мая дочка у садочку
Ружу, ружу поліць,
Ружу, ружу поліць,
Белы ручкі коліць.

Кветачкі рвець, кветачкі рвець.
Вяночкі звівае,
Вяночкі звівае,
Слёзкі пралівае.

## Апрацоўкі беларускіх народных песень

### ОЙ, Я ЖЫТА ДЫ НЕ СЕЯЛА

Словы народныя | Музыка *Я. Навуменкі*

**Весела, хутка**



Ой, я жыта ды не сеяла,
Само яно ўсходзіць.
Ой, ды хлопцаў не любіла я,
Яны самі ходзяць.

Прыпеў: Не хадзіце, мае хлопчыкі,
Каля майго саду.
І не думайце, малойчыкі,
Што я дам пасаду.
Не хадзіце, мае хлопчыкі,
Я не ваша буду.
Я й удала, я й харошая,
Без вас перабуду.

Не для вас яе пасеяла,
Штодзень палівала,
Для таго яе пасеяла,
Каго я кахала.

Прыпеў.

Не хадзіце, мае хлопчыкі,
Каля маёй хаты.
Не тапчыце вы, малойчыкі,
Мае руты-мяты.

Прыпеў.

## ЧАМУ Ж МНЕ НЕ ПЕЦЬ...

**Беларуская народная песня**

Апрацоўка *А. Юрлова*

**Весела, бадзёра**



Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Калі ў маёй хатачцы
Парадак ідзець?

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Мушка на вакенцы
У цымбалы б'ець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Павучок на сценцы
Кросенкі снуець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Парсючок пад лаўкаю
Бульбачку грызець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Петушок на сметнічку
Зярняткі дзяўбець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Сучачка на лычку
Хату сцеражэць.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Калі ў маёй хатачцы
Парадак ідзець?

# Аўтарскія песні

## БЫВАЙЦЕ ЗДАРОВЫ

Словы *А. Русака* | Музыка *І. Любана*




Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
Ужо ж мы паедзем
Дадому, дахаты.
Ў зялёнай дуброве
Мы начаваць будзем.
Эх! Вашае ласкі
Вавек не забудзем.

У нашым калгасе
Шырокае поле,
Няхай жа на шчасце
Цвіце ваша доля!
На рэчках на вашых
Бурлілі бы воды,
Каб плавалі з крыкам
Гусей карагоды.

Каб жыта у полі
Трубою вілося,
Каб сала у хаце
Кублямі вялося.
Штодзень у капусце
Каб плавала скварка,
А к ёй, калі трэба,
Знайшлася б і чарка!

Яшчэ вам жадаем
Прыбытку у хаце,
Ні мала, ні многа —
Штогод па дзіцяці.
Не будзе вам крыўды
Яшчэ і за тое,
Калі пашанцуе
На год і па двое.

Бывайце ж здаровы,
Жывіце багата!
А мы ад'язджаем
Дадому, дахаты.

## РУЧНІКІ

Словы *В. Вярбы* — Музыка *М. Пятрэнкі*




У суботу Янка ехаў ля ракі,
Пад вярбой Алёна мыла ручнікі.
— Пакажы, Алёна, броду земляку,
Дзе тут пераехаць на кані раку?

— Адчапіся, хлопец, едзь абы-куды,
Не муці мне толькі чыстае вады.
У маркоце Янка галавой панік,
Упусціла дзеўка беленькі ручнік.

— Янка, мой саколік, памажы хутчэй,
Ой, плыве, знікае ручнічок з вачэй!
— Любая Алёнка, я вады баюсь,
Пацалуй спачатку, бо я утаплюсь.

Супыніўся гнеды пад вярбой густой,
Цалавала Янку Лена над вадой...
Стала ціха-ціха на усёй зямлі.
Па рацэ далёка ручнікі плылі.

## ГУЛЯЦЬ ДЫК ГУЛЯЦЬ

Словы *У. Някляева* Музыка *В. Іванова*




Сёння ў нашай хаце свята,
Калі ласка ў нашу хату.
Гэй, рады прыняць —
Гуляць дык гуляць!

Прыпеў: Сёння гудзе ад ранку
Ў нас гулянка,
А ўчора звячора.
З намі гуляй, хто хоча,
Хоць да ночы,
Хто адгуляў — спачывай.

Ліха з горам ды бядою
Скосім разам з лебядою.
Гэй, кінь гараваць —
Гуляць дык гуляць!

Прыпеў.

Покуль жывы ў свеце людзі,
Так ці гэтак — неяк будзе.
Гэй, жыць — не ўміраць,
Гуляць дык гуляць!

Прыпеў.

## ПОЛЬКА БЕЛАРУСКАЯ

Словы *Л. Дранько-Майсюка* Музыка *І. Лучанка*






Толькі зойдзе ў хату госць —
Будзе ўзнята чарка.
Ёсць гармонік, бубен ёсць —
Чым не гаспадарка!
І ад печы, ад сяней,
Колькі маем духу,
Мы заскачам, як раней,
Полечку-трасуху.

Прыпеў: Полька, полечка-трасуха,
Не чужая — нашая,
Абдымуха, паскакуха —
Лепшае нямашака.
Для цябе штаны малыя
І спадніца вузкая,
Паміж Польшчай і Расіяй —
Полька беларуская.
Між Літвой і Украінай —
Полька беларуская!

Там, дзе сосны, — там і лес,
Дзе парог — там ганак,
Дзе Алеся — там Алесь,
Дзе Васіль — там Ганна.
І не трэба нас вучыць,
Абуваць у лапці,
Піць умеем і рабіць,
Полечку скакаці.

Прыпеў.

Не выкідвалі ікон,
Не забылі Бога,
Наша хата — пяць акон,
Столя ды падлога.
Столя белая — бяла,
А падлога суха,
І ад печы да стала —
Полечка-трасуха!

Прыпеў.

# СЕНА МАЛАДОЕ

Словы *В. Мыслiўца* Музыка *А. Чыркуна*




Ў панядзелак раніцой
Сена маладое
Касіў бацька, касіў я —
Мы касілі двое.

У аўторак раніцой
Сена маладое
Сушыў бацька, сушыў я —
Мы сушылі двое.

У сярэду раніцой
Сена маладое
Бацька зносіў, я зграбаў —
Працавалі двое.

Раніцою у чацвер
Сена маладое
Вазіў бацька, вазіў я —
Мы вазілі двое.

У пятніцу раніцой
Сена маладое
Прадаў бацька, прадаў я —
Гандлявалі двое.

У суботу увесь дзень —
Выхадны на тое...
Гуляў бацька, гуляў я —
Мы гулялі двое!

А узімку — дзе ж ты, дзе,
Сена маладое?..
Плача бацька, плачу я —
Плачам мы абое.

Ў панядзелак раніцой
Сена маладое
Косіць бацька, я кашу —
Косім мы абое.

## КОЛЬКІ Ў НЕБЕ ЗОР

Словы і музыка *А. Шыдлоўскага*



Колькі ў небе зор — цяжка палічыць,
Толькі з іх адна найярчэй гарыць.
Гэта ты, мая зорка ясная,
Ты, любоў мая непагасная.

Ў працы і ў жыцці добра нам з табой
Марыць і любіць з песняй маладой.
Дзе так добра жыць, дзе такі прастор,
Шчасця больш у нас, як на небе зор.

Край шырокі наш, мірны, дарагі,
І бягуць удаль светлыя шляхі.
Мне з табой па іх хочацца ісці
І дзяліць усё разам у жыцці.

## ПРА ДОБРУЮ МЫШКУ І МУДРУЮ КОШКУ

Словы *Л. Дранько-Майсюка* | Музыка *Л. Захлеўнага*






Бегла мышка па дарожцы,
Падарунак несла кошцы —
Не смятану, не аладкі,
А пшанічныя зярняткі.

Кошка есці іх не ўмела,
Мышку з'есці захацела,
А пасля паразважала —
З мышкай той пасябравала.

Пра ўчынак мудрай кошкі
Хай падумаюць хоць трошкі
І дарослыя, і дзеці
Перад тым, як нешта з'есці.

## ДОБРАЙ НОЧЫ

Словы *Л. Пранчака* — Музыка *З. Яўтуховіча*

**Працяжна, пяшчотна**






«Баю-баю, люлі-люлі» —
Гэта песенька матулі.
Закрывайце, дзеткі, вочы.
Добрай ночы, добрай ночы...

Прыпеў: Спіць над лесам аблачынка.
Засынай, мая дзяўчынка.
Добрай ночы, добрай ночы,
Засынай, мой любы хлопчык.

Дзед-баюн не спачывае,
Калыханку дзеткам бае.
Засынайце, калі ласка,
Вам прысніцца ўночы,
Вам прысніцца ўночы казка...

Прыпеў.

## СЦЕЖАЧКА

Словы *А. Лягчылава* Музыка *М. Сацуры*




З мілым я чаромхі цвет
Разам сабірала
І на зорачку адну
Шчасце загадала.

Ой, куды ж ты завяла,
Сцежка палявая?
Мілай любаму была,
А цяпер чужая.

Прыпеў: Сцежачка, сцежачка
Пад нагамі сцелецца
І чамусьці надвая
Паміж намі дзеліцца.

Сцежачка, сцежачка,
Толькі сэрцу верыцца:
Мілы вернецца назад,
Нікуды не дзенецца!

Я за ім не пабягу,
Нават не заплачу.
Ні яго і ні сябе
Не абвінавачу.

Будзе думаць пра мяне,
Плача хай другая,
Бо звязала разам нас
Сцежка палявая.

Прыпеў.

## ДЗЕД БАРАДЗЕД

Словы *А. Вольскага* — Музыка *Л. Захлеўнага*

**З настроем, нетаропка**






Я хаджу па белым свеце
І гляджу, як вы жывеце.
Калі трэба — памагу,
Бо я ўсё рабіць магу.

Прыпеў: Хто я? Дзед Барадзед,
Абышоў белы свет,
А цяпер у ціхі час
Завітаў да вас.

Вечарамі казкі баю,
Я ў запасе шмат іх маю.
А як прыйдзе казка ў сне,
Зноў кажыце дзякуй мне.

Прыпеў.

З вамі побач буду ўсюды,
Трэба цуды — зробім цуды,
Трэба казка — раз, два, тры —
Вось і казка вам, сябры!

Прыпеў.

## КАЛЫХАНКА МАМЕ

Словы *Н. Мацяш* Музыка *І. Вінаградавай*






Быць разам выпадае нам так мала...
Забудзь трывогу вечную сваю,
Прыляж, мая натомленая мама,
Як некалі ты мне, табе спяю.

Прыпеў: Задрэмлюць веі над вачыма карымі —
Не дам упасці й парушынцы я.
Сустрэнься ў сне з сабой, мая ласкавая,
З вясной сваёю, любая мая.

Хоць кропля з абяцанага нам маем
Збываецца праз золкія гады.
Прыляж, мая даверлівая мама,
Спяю табе, як мне спявала ты.

Прыпеў.

Любоў нябёсы над табой трымае,
Любоўю зорацаь дні ў тваім акне.
Прыляж, мая усмешлівая мама,
Спяю табе, як ты спявала мне.

## КАЛЯ РУЖАЎ НА СТАЛЕ

Словы *В. Пазнякевіча* Музыка *М. Сацуры*






Каля ружаў на стале
Дагарае, плача свечка.
Незабыўны летні вечар
Апаўзае па сцяне.

Вечар шчырых нашых слоў,
Вечар першых спадзяванняў.
І прызнанне у каханні,
І размовы пра любоў.

Прыпеў: Ты чароўная мая,
Мной абраная.
Ты адзіная мая,
Ты каханая.

Ты як песня салаўя
Летнім вечарам.
Ты як свечка, што гарыць
Каля ружаў на стале.

Мне той вечар, нібы сон,
Будзе ружай белай сніцца.
Ты як зорка-мілавіца,
Што ўзышла па-над зямлёй.

І няхай ляцяць гады,
Пакідаючы ўспаміны.
Для мяне заўжды адзіны
Позірк твой на ўсе гады.

Прыпеў.

# Беларускія народныя гульні

## КАЧАННЕ ЯЕК

Для качання яек ставіцца на роўным месцы пад схіл лубок або невялікая дошчачка, і кожны па чарзе пускае па ёй сваё яйка. Якога яйка дакранецца сваё, тое выйграў.

## ЯЙКА ПАД ШАПКАЙ

Адзін удзельнік гульні бярэ яйка і кладзе яго пад шапку, другі — павінен адгадаць гэту тайну. Ён кладзе паверх шапкі галінку вярбы, стараючыся размясціць яе ў такім кірунку, у якім, на яго думку, пад шапкаю ляжыць яйка. Калі галінка будзе размешчана правільна, загадка, значыць, адгадана, і той, хто адгадаў, атрымлівае яйка. У адваротным выпадку ён аддае сваё.

## ПЕЎНІ

Удзельнічаюць 2 чалавекі. Скачучы на адной назе, яны штурхаюць адзін аднаго грудзьмі або плячамі, стараючыся прымусіць праціўніка стаць на дзве нагі. Пераможа той, хто ўтрымаўся на адной назе.

## ЯШЧАР

На лаву, пастаўленую пасярод хаты, садзіцца хлопец — Яшчар. Кругом яго становяцца дзяўчаты, узяўшыся за рукі. Круг ажывае: дзяўчаты кружацца і спяваюць.

Сядзі, сядзі, Яшчар — гэй, нам, гэй!
На залатым крэсле — гэй, нам, гэй!
На шчаслівым месцы — гэй, нам, гэй!
Бяры сабе пані — гэй, нам, гэй!
Каторую хочаш — гэй, нам, гэй!
Каторую любіш — гэй, нам, гэй!
За белую ручку — гэй, нам, гэй!
За русую коску — гэй, нам, гэй!

Хлопец-Яшчар спявае ў адказ, а дзяўчаты падтрымліваюць:

Ой, люблю Каську — гэй, нам, нам!
Што ў русай касіцы — гэй, нам, нам!
У залатой прасніцы — гэй, нам, нам!
У шаўковым паяску — гэй, нам, нам!
У руцвяным вяночку — гэй, нам, нам!

Названая ў песні дзяўчына падыходзіць да хлопца і аддае што-небудзь са сваіх рэчаў. Хлопец устае з лавы, дае месца другому. Усё паўтараецца, пакуль усе прысутныя не выберуць сабе пару. Затым першы Яшчар садзіцца каля сцяны. Дзяўчаты становяцца ў рад каля другой сцяны і, узяўшыся за рукі, падыходзяць да хлопца з песняй:

— Ой, Яшчару, паночку,
Прашу аддаць вяночку
Краснай Марысьцы,
Што ў русай касіцы...

Пасля заканчэння песні хлопец вяртае дзяўчыне яе рэч і саступае месца другому.

**ЯШЧАР**

Моладзь бярэцца за рукі і, стварыўшы круг, пачынае кружыцца з выкананнем песні:

Сядзіць, сядзіць Яшчар,
Гэй, нам, гэй!*
На залатым крэсле,
Арэшачкі лушчыць
Да ў каробачку сыпле.
Каробачка няпоўна,
Паедзем да Коўна.
З Коўна да Бяліцы,
Купім чамярыцы
Яшчара паіці.

Яшчар сядзіць на стуле ў сярэдзіне круга і пільна глядзіць, каб ніхто не засмяяўся, не ўпаў і не спатыкнуўся. Калі хто парушыць гэтае правіла, той павінен аддаць Яшчару фант: пярсцёнак, хустку і інш. Пасля разыгрываюцца фанты. Яшчар дастае фант і загадвае ўладальніку фанта што-небудзь праспяваць, расказаць, патанцаваць і г. д.

**ІВАНЬКА І МАРЫЛЬКА**

З гурта выбіраюцца Іванька і Марылька. Удзельнікі ўтвараюць вялікі круг, у цэнтры якога знаходзяцца Іванька і Марылька з завязанымі вачыма. Па камандзе Іванька павінен злавіць Марыльку, увесь час пытаючыся: «Марылька, дзе ты?» А Марылька адказвае: «Тут я, Іванька, тут». Калі Іванька зловіць Марыльку, выбіраецца новая пара, і гульня паўтараецца**.

---

* Паўтараецца пасля кожнага радка.
** Гульня запісана ад дзяцей в. Зенькавічы Уздзенскага раёна.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Цывілізаванасць народа вызначаецца не толькі ўзроўнем развіцця эканомікі і сацыяльнага дабрабыту, але і адносінамі людзей да культурнай і гістарычнай спадчыны продкаў. Без ведання сваіх вытокаў чалавек не можа рэальна ацаніць тое, што ён мае. Веданне традыцый, фальклору, абрадаў, звычаяў свайго народа ўзнімае яго на новую ступеньку духоўнага развіцця.

Школа прызвана стаць захавальніцай этнаграфічнай спадчыны, паколькі займаецца выхаваннем грамадзяніна, патрыёта — чалавека з пачуццём уласнай і нацыянальнай годнасці. Каб выканаць гэтую высакародную місію, яна павінна абапірацца на лепшыя дасягненні і набыткі народнай педагогікі.

Нарматыўныя дакументы ставяць задачу фарміравання творчай асобы, здольнай арганічна ўпісацца ў сусветную культуру і цывілізацыю. Выхаванне такой асобы магчыма толькі на этнакультурнай глебе, бо ўсе каштоўнасці, створаныя чалавекам, — гэта і ёсць адлюстраванне своеасаблівага бачання свету творчай асобай праз прызму нацыянальнага характару.

Вусная народная творчасць, традыцыі і звычаі з'яўляюцца багатай крыніцай маральна-этычных поглядаў народа, увасабленнем норм і паводзін чалавека, адлюстраваннем лепшых рыс беларускага характару. Гэты багаты матэрыял у плане выхавання, развіцця, пазнання павінен шырока і сістэмна выкарыстоўвацца ў сучаснай школе.

## ЛІТАРАТУРА

Анікеева В.А. Ехала Каляда ў чырвоным вазочку //Пачатковая школа. 1992. № 10.

Анталогія беларускай народнай песні /Склад. Г.І. Цітовіч. Мн., 1974.

Барзілоўская Т.С. Запрашаем на вячоркі //Пачатковая школа. 1992. № 10.

Беларусазнаўства: Зборнікі 1—4 /Лозка А.Ю. і інш. Мн., 1992—1994.

Беларускі дзіцячы фальклор /Склад. А.М. Аляхновіч, М.В. Рахчэеў, А.С. Фядосік, У.Д. Каструлёў. Мн., 1994.

Беларускі народны каляндар /Склад. А. Лозка. Мн., 1993.

Беларускі фальклор у сучасных запісах /Уклад. В.Д. Ліцвінка, Г.Р. Кутырова. Мн., 1995.

Беларускія народныя абрады /Склад., навук. рэд. і прадм. Л.П. Касцюкавец. Мн., 1994.

Беларускія народныя песні: У 4 т. /Зап. Р. Шырмы. Мн., 1959—1976.

Беларускія народныя танцы, карагоды, гульні /Склад. В.С. Семянкоў. Мн., 1989.

Беларускія традыцыйныя абрады і святкаванні. Метадычныя рэкамендацыі для сярэдніх спецыяльных устаноў /Склад. Д.І. Каханава, Т.І. Бондар. Мн., 1991.

Васілевіч У. Беларускі народны каляндар. Мн., 1993.

Грымаць А.А., Варанецкая Л.М., Пашкевіч У.В. Народная педагогіка беларусаў. Мн., 1999.

Дзіцячы фальклор /Склад. Г.А. Барташэвіч. Мн., 1972.

Зімовыя песні: калядкі і шчадроўкі /Склад. А.І. Гурскі. Мн., 1975.

Івашчанка Г., Мельнікава З. Родная літаратура: Падручнік-хрэстаматыя для 5 кл. Мн., 1995.

Казкі для сцэны. Вып. 2 /Склад. С. Лаўшук. Мн., 1994.

Канус М.І. Гучы, роднае слова. Мн., 1994.

Крыванос К.А., Маглыш М.А., Панцялей Э.М. Як адзначаць з дзецьмі народныя святы. Мн., 1993.

Кухаронак Т.І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: канец XIX—XX ст. Мн., 1993.

Ліс А.С. Валачобныя песні. Мн., 1989.

Ліцьвінка В.Д. Святы і абрады беларусаў. Мн., 1997.

Лозка А. Беларуская батлейка. Каляндарныя і абрадавыя гульні: Дапам. для настаўнікаў, выхавальнікаў, кіраўнікоў гурткоў. Мн., 1997.

Макаранка Л.В., Саўчанка Я.А. Дакрануцца сэрцам... Мазыр, 1994.

Народныя казкі, байкі, апавяданні і мудраслоўі /Пад рэд. Н.С. Гілевіча. Мн., 1983.

Песні народных свят і абрадаў /Склад. Н.С. Гілевіч. Мн., 1974.

Сваці, сваці, сонейка: Творы беларускага фальклору /Уклад. І.К. Цішчанка. Мн., 1997.

## ЗМЕСТ

Уступ . . . . . . . . . . 3

**СЦЭНАРЫІ СВЯТАЎ НА АСНОВЕ КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВАГА МАТЭРЫЯЛУ** . . . . . . . . . . 5

«Ішла Каляда, калядуючы...» . . . . . . . . . . 5
«У нас сягоння Масленіца!..» . . . . . . . . . . 14
«Свята Вялічка з красным яечкам...» . . . . . . . . . . 23
Піліпаўскімі вечарамі . . . . . . . . . . 35

**СЦЭНАРЫІ СВЯТАЎ НА АСНОВЕ ТРАДЫЦЫЙНЫХ СЯМЕЙНЫХ АБРАДАЎ** . . . . . . . . . . 45

Радзіны . . . . . . . . . . 45
«А вяселейка, а вяселейка едзе з песняй да сяла» . . . . . . . . . . 57

**ПАЗНАВАЛЬНА-ЗАБАЎЛЯЛЬНЫЯ ПРАГРАМЫ** . . . . . . . . . . 66

На кірмашы . . . . . . . . . . 66
У нас уваходзіны . . . . . . . . . . 76
Запрашаем на вячоркі . . . . . . . . . . 84
«Кошык весялосці на вясковым падвор'і» . . . . . . . . . . 91
«Няма смачней вадзіцы, як з роднай крыніцы» . . . . . . . . . . 101

**ДАДАТАК** . . . . . . . . . . 111

Беларускія народныя песні . . . . . . . . . . 111
Апрацоўкі беларускіх народных песень . . . . . . . . . . 126
Аўтарскія песні . . . . . . . . . . 129
Беларускія народныя гульні . . . . . . . . . . 145

Заключэнне . . . . . . . . . . 147
Літаратура . . . . . . . . . . 148

**Беларускае** свята ў школе. З вопыту работы Уз-
Б 43 дзенскай санаторнай школы-інтэрната: Дапам. для настаўнікаў і выхавальнікаў / Аўт.-уклад. Л.В. Пармон, Л.П. Сахарэвіч, Н.П. Трыгубовіч. — Мн.: Беларусь, 2002. — 149 с.

ISBN 985-01-0437-6.

**У кнізе сістэматызаваны вопыт работы педагогаў Уздзенскай санаторнай школы-інтэрната па праблеме маральна-этычнага выхавання школьнікаў праз пазакласную работу.**

**Дапаможнік змяшчае сцэнарыі каляндарна- і сямейна- абрадавых свят, гульнёвых праграм, якія распрацаваны адпаведна запатрабаванням часу і з разлікам на сучаснага вучня.**

**Выданне адрасуецца настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, класным кіраўнікам, арганізатарам пазакласнай работы, кіраўнікам гурткоў, выхавальнікам, усім, хто неабыякавы да духоўнай спадчыны свайго народа.**

**УДК 373.138.1:398.3(=161.3)(072)**
**ББК 74.200.58**

Вучэбнае выданне

**Пармон** Любоў Віктараўна
**Сахарэвіч** Людміла Паўлаўна
**Трыгубовіч** Наталля Пятроўна

**БЕЛАРУСКАЕ СВЯТА Ў ШКОЛЕ**

*Дапаможнік для настаўнікаў і выхавальнікаў*

Рэдактар *Л.Б. Шынкевіч*
Мастакі *Г.В. Нікіціна, А.В. Грабянко*
Мастацкі рэдактар *А.А. Ждаnоўская*
Тэхнічнае рэдагаванне
і камп'ютэрная вёрстка *Ж.М. Голікавай*
Карэктар *Р.П. Іваненка*
Аператары *І. Л. Жукоўская, Л. Е. Капусцінская*

Падпісана да друку з арыгінала-макета 14.08.2002. Фармат 60×90 $^{1}/_{16}$.
Папера газетная. Гарнітура Таймс. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 9,5.
Ул.-выд. арк. 9,89. Тыраж 4000 экз. Зак. 2225.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь»
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 2
ад 17.01.2001. 220004, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Баранавіцкая ўзбуйненая друкарня». 225320, Баранавічы, Савецкая, 80.

Мінск
«БЕЛАРУСЬ»

ISBN 985-01-0437-6
9 789850 104373